№ 6 (508) 23 лютага 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Канец антыўтопіі

У апошнія тыдні грамадзкая ўвага ў Беларусі была засяроджаная вакол унутраных падзеяў. Даўно ўжо не было так цікава сачыць за незалежнымі мэдыямі — прычым ня столькі за навінамі, колькі за палітычнай дыскусіяй. Хай са спазьненьнем, але лідэр дэмакратычных сілаў у апошнія дні праявіў сябе сапраўды як лідэр, здольны браць на сябе адказнасьць. Менавіта ўчынкаў чакалі ад Мілінкевіча амаль год пасьля выбараў ягоныя выбарцы. Значная іх частка па-ранейшаму зьвязвае зь ім свае спадзяваньні на лепшую будучыню для Беларусі. Менавіта зь ім, а не з палітычнай радай, асобнымі партыямі ці іх кіраўнікамі, у якіх ужо быў час заявіць аб сабе. Мілінкевічу ўдалося пераступіць заганнае кола, у якім дэмакратычныя сілы круціліся гадамі — кола «ратацыі», калі чарговага «лідэра», вылучанага пад выбары, потым выкідалі за адсутнасьцю далейшай патрэбы.

Ужо першая рэакцыя на ўчынкі лідэра паказала, што яму ўдалося ўзварухнуць палітычнае балота... Піша Віталь Тарас. **Старонка 6.**

## Міхаіл Герчык: Не спадзяваўся выбрацца адтуль

Аўтар раману «Здабыцьцё надзеі», праз 30 гадоў сам аказаўся ў Бараўлянах як пацыент. Зь пісьменьнікам гутарыць Зьміцер Панкавец. **Старонка 38.**

### Спаса-Эўфрасіньнеўскую царкву чакае эўрарамонт

Навуковы кіраўнік рэстаўрацыі Ўладзімер Ракіцкі прыпыніў сваю працу на знак пратэсту. **Старонка 12.**

### Аляксей Марачкін. «Плошча»

Грунвальд і намётавае мястэчка на адным палатне. **Старонка 3.**

### Партыя БНФ і гангстэры Тарантына

Крытыка Сяргея Богдана, адказ Аляксея Янукевіча. **Старонка 34.**

### Загад каралевы, або Пяць хвілін у парозе

Апавяданьне Марыі Вайцяшонак, прысьвечанае Ірыне Казулінай. **Старонка 36.**



АНДРЭЙ АНТАНЕНКА

## У чужым Арсэнале

**Санкт-Пецярбурскі Арсэнал упершыню выставіў гарматы і дасьпехі, захопленыя расейцамі ў Нясьвіжы. Старонка 33. На фота: «Пагоня» на адной з гарматаў.**

## У НУМАРЫ

### люстра дзён

Двухсэнсоўныя эканамічныя вынікі студзеня .......... 4
Суворава нам не хапала .......... 13
Мілінкевіч запрасіў ван дэр Ліндэна на Дзень Волі .......... 13
Інтэрвію з сынам Лукашэнкі .......... 13
Люты, у маразы абуты 13
Дзянісаў зьмешчаны ў СІЗА .......... 14
Часопісу «ARCHE» вынесьлі новыя папярэджаньні .......... 14
Працэс Лукашова .......... 15
Хроніка .......... 16
Таму, які так і ня стаў на шлях выпраўленьня 18
Дашкевіч вылучаны на прэмію Кенэдзі .......... 18

### камэнтары

Віталь Тарас. Канец антыўтопіі .......... 6
Павал Севярынец. «Яўропа!» .......... 16
Пятрушка Шустрава. Міхайлаў патрабуе салідарнасьці .......... 19

### наша страва

Бараніна .......... 42

### газэтка дзеткам

Трамвайчык .......... 44

### дзе варта быць

Эрнст Сабіла, Адам Глёбус, Андрэй Мельнікаў, «Стары Ольса», «Яблычная гарбата»... .......... 46

Зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»










Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**23 лютага для Вас сьвята?**

| | |
|---|---|
| Так, сьвята | 33 (16.0%) |
| Не, я гэтага дня за сьвята не прызнаю | 126 (61.2%) |
| Для мяне гэта ня Дзень Савецкай арміі, а дзень стварэньня Беларускай краёвай абароны | 47 (22.8%) |

Усяго прагаласавала за панядзелак—сераду: 206

# Мілінкевіч супраць кангрэсістаў

*А мы за каго?*

У панядзелак 19 лютага адбылося пазачарговае паседжаньне палітрады аб'яднанай апазыцыі. Прычынай склíканьня рады сталася рашэньне Аляксандра Мілінкевіча ня ўдзельнічаць у сакавіцкім Кангрэсе дэмакратычных сілаў. На паседжаньні прысутнічалі таксама лідэры Рады беларускай інтэлігенцыі.

Яно нічога не зьмяніла. Мілінкевіч застаецца цьвёрдым у сваім нежаданьні ісьці на Кангрэс. Партыйныя лідэры — у нежаданьні падпарадкоўвацца Мілінкевічу.

Экс-кандыдат у прэзыдэнты лічыць, што Кангрэс ня мае сэнсу, калі ён зьвядзецца да абмеркаваньня агульных матэрый. Таксама Мілінкевіч перакананы, што апазыцыя мусіць мець лідэра з шырокімі паўнамоцтвамі. Апошняй кропляй, якая справакавала Мілінкевіча на разрыў з партыйнымі босамі, стала рашэньне палітрады дэмакратычных сілаў перайсьці да ратацыйнага старшынства і забараніць Мілінкевічу выступаць ад імя ўсіх дэмакратычных сілаў бяз санкцыі той самай палітрады.

У панядзелак Мілінкевіча холадна ўгаворвалі прыйсьці на Кангрэс, каб ён «хаця б адчытаўся аб зробленай працы». Фактычна ж, удзел Мілінкевіча легітымізаваў працу Кангрэса ў вачох грамадзкасьці і замежжа. Як трапна сфармуляваў Вінцук Вячорка, «безь Мілінкевіча ня можа быць Кангрэсу аб'яднаных дэмакратычных сілаў». І дадаў: «Але і Мілінкевіч без Кангрэсу ня лідэр дэмакратычных сілаў».

Дэлегатаў на Кангрэс на гэты раз вылучалі шляхам збору як мінімум трохсот подпісаў выбарцаў. У выніку найбольшае прадстаўніцтва на Кангрэсе будуць мець левыя партыі на чале з камуністамі. Яны ня маюць абсалютнае большасьці, але блякуючы пакет належыць прадстаўнікам АГП, на чале зь непрыхільным да экс-кандыдата ў прэзыдэнты Анатолем Лябедзькам. Таму Мілінкевіч разумее, што гэты сход наўрад ці ўмацуе ягонае лідэрства.

Камуністы настойваюць на ранейшым часе правядзеньня Кангрэсу — 17—18 сакавіка. Ссыльны Статкевіч заклікаў перанесьці Кангрэс на 2008 год. Лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка прапанаваў кампрамісны варыянт. «Кампраміс дзеля адзінства» прадугледжвае правядзеньне Кангрэсу ў траўні і абраньне Мілінкевіча старшынём палітычнай рады дзеля таго, каб ён мог прадстаўляць апазыцыю ў замежжы.

Крытыкі закідаюць Мілінкевічу слабыя арганізатарскія здольнасьці і бязьдзейнасьць пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Праўда, тут і самі яны пахваліцца асабліва ня маюць чым.

Трэба адзначыць, што кааліцыя кангрэсістаў пярэстая. У яе ўваходзяць лідэры палітычных партыяў — часта ў няпростых адносінах паміж сабой, але якія не жадаюць моцнага лідэра над сабой.

Працяг на старонцы 5.



Прэзэнтацыя карціны Алеся Марачкіна «Плошча» адбудзецца 2 сакавіка на Сядзібе БНФ. На фота: фрагмэнт карціны. Пра новую выставу Марачкіна чытайце на старонцы 20.

# Двухсэнсоўныя эканамічныя вынікі студзеня

Урад рапартуе, што па выніках студзеня беларуская эканоміка спрацавала нармальна, аднак нават афіцыйная статыстыка сьведчыць, што паводзіны эканомікі не паддаюцца дакладнаму прагнозу.

Газэта «Белорусы и рынок» вырашыла высьветліць, пра якія 13% росту гаварыў прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі на паседжаньні прэзыдыюму Саўміну. Аналізуючы абнародаваныя Міністэрствам статыстыкі і аналізу зьвесткі, газэта не знайшла такога паказчыку. Ускосна ён быў агучаны падчас справаздачы прэм'ера прэзыдэнту, калі было заяўлена, што валаўтваральныя прадпрыемствы павялічылі выпуск прадукцыі ў студзені на 13—14%.

Выданьне прыходзіць да высновы, што ўрад агучвае цяпер толькі найбольш прывабныя паказчыкі, у той час, як афіцыйная статыстыка сьведчыць пра пагаршэньне эканамічных паказчыкаў у параўнаньні са сьнежнем мінулага году.


PHOTO.BYMEDIA.NET

На беларускіх цукровых заводах утварыўся больш чым гадавы запас непрададзенай прадукцыі.

Статыстыка паказвае, што ў студзені вытворчасьць спажывецкіх тавараў зьнізілася на 0,3%, грузазварот — на 12,9%, раздробны гандаль — на 21,9%. Аднак гэта звычайныя лічбы з прычыны зьніжэньня актыўнасьці пасьля калядных сьвятаў. Нашмат больш трывожныя іншыя факты. Інвэстыцыі ў асноўны капітал зьнізіліся на 52,7%. Адначасова павялічыўся адсотак беспрацоўя — на 2,8%, а індэкс росту спажывецкіх цэнаў склаў 1,8% — што для студзеня шмат. За студзень рэзка вырасьлі запасы гатовай прадукцыі на складах. Гэтак, запасы гарэлкі й мяса павялічыліся ўдвая.

Значна падаражэла прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэньня — рост склаў 16,5%.

У Міністэрстве эканомікі цьвердзяць, што рост індэксу коштаў прагназаваны і цалкам абгрунтаваны, улічваючы значны рост коштаў на энэргарэсурсы. Мінэканомікі плянуе, што найбольш цяжкім будзе першы квартал 2007 г., тады як цягам рэшты году сытуацыя ўрэгулюецца. Аднак выклікае насьцярогу менавіта другая палова году, калі аб сабе нагадае сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі. Як вядома, вытворцы сельгаспрадукцыі ад пачатку году пазбаўленыя льготных коштаў на дызельнае паліва і будуць плаціць за яго ў 1,5 раза даражэй. «Белнафтахім» таксама ня робіць больш адлічэньняў на падтрымку сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, у мэтах захаваньня рэнтабэльнасьці гарадзенскага «Азоту» кошты на яго прадукцыю — азотныя ўгнаеньні — узрасьлі на 35%. Да ўсяго варта ўлічваць, што частка прадукцыі ў студзені была выробленая з сыравіны ды камплектуючых, закупленых па старых цэнах.

«БР» зьвяртае ўвагу на тое, што ў студзеньскім росьце спажывецкіх коштаў не ўлічылі новы падатак з продажаў імпартных тавараў, які ў Менску падвысіўся на 5—15%, а таксама падвышэньне мясцовага падатку на паслугі да 5%. Газэта прыводзіць аналягічную сытуацыю ва Ўкраіне ў студзені мінулага году пасьля двухразовага падвышэньня коштаў на энэргарэсурсы. У студзені 2006 г. у параўнаньні са сьнежнем 2005 г. тамтэйшыя кошты вытворцаў, як і спажывецкія, вырасьлі на 1,2%, у цэлым за 2006 год рост цэнаў вытворцаў склаў 14,1%, спажывецкіх — 11,6%. Відавочна, ва Ўкраіне былі задзейнічаныя пэўныя мэханізмы па скарачэньні выдаткаў. Тое самае робіць і Беларусь, і няясна, за кошт чаго беларускі вынік мусіць аказацца лепшы.

**Сямён Печанко**

# Мілінкевіч супраць кангрэсістаў

**Працяг са старонкі 2.**

Да іх далучыліся «палітыкі-адзіночкі», выціснутыя на пэрыфэрыю грамадзкай увагі па меры ўзмацненьня Мілінкевіча й Казуліна. Яны бачаць у дэтранізацыі Мілінкевіча шанец на працяг уласнай палітычнай кар’еры.

Старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі Ўладзімер Колас амаль непрыхавана крытыкаваў дзеяньні Мілінкевіча: «Я спадзяюся, што і Аляксандар Мілінкевіч, які ініцыяваў гэтую сытуацыю, нешта зразумеў. І з аднаго боку, дрэнна тое, што здарылася. А з другога боку, можа, і трэба было нейкія захады надта рэзкія зрабіць. Трэба несьці сапраўдную адказнасьць за вынікі тых рашэньняў, якія прымаюцца, тады на новым якасным узроўні і пойдзе праца. Бо сьпісваць усё на рэжым — гэта ўжо ўсім надакучыла, гэта ўжо не працуе».

А экс-палітвязень Сяргей Скрабец увогуле параўнаў Мілінкевіча... з Гітлерам. Абурэньне палітыка выклікаў ліст Мілінкевіча да Лукашэнкі. Скрабец лічыць непрымальнымі перамовы з кіраўніком краіны. «Падалося, што Гітлер пачаў размаўляць па-беларуску», — заявіў Скрабец.

Партыйных лідэраў горача падтрымалі расейскае і калярасейскае крыло апазыцыі.

З крытыкай заяваў Мілінкевіча выступіў экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін: «Я шкадую, што мой калега зрабіў у апошнія дні заявы, якія паставілі дэмакратычныя сілы ў няпростае становішча. Спадзяюся, што рэальныя дзеяньні Мілінкевіча будуць накіраваныя на дасягненьне згоды ў дэмакратычным асяродзьдзі і дазволяць у бліжэйшы месяц арганізаваць лёсавызначальны для Беларусі нацыянальны форум — Кангрэс аб’яднаных дэмакратычных сілаў». Трэба адзначыць, што той самы Казулін мінулы «лёсавызначальны форум» проста праігнараваў.

Апантана крытыкуе Мілінкевіча на сайце «Белорусский партизан» журналіст Павал Шарамет. Ён назваў Мілінкевіча «польскім праектам» і «баязьліўцам».

На тым жа сайце быў зьмешчаны артыкул расейскага палітоляга Андрэя Суздальцава «Актуальныя праблемы схаванага канфлікту». Крытыкуючы сёньняшнюю беларускую ўладу, Суздальцаў таксама пераймаецца тым фактам, што Мілінкевіч адмаўляецца ўдзельнічаць у Кангрэсе. Суздальцаў непакоіцца, што беларуская ўлада і апазыцыя змогуць знайсьці кропкі судакрананьня ў барацьбе супраць расейскае дамінацыі. У антыпольскім запале ён ідзе далей за Шарамета. Ён бачыць польскую інтрыгу ў самім факце незалежнасьці Беларусі і выжываньня беларускай нацыі. Вяршыняй публіцыстычнага таленту гэтага аўтара можна лічыць вось гэтую фразу: «... дабіцца сваёй мэты Варшава можа толькі поўным вынішчэньнем расейскага народу». Зрэшты, фантазія сп.Суздальцава не ўпершыню працуе ў генацыдным кірунку. Летась гэты аўтар заклікаў дэпартаваць з Расеі беларусаў.

Крытыка з боку прарасейскіх дзеячоў мае ідэйную падбіўку. З аслабленьнем Мілінкевіча яны спадзяюцца падважыць ягоны палітычны курс (недапушчэньне расейскага ўмяшаньня ў беларускую палітыку, падтрымка беларусізацыі, саюз з Захадам). А вось крытыка з боку партыйных лідэраў не выходзіць за межы асабістага. Альтэрнатыўнай стратэгіі Казулін, Калякін, Лябедзька і Вячорка не прапануюць. Тады што дасьць ратацыя лідэраў замест Мілінкевіча некаму, акрамя саміх ратаваных лідэраў?

Мілінкевіч пачаў жорсткую гульню на масавай антыпатыі да беспасьпяховай дзейнасьці палітычных партый. Можна спрачацца, карэктны такі ягоны ход ці не, але ён спрацоўвае. Рэакцыя чытачоў з сайту «НН» красамоўная: дзевяць дзясятых падтрымліваюць у гэтай спрэчцы Мілінкевіча.

Мэханізм палітрады канчаткова здыскрэдытаваў сябе, калі яна так і ня здолела выпрацаваць рэакцыю на нафтагазавы канфлікт. Няма сумневу, што і абмеркаваньне адкрытага ліста да Лукашэнкі замарудзілася б да бясконцасьці, калі б Мілінкевіч ня ўзяў на сябе адказнасьць і не падпісаў яго ад сябе асабіста. Тым самым зрабіўшы крок, на які ўлады дагэтуль не адказалі. Чытачы сайту «НН», дзе публіка не з памяркоўных, амаль трыма чвэрцямі гэты ход Мілінкевіча ўхвалілі (гл. «НН» №5). Сярэдні ж выбаршчык-дэмакрат, думаецца, паставіўся да гэтага кроку яшчэ больш пазытыўна.

На думку аналітыка Яна Максімюка, унутрыапазыцыйная барацьба выглядае непрыгожа. «Цяпер беларуская апазыцыя мае шанец, якога ня мела шмат гадоў, — сказаў Максімюк у эфіры радыё «Свабода». — У сувязі з новай палітычнай сытуацыяй паміж Беларусьсю і Расеяй і ў сувязі з тым, што беларускі прэзыдэнт зрабіў, прынамсі, намёкі на тое, што хоча паправіць адносіны з Захадам. Беларуская апазыцыя мае адзін вялікі козыр, а менавіта тое, што яна магла б выступіць як пасярэднік пры наладжваньні такіх сувязяў афіцыйнага Менску з Брусэлем. Гэты козыр могуць вельмі лёгка страціць такімі разборкамі, якія пайшлі цяпер. Фактычна ідзе змаганьне за тое, хто мае рэпрэзэнтаваць апазыцыю перад Брусэлем».

Унутраныя разборкі ў апазыцыі маюць тым меней сэнсу, што адзіныя яе спадзяваньні тычацца Дня Волі. Толькі вулічныя акцыі могуць даць незалежнаму грамадзтву нейкія козыры ў барацьбе за палітычны выбар Беларусі. Заявы, што ад масавасьці акцыі 25 Сакавіка залежаць палітычныя пэрспэктывы Мілінкевіча, ня маюць аніякага грунту пад сабой. Ад якасьці гэтага сьвята будзе залежаць ня лёс таго ці іншага палітыка, а тонус незалежнага грамадзтва і, калі хочаце, курс Беларусі ў наступным годзе. Думаецца, што павага незалежнага грамадзтва ўрэшце схіліцца на бок таго палітыка і тае палітычнае сілы, якая больш эфэктыўна і крэатыўна папрацуе на арганізацыю сьвята 25 Сакавіка.

**Барыс Тумар, Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Як Вы ставіцеся да рашэньня Мілінкевіча адмовіцца ад удзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў?**

| | |
|---|---|
| Правільна зрабіў | 258 (87.8%) |
| Няправільна зрабіў | 36 (12.2%) |

Усяго прагаласавала: 294

# Канец антыўтопіі

Аб Мюнхэнскай прамове Пуціна, аб Мілінкевічу, які праявіў сябе як лідэр, і аб раздражнёнай рэакцыі Шарамета. Піша **Віталь Тарас**.

У апошнія тыдні грамадзкая ўвага ў Беларусі была засяроджаная вакол унутраных падзеяў. Даўно ўжо не было так цікава сачыць за незалежнымі мэдыямі — прычым ня столькі за навінамі, колькі за палітычнай дыскусіяй. Падзеі, што адбываліся тым часам за межамі Беларусі, ня тое, каб зусім выпалі з-пад увагі аглядальнікаў, але звыкла разглядаліся адасоблена ад унутраных, як бы яны адбываліся недзе ў паралельнай рэальнасьці. Дзякаваць Богу, даўно мінуў час, калі падзеі ў Расеі ўспрымаліся як падзеі жыцьцёва важныя для беларусаў. Але важна захаваць, так бы мовіць, бінакулярнасьць зроку. Тады шмат якія падзеі ўнутры краіны высьвечваюцца па-новаму, некаторыя дэталі пры гэтым набываюць больш рэзкія й выразныя абрысы.

## Мюнхэнскі сьпіч

Амаль усе камэнтатары й палітолягі, у тым ліку расейскія, сыходзяцца ў тым, што Уладзімер Пуцін у сваёй прамове на міжнароднай канфэрэнцыі бясьпекі ў Мюнхэне не сказаў нічога новага. Заходніх аглядальнікаў (але толькі не сур'ёзных палітыкаў) уразілі, хутчэй, тон прамовы, чымся ейны зьмест. Некаторыя згадалі нават Хрушчова, які грукаў чаравікам па трыбуне ААН. Але галоўнае было нават ня ў тым, як прамаўляўся сьпіч, а ў тым, каму ён быў прызначаны.

Прыкладна тое самае паводле сэнсу Пуцін заўсёды раней прамаўляў перад унутрырасейскай аўдыторыяй: Захад нас падмануў, ЗША праводзяць аднапалярную, імпэрыялістычную палітыку, скіраваную супраць інтарэсаў Расеі, NATO наш вораг, АБСЭ ёсьць заслонай заходніх інтарэсаў, хопіць нас вучыць дэмакратыі і г.д. Але дагэтуль Пуцін вызначаўся ўменьнем гаварыць тое, што аўдыторыя чакала ад яго пачуць. Для расейскай аўдыторыі адно, для замежнай — нешта іншае. У сьпічы ў Мюнхэне ўсё зьмяшалася.

Пасланьне расейскім «сілавікам» і полісітмэйкерам, пасланьне свайму электарату, у якога папулярнасьць Пуціна і без таго, калі верыць сацапытаньням, зашкальвае за 80 адсоткаў, і пасланьне лідэрам «вялікай сямёркі» — той самай семкі вядучых краінаў сьвету, якую прэзыдэнт Расеі яшчэ нядаўна прымаў у Санкт-Пецярбургу на правах краіны-гаспадара сустрэчы G-8.

Сьпіч прамаўляўся ў маленькай залі, дзе прадстаўнікі заходніх краінаў, у тым ліку міністры і прэм'еры, сядзелі, як школьнікі, радком, ледзь не судакранаючыся плячыма, а дыстанцыя паміж імі і прамоўцам на трыбуне было ўсяго пара мэтраў. Гэтая аўдыторыя прызначаная была для нефармальнай, давяральнай размовы на тэмы сучаснай палітыкі, а не для гучнай афіцыёзнай рыторыкі ў стылі «халоднай вайны». Менавіта гэтае несупадзеньне месца й стылю паводзінаў у першую чаргу й выклікала ў міжнародных аглядальнікаў шок. Навошта крычаць у мэгафон у твар суразмоўцы, калі можна спакойна пагаварыць на любыя тэмы?

Тлумачэньне можа быць толькі адно: ад суразмоўцы не чакалі адказу. Калі праўду кажуць, што замежная палітыка ёсьць працягам унутранай, дык нічога іншага ад Пуціна нельга было чакаць. Ён даўно, амаль зь першых дзён свайго прэзыдэнцтва, адмовіўся ад дыялёгу з грамадзтвам. У КГБ, канечне, прывучалі супрацоўнікаў слухаць грамадзянаў: што і дзе яны кажуць, і нават запісваць сказанае, але зусім ня дзеля таго, каб да іх прыслухоўвацца ці ўступаць у дыялёг. Хіба допыт у сьледчага можна назваць дыялёгам? А можа, дыялёгам у Расеі цяпер лічацца шматгадзінныя прэс-канфэрэнцыі, падчас якіх журналістам дазваляецца называць прэзыдэнта «непараўнальным»?

Адказу заходніх палітыкаў на інвэктывы Пуціна не было таму, што гэта было ўспрынята як правакацыя. І нават ня тое, каб сапраўдная правакацыя ў духу «халоднай прапагандысцкай вайны», а проста як свайго роду маветон. Справа ў тым, што ў сьпічы расейскага прэзыдэнта прысутнічаў яшчэ адзін малапрыемны момант…

Вядома, што адміністрацыя Буша і ён сам перажываюць цяпер не найлепшы пэрыяд. Вайна ў Іраку і стаўленьне да яе раскалола амэрыканскае грамадзтва, найперш — ягоныя эліты, прычым большасьць ужо не на баку Буша. Злучаныя Штаты за апошні час страцілі пазыцыі, іх ранейшы ўплыў і аўтарытэт ня толькі на Блізкім Усходзе ці ў Азіі ў цэлым, але нават у саюзнай Эўропе саслабеў.

І як бы ні разьвіваліся падзеі далей, якой бы ні была палітыка дэмакратаў у кангрэсе, ясна, што палітычная кар'ера цяперашняга прэзыдэнта хіліцца да завяршэньня. Нездарма ўжо цяпер, за два гады да заканчэньня прэзідэнцкага тэрміну, у ЗША фактычна пачалася поўнамаштабная передвыбарчая кампанія.

У гэтай сытуацыі крытыкаваць саюзьніка ў барацьбе зь міжнародным тэрарызмам, «сябра Буша», які некалі разгледзеў у вачох «сябра Пуціна» душу — гэта ня проста здраджваць сябру. У палітыцы, як вядома, сяброў не бывае. Але гэта тое самае, што пінаць мёртвага льва.

Тое, што Пуцін потым апраўдваўся, быццам у яго захоўваюцца добрыя стасункі з Бушам, толькі падкрэсьлівае цынізм расейскага кіраўніка. А тое, што Буш вельмі спакойна й міралюбна адгукнуўся на выпады расейскага калегі, выглядала таксама вельмі натуральна, і галоўнае — прыстойна. Яшчэ раз пацьвердзілася старая ісьціна наконт прыстойных людзей, якія ставяцца да нягоднікаў як да прыстойных людзей, і нягоднікаў, якія ставяцца да прыстойных людзей як да нягоднікаў.

## Выбарнае самаўладзьдзе

Справа, зразумела, ня ў Пуціне. Ён зрабіўся закладнікам аўтарытарнай сыстэмы, пабудаванай у Расеі —




**Пасьля доўгіх ваганьняў Мілінкевіч пайшоў на разрыў з партыйнымі лідэрамі.**

праўда, пры ягоным непасрэдным актыўным удзеле. Расейская паліталягіня Лілія Шаўцова вельмі трапна назвала гэтую сыстэму выбарным самаўладзьдзем. Пуціну вельмі хацелася б сысьці, зьняць зь сябе груз дзяржаўнай адказнасьці — гэта відавочна. Але ж паплечнікі, лёс якіх разам зь іхным дзяржаўным бізнэсам залежыць ад таго, хто будзе уладарыць у Крамлі, сысьці яму не дадуць. І гэта таксама відавочна. Пуцін, напэўна, гэта ўжо зразумеў ці вось-вось зразумее.

Аднак дакладна прадказаць, як будуць разьвівацца далейшыя падзеі ў непрадказальнай Расеі сёньня, відаць, ніхто ня ў стане, у тым ліку й Пуцін. Але, падпарадкуючыся інстынкту, ён робіць прэвэнтыўныя захады, каб прадухіліць магчымую (а можа й цалкам рэальную) небясьпеку для ўласнай пэрсоны. Тым больш, што гісторыя расейскай дзяржавы, у якой самаўладзьдзе сталася выбарным зусім нядаўна, сьведчыць — уладары яе часта сыходзілі не па сваёй волі, асабліва ў XX стагодзьдзі. Таму Пуцін, як чалавек адукаваны й дасьведчаны, дакладна ведае — галоўнае не паказаць слабасьці патэнцыйным спаборнікам. Інакш — парвуць на шматкі, як сабакі. Таму ён і вымушаны пазыцыянаваць сябе як жорсткі лідэр супэрдзяржавы, хоць тае супэрдзяржавы няма і на ўспаміне.

А тое, што гэтая дзяржава ніколі ня будзе лібэральнай ці хоць бы дэмакратычнай, ужо даўно ўсім зразумела, у тым ліку й на Захадзе. Сувэрэнная дэмакратыя гучыць гэтак сама пераканаўча, як некалі сацыялістычная, альбо рабоча-сялянская дэмакратыя. Яна, калі памятаеце, была найвышэйшай формай дэмакратыі ў сьвеце, вось толькі на Захадзе ніхто яе дэмакратыяй не лічыў.

Відавочна, пануючай клясе, прынамсі, яе вяршыньцы, у Расеі надакучыла пераконваць Захад у тым, у чым яго немагчыма пераканаць — быццам Расея працягвае ісьці дэмакратычным шляхам. Паводле расейскага прыслоўя, палюбіце нас чорненькімі, а беленькімі нас кожны палюбіць.

Гэта сьведчыць яшчэ і аб тым, што расейскай эліце няма справы да расейскіх грамадзянаў і да будучыні сваёй краіны. Нафтадаляры забясьпечваюць будучыню прадстаўнікоў гэтай эліты, якія трымаюць грошы пра запас на Захадзе, і будучыню іхных дзяцей, якія там навучаюцца й жывуць. Усё астатняе эліты ня тычыцца.

А дзеля таго, каб забясьпечыць надалей свой спакой і магчымасьць неабмежавана высмоктваць энэргарэсурсы з расейскіх нэтраў, народу трэба кінуць костку — але ня ў выглядзе псэўдадэмакратыі ці правоў чалавека, у якія расейскія грамадзяне ніколі ня верылі й ня вераць, а ў выглядзе нацыянальнай ідэі. Гэтая ідэя неяк амаль незаўважна трансфармавалася апошнім часам у «расейскую ідэю», альбо ў «расейскі праект», які раскручвае цяпер па заданьні «Адзінай Расеі» яе актывіст, праваслаўны тэлепрадусар, колішні вядоўца «Музобоза» Іван Дзямідаў.

**Працяг на старонцы 8.**

# Канец антыўтопіі

Працяг са старонкі 7.

Ня трэба мецъ багатай фантазіі, каб уявіць, да чаго гэты «праект» можа прывесьці ў краіне, дзе ксэнафобскія настроі без таго дасягнулі высокага градусу.

Лідэр думскай фракцыі «Радзіма» Бабурын нядаўна заявіў з экрану тэлебачаньня, што ў Расеі ніколі не было пагромаў. Гэтаксама герой аднае савецкае літаратурнае пародыі 1970-х гадоў, палкоўнік КГБ, казаў свайму сыну пра 1937-ы год: «Яго не было, але будзе». Цікава, што вядучы тэлепраграмы, у якой выступаў Бабурын, прамаўчаў, хаця мог бы тое-сёе распавесьці пра габрэйскія пагромы пачатку XX стагодзьдзя ў Адэсе, Кіеве, Гомелі ды іншых гарадах Расейскай імпэрыі.

## Шматпалярнасьць апраметнай

Што тычыцца імпэрыі, дык насамрэч, для яе, кажучы словамі Эвангельля, «няма ні эліна ні юдэя». Ёй няма справы да нацыянальнасьці салдата, які гіне за інтарэсы мэтраполіі на палях вайны. Мала таго, замежная экспансія Рымскай імпэрыі ў пэрыяд яе росквіту, як мы ведаем зь гісторыі, грунтавалася на дэмакратыі — наяўнасьці свабодных грамадзянаў і выбарнага сэнату. Разлажэньне рэспублікі і пераход да тыраніі імпэратараў азначаў блізкі заняпад імпэрыі.

Расейская імпэрыя заўсёды была імпэрыяй асобага тыпу. Яе замежная экспансія заўсёды дапаўнялася тыраніяй і гвалтам супраць усіх народаў, якія ўсе амаль у аднолькавай ступені былі яе рабамі.

«Росквіт» гэтай імпэрыі пры Сталіне працягваўся зусім нядоўга паводле гістарычных мерак. Спроба абвесьціць расейскі народ «народам-пераможцам», якому ўсе астатнія народы вінныя да скону свайго існаваньня (а некаторыя зь іх — кшталту крымскіх татараў, чачэнаў, туркаў-мэсхэтынцаў, габрэяў абвяшчаліся народамі-здраднікамі, каб апраўдаць іхнае пагалоўнае высяленьне), гэтая спроба ні да чаго не прывяла. Савецкая паводле формы й ксэнафобская паводле зьместу камуністычная дзяржава ня вытрымала спаборніцтва з Захадам.

Ні да чаго не прывялі й сутаргавыя спробы аднавіць СССР (хаця б у межах Беларусі й Расеі). Ініцыятарам іх парадаксальным чынам выступіў першы прэзыдэнт незалежнай Беларусі Аляксандар Лукашэнка. Але пра гэта — крыху ніжэй.

Ня маючы былой ядравай моцы, саступаючы ў эканамічнай моцы дзясятку краінаў, нават значна меншых за яе паводле прыродных і людзкіх рэсурсаў, Расея сапраўды спрабуе знайсьці сабе новую нішу ў гэапалітычнай структуры сьвету. Каб зь ёй зноў пачалі лічыцца — так, як лічыліся з атамным монстрам з ракетамі ў 1960-я.

Нядаўна Гэнштаб РФ у адказ на плянаванае разьмяшчэньне элемэнтаў ПРА ў Польшчы й Чэхіі прыгразіў выхадам Расеі з Дамовы аб ліквідацыі стратэгічных ракет сярэдняй і меншай адлегласьці. І што, вельмі ён гэтым напалохаў Пэнтагон?

Дастаткова ўзгадаць, што пры канцы 1980-х, калі пачаўся вывад гэтых ракет — дарэчы, найперш з тэрыторыі Беларусі, — іх было ў савецкага войска нашмат больш, чым цяпер ёсьць у Расеі. Але ж тагачаснае савецкае кіраўніцтва цьвяроза разумела, што ня ў колькасьці ракет перавага, а ў найноўшых тэхналёгіях.

І цяперашнія цьмяныя заявы расейскага галоўнага камандуючага пра нейкую таямнічую звышэфэктыўную зброю новага пакаленьня, здольную процістаяць амэрыканскім ракетам, выклікаюць на Захадзе ўсьмешкі.

(Між іншым, калі журналісты ў Мюнхэне зьвярнуліся да міністра абароны ЗША Гэйтса па камэнтар да выступу Пуціна, той толькі ўсьміхнуўся ў адказ.)

Аб якой вайсковай моцы можна казаць, калі амаль кожнага дня ў расейскім войску каго-небудзь катуюць, нявечаць, расстрэльваюць, кідаюць у печку, гвалтуюць, дзе ўсяляк зьневажаюць шараговых салдатаў, а міністра абароны пераводзяць за гэта на павышэньне? Пра які маральны дух і патрыятызм тут можна гаварыць?

Калі Расея і можа знайсьці годнае для сябе месца ў сьвеце — дык гэта сьвет усходніх дэспатыяў, аўтарытарных фундамэнталісцкіх рэжымаў. Пуцін і не хаваў гэтага, накіраваўшыся пасьля Мюнхэну ў Савудаўскую Арабію, дзе зноў паўтарыў свае антыамэрыканскія тэзы. І што з таго, што лёнданская газэта «Аль-Гаят», якая фінансуецца з Арабіі, іранічна адазвалася пра спробы расейскага кіраўніцтва адрадзіць колішнюю араба-савецкую дружбу? Унутраны складнік новага старога курсу Масквы ў замежнай палітыцы гэта не мяняе.

З другога боку, фундамэнталізм не абавязкова мусіць быць ісламскім. Калі ўлічыць той імпэт, зь якім апошнім часам Расейская праваслаўная царква ўмешваецца ў навучальны працэс у школе (спроба адрадзіць Закон Божы), спрабуе кіраваць адборам працаў на мастацкія выставы, цэнзураваць ці хоць бы рэцэнзаваць творы мастацтва, ня кажучы пра зьмест тэлепраграм, а таксама адбракоўвае навуковыя тэорыі (напрыклад, тэорыю Дарвіна), калі ўлічыць усё гэта, размовы аб праваслаўнай дзяржаўнасьці не выглядаюць ужо толькі размовамі.

Напэўна, Расея ўжо ня вернецца ў стан сярэднявечнага цемрашальства. Неяк у час Інтэрнэту й трансгеннай інжынэрыі ў гэта слаба верыцца. Але ж у сукупнасьці з камуністычнымі Кітаем, КНДР і Кубай, іранскай тэакратыяй, шыіцкім войскам Аль-Садра, з талібамі, «Хамасам», «Хізбаллагам», іншымі тэрарыстычнымі рухамі, міжнароднымі тэрарыстамі, пралазамі й авантурыстамі рознага калібру ды афарбоўкі Расея сёньня складае той самы «шматпалярны сьвет», які павінен, на думку Пуціна, процістаяць заходняй цывілізацыі.

## У чым яго крыўда?

Усё гэта варта браць пад увагу перад тым, як разглядаць цяперашнюю сытуацыю ў Беларусі.

Усім відавочна, што апошнім часам яе кіраўнік сваімі выказваньнямі й



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

паводзінамі дэманструе пэўную нэрвовасьць і разгубленасьць. Але выкліканая яна ня столькі дзеяньнямі «Газпрома» і «Раснафты», ня столькі магчымымі наступствамі падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты для беларускай эканомікі, колькі іншымі, больш важкімі прычынамі. Справа ў тым, што эканоміка заўсёды мае пэўны інэрцыйны запас. І выніку рашэньняў, нават самых кардынальных, прынятых сёньня, насельніцтва, спажыўцы могуць рэальна адчуць ў сваім жыцьці значна пазьней. Акрамя таго, ніхто ня ведае, да якой ступені павінен упасьці ўзровень жыцьця беларусаў, каб гэта падбухторыла іх да нейкіх усьвядомленых дзеяньняў супраць уладаў. І яшчэ ня факт, што расчараваньне ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы Лукашэнкі кіне ягоную электаральную масу не пад сьцягі нацыянальнае апазыцыі, а на падтрымку расейскіх пуціністаў і камунафашыстаў. Намаганьнямі дзяржаўнай тэле- і радыёпрапаганды ў Беларусі глеба для гэтага ўгноеная.

Галоўная бяда для рэжыму палягае сёньня не ў эканоміцы, а ў тым, што Крэмль гвалтоўна забраў у яго галоўную міталягему, любімую цацку — саюзную дзяржаву. У рамках саюзнай дзяржавы — такой, якой яна марылася і ў нейкай ступені была на самой справе — Беларусь бачылася раўнапраўным партнэрам Расеі, а Лукашэнка быў роўны Пуціну. Кіраўніку Беларусі мроіўся ня столькі адроджаны СССР, колькі канфэдэрацыя — свайго роду новае ВКЛ, толькі манструозных памераў, ад Балтыйскага мора да Ціхага акіяну — утварэньне, у якім Лукашэнка пачуваў бы сябе Вялікім князем і прэтэндэнтам на Карону.

Менавіта гэта не задавальняла Крэмль. Ягоны цяперашні кіраўнік, які хутчэй за ўсё застанецца там на трэці ці невядома на які яшчэ тэрмін, ня можа ні з кім дзяліць уладу. Лукашэнка ня можа больш пазыцыянаваць сябе як «апошні фарпост» Расеі на Захадзе. Бо «надёжа и опора», заступнік інтарэсаў расейскага народу можа быць толькі адзін — вялікі і ўседзяржаўны. Усе астатнія — самазванцы.

Кіраўнік Беларусі, які стаяў ля вытокаў саюзнай дзяржавы, яшчэ гэтага не зразумеў, ён усё яшчэ паводле старой звычкі спрабуе шукаць хаўрусьнікаў у Маскве — такіх, як Прахнаў, напрыклад. Але ж час Праханавых прайшоў. Ён са сваім сталінска-імпэрскім рамантызмам састарэў і ня ўпісваецца ў новы афіцыйны патрыятызм цынічнага ўзору. Не Праханаў зь ягонай любоўю да расейскага авангарду ды састарэлымі ўяўленьнямі пра «афіцэрскі гонар» сёньня ў пашане, а Поткіны і Якіменкі, Маркавы ды Пушковы, рознага кшталту ідэйныя пагромшчыкі, якія яшчэ й зарабляюць на патрыятызме грошы (што зробіш — час такі), не заўважаючы, што рыюць сваёй краіне й сваім дзецям калектыўную магілу.

Рыторыка пра «саюзную дзяржаву» яшчэ пакуль жыве. Але Пуцін і ягонае атачэньне, ягоныя тэлеканалы

Працяг на старонцы 10.

# Канец антыўтопіі

Працяг са старонкі 9.

ўжо далі ясна зразумець — Беларусь патрэбная Расеі толькі ў якасьці Северо-Западного края. А йнакш «аўчынка вычынкі ня вартая». Калі кіраўнік Беларусі гэтага не разумее — тым горш для яго.

Ніхто, вядома, ня будзе пасылаць расейскі спэцназ у Драздв. Ці падліваць яго насельнікам радыяактыўны палёній у гарбату. Расея пакуль ня можа сабе такога дазволіць, хоць многія там, напэўна, ужо аб гэтым мараць. І гісторыя зь Літвіненкам ёсьць таму сьведчаньнем.

Але галоўнай зброяй Крамля ў дачыненьнях з Лукашэнкам стане, ужо становіцца, не палітыка эканамічных санкцыяў, а адсутнасьць належнай павагі. Інтэрвію яго Праханаву — гэта енк і скаргі на тое, як зь яго зьдзекуюцца ня толькі Пуцін, але рознага роду прыходзькі, з гледзішча Лукашэнкі — лёкаі расейскага калегі, якім няможна дазваляць брахаць на прэзыдэнта сувэрэннай дзяржавы. Ягоная крыўда нявыдуманая. Няважна, ці сапраўды Лукашэнка не паляцеў пад Новы год у Маскву з-за таго, што там не знайшлі памяшканьня для ягонай прэс-канфэрэнцыі (так звычайна робяць у Менску ў дачыненьні да апазыцыі), ці з-за таго, што Пуцін накрычэў на яго па тэлефоне. Важна тое, што ў Маскве перасталі выяўляць да яго знакі павагі — як гэта рабілі Ельцын і некаторы час Пуцін. Гэта для палітычнага дзеяча, які прайшоў шлях ад дырэктара саўгаса да вышэйшай дзяржаўнай пасады, надзвычай важна. Вось чаму так хваравіта ўспрымаюцца абмежаваньні Захаду на ўезд кіраўніка дзяржавы і ягоных саноўнікаў. Якому-небудзь камандантэ Фідэлю на забарону прыехаць у Вашынгтон заўсёды было напляваць, сёньняшняму прэзыдэнту Вэнэсуэлы Чавэсу — таксама. А для кіраўніка Беларусі важныя знакі пашаны, асабліва ў Эўропе, паколькі ён атаясамлівае сябе з сваёй дзяржавай. І пакуль яго прымалі на вышэйшым узроўні ў Маскве, ён яшчэ мог дазволіць сабе звысок глядзець на палякаў і «разных прочих шведов». Некалі ён выгнаў у каршэнь амэрыканскага пасла разам з пасламі Вялікай Брытаніі, Нямеччыны й Францыі зь іхных рэзыдэнцыяў.

А цяпер ён вымушаны прыслухоўвацца да пасла нейкай Літоўскай Рэспублікі. І прэсавую канфэрэнцыю гэтага пасла паказваюць на Першым канале БТ як першую навіну.

Але справа, зразумела, ня толькі ў гонары й ганарлівасьці. Упершыню за апошнія гады ўзьнікла такая сытуацыя, што пагроза незалежнасьці Беларусі нясе пагрозу асабістай бясьпецы яе кіраўніка. Гэта не азначае, што гэтыя дзьве пагрозы трэба атаясамліваць. Проста яны супалі.

## Выйсьці з кола

Гэта не азначае таксама, што апазыцыя павінна цяпер згуртавацца вакол прэзыдэнта ды безумоўна яго падтрымаць. Зусім наадварот. Працяг ранейшага курсу кіраўніка Беларусі на збліжэньне з найбольш рэакцыйнымі, шавіністычнымі, камунанацыяналістычнымі коламі ў Расеі нясе ўсю большую пагрозу беларускай незалежнасьці, будучыні нацыі.

Зразумела, Лукашэнку вельмі цяжка пераступіць праз усё тое, на чым будавалася дагэтуль дзяржаўнасьць Беларусі, адмовіцца ад савецкай спадчыны, павярнуцца тварам на Захад, які дагэтуль успрымаўся як вораг, у лепшым выпадку — як інструмэнт шантажу ў дачыненьнях з Крамлём.

Адзіны, хто можа дапамагчы яму (і сабе) ў гэтай сытуацыі, паспрабаваць наладзіць кантакт з Захадам — гэта беларуская апазыцыя. І першым гэта зразумеў Мілінкевіч.

Хай са спазьненьнем, але лідэр дэмакратычных сілаў Беларусі ў апошнія дні праявіў сябе сапраўды як лідэр, здольны рабіць учынкі, здольны браць на сябе адказнасьць. Менавіта ўчынкаў чакалі ад Мілінкевіча амаль год пасьля выбараў ягоныя выбарцы, ягоныя прыхільнікі. Значная іх частка паранейшаму зьвязвае зь ім свае спадзяваньні на лепшую будучыню для Беларусі. Менавіта зь ім, а не з палітычнай радай, асобнымі партыямі ці іх кіраўнікамі, у якіх ужо быў час заявіць аб сабе.

Мілінкевічу ўдалося пераступіць заганнае кола, у якім апынуліся дэмакратычныя сілы, у якім яны круціліся гадамі — кола «ратацыі», калі чарговага «лідэра», вылучанага пад выбары, потым выкідалі за адсутнасьцю далейшай патрэбы ды закідвалі каменьнем дзеля захаваньня «кансэнсусу» й «парытэту». У жыцьці апазыцыі панаваў той жа прынцып, што ў жыцьці беларускага грамадзтва: не высоўвайся!

Яскравай ілюстрацыяй яго можа служыць лёс Казуліна, якога былыя аднапартыйцы й хаўрусьнікі, выглядае, ужо выкрасьлілі з сваіх палітычных плянаў і разьлікаў на будучыню.

Зразумела, аднаго ці двух крокаў (калі лічыць першым крокам адкрыты ліст Лукашэнку) яшчэ недастаткова, каб рабіць канчатковыя высновы. Ці ёсьць у Мілінкевіча  ўсьвядомленая стратэгія, плян дзеяньняў, ці мы сталіся сьведкамі спантаннага ўсплёску эмоцыяў, пакуль невядома.

Але ўжо першая рэакцыя на ўчынкі лідэра паказала, што яму ўдалося ўзварухнуць палітычнае балота, паламаць звыклы парадак рэчаў. Зразумела, што асноўнага шквалу крытыкі зь лягеру праціўнікаў трэба яшчэ чакаць наперадзе. І ня столькі з боку ўлады, колькі з боку былых паплечнікаў. Але гэта той выпадак, калі крытыка павінна толькі ўмацоўваць у правільнасьці абранага шляху.

Паказальным у гэтым сэнсе падаецца артыкул Паўла Шарамета «Я в смятении» на сайце «Беларускі партызан». Сама назва, бадай, яскравым чынам апісвае рэакцыю ў стане ворагаў Мілінкевіча. Расейскі журналіст называе Мілінкевіча «прагматычным, занадта асьцярожным», «народжаным не для барацьбы і не для палітыкі». Урэшце, ён абвінавачвае лідэра дэмсілаў нават у «асабістай баязьлівасьці». Але галоўнае абвінавачаньне палягае ў тым, што ён «трымае касу, на ім завязаныя асноўныя фінансавыя

патокі», «за ім стаяць палякі» й г.д. Падобныя характарыстыкі выглядаюць зьнятымі пад капірку з дыктарскіх тэкстаў у праграмах «Панарама» і «Ў цэнтры ўвагі»!

Зрэшты, чаго зьдзіўляцца? Хіба не ў такім самым стылі робяцца й праграмы ОРТ, дзе працуе журналіст? Дарэчы, хіба падобныя абвінавачаньні нельга вылучыць і супраць лідэраў партыяў, якія ўваходзяць у палітраду? І калі ў гэтых абвінавачаньняў ёсьць доказы, чаму б не давесьці справу да канца і ня выкласьці іх у Інтэрнэце, як кнігу Алкаева?

Інакш можа скласьціся ўражаньне, што агульны сэнс абвінавачаньняў на адрас Мілінкевіча зводзіцца да вельмі знаёмай формулы «трэба дзяліцца».

Трэба зазначыць, што гэты артыкул зьявіўся вельмі своечасова. Чэскі міністар абароны на ўжо згаданай канфэрэнцыі ў Мюнхэне падзякаваў Пуціну за тое, што ягоны выступ бліскуча патлумачыў эўрапейцам, дзеля чаго патрэбны блёк NATO.

Публікацыя ў «Беларускім партызане» засьведчыла, што аўтарам гэтага інтэрнэт-выданьня не абыходзіць лёс Беларусі. Яны крытыкуюць рэжым Лукашэнкі найперш з гледзішча яго карыснасьці альбо шкоднасьці для інтарэсаў Расеі. Разьвіцьцё нацыянальнай эканомікі, культуры й мовы іх цікавіць куды ў меншай ступені. Што ж, яны маюць права на ўласны погляд.

Але варта сёньня задумацца тым унутры Беларусі, хто яшчэ зусім нядаўна выказваў думку, быццам краіне няблага было б далучыцца да Расеі, паколькі ўзровень дэмакратыі там вышэйшы. І гэта, маўляў, падвысіла б узровень дэмакратыі ў беларускім грамадзтве, якое да расейскага ўзроўню яшчэ не дарасло.

Гэтая краплёная карта цяпер бітая крамлёўскім кіраўніцтвам. Ніякай дэмакратыі, акрамя сувэрэннай (гэта значыць — дэкаратыўнай), у расейскай палітычнай пэрспэктыве не прадугледжваецца.

Беларусам даўно насьпеў час самім пачаць адбудоўваць дэмакратыю для ўласнай краіны, абапіраючыся на эўрапейскую гісторыю і традыцыі. Расейскія інтэлектуалы-дэмакраты празаходніцкай арыентацыі, загнаныя, як і ў Беларусі, у рэзэрвацыі ў выглядзе некалькіх інтэрнэт-выданьняў, газэт і тэлерадыёстанцыяў, нічым ужо тут не дапамогуць беларусам.

А вось дэмакратычныя пераўтварэньні ў Беларусі, наадварот, могуць паслужыць выразным сыгналам для руху ў бок пазытыўных зьменаў у Расеі, прынамсі, да больш адэкватнага ўспрыманьня ёй свайго месца і ролі ў сучасным сьвеце.

Вольная дэмакратычная Беларусь можа паспрыяць і адраджэньню ідэалаў «аранжавай рэвалюцыі» ва Ўкраіне, больш хуткай інтэграцыі і адзінству Эўропы, што зусім немалаважна ў сьвятле пагрозаў XXI ст.

Для таго, каб іх адолець, важна разьвітацца са спадчынай мінулага. Дэмакратызацыя Беларусі павінна стаць фінальным акордам вызваленьня Ўсходняй Эўропы ад расейскага камунізму, якое пачалося пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны.

Магчыма, сёньня гэта падаецца ўтопіяй. Але ж XX стагодзьдзе — разам з антыўтопіямі Замяціна, Кёстнэра і Оруэла, кожная зь якіх спраўдзілася ў яшчэ больш жудаснай рэчаіснасьці — павінна некалі скончыцца, каб саступіць месца новай эпосе.

І чаму б гэтаму ня здарыцца ў Беларусі?




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Казулін ад пачатку абапіраўся на пярэстую кааліцыю з удзелам беларускіх нацыяналістаў і людзей, цесна зьвязаных з Расеяй.**

# Спаса-Эўфрасіньнеўскую царкву чакае эўрарамонт

Навуковы кіраўнік рэстаўрацыі Ўладзімер Ракіцкі прыпыніў сваю працу на знак пратэсту.

Спыняецца рэстаўрацыя самае старажытнае сьвятыні Беларусі — Спасаўскае царквы XII стагодзьдзя ў Полацку. Да сёлетняга «Славянскага базару» ў Віцебску тут зробяць «эўрарамонт». І выканаюць яго маскоўскія фірмы.

Больш як 15 гадоў навуковым кіраўніком рэстаўрацыі гэтага выбітнага помніка быў мастак Уладзімер Ракіцкі. Ён са сваімі калегамі вынайшоў унікальную сыстэму аднаўленьня старажытных фрэсак, дзякуючы якой удаецца захоўваць і пазьнейшыя слаі жывапісу.

Рэч у тым, што ў Полацку першасны жывапіс закрыты размалёўкамі XVI—XIX ст., і гэтыя размалёўкі маюць пэўную эстэтычную й гістарычную каштоўнасьць. Таму іх ня проста сашкрабаюць са сьценаў, але ашчадна фрагмэнтамі расслойваюць. Такім чынам яны могуць экспанавацца ў іншых месцах. Некалькі вялікіх фрагмэнтаў зьнятага са сьценаў старасьвецкага алейнага жывапісу пачатку XIX ст. перададзеныя ўжо ў Полацкую карцінную галерэю.

За сваю доўгагадовую працу Ўладзімер Ракіцкі ў 2000 годзе быў уганараваны прэміяй «За духоўнае адраджэньне».

Натуральна, такая карпатлівая работа вымагала шмат часу. Цяперашняму кіраўніцтву культурнага ведамства гэта не спадабалася. Чыноўнікі паставілі пытаньне рубам: беларускія рэстаўратары мусяць скончыць усю працу за паўгоду.

Варта нагадаць, што сыстэматычнае ўзнаўленьне самых старажытных фрэсак у Полацку праводзіцца вось ужо чвэрць стагодзьдзя. Сама рэстаўрацыя пачалася з купала, і на сёньня работы трываюць у верхняй частцы сьценаў. Тут першыя фрэскі найбольш захаваліся, і тое, што было адкрыта, дае ўсе падставы назваць шэдэўрам сярэднявечнага жывапісу. Усяго за 15 гадоў адкрытыя і адрэстаўраваныя прыкладна 150 з 600 квадратных мэтраў фрэскавага росьпісу XII ст.


WWW.RADZIMA.ORG

**Фрэскі XII ст., адкрытыя Уладзімерам Ракіцкім.**

Улады захацелі працэс рэстаўрацыі прысьпешыць. Гэта здарылася пасьля наведваньня Полацку прэм’ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім. Улады хочуць скончыць усё да візыту А.Лукашэнкі, што мае адбыцца сёлета 5 чэрвеня, на Дзень Сьвятой Эўфрасіньні.

Да гэтага дня плянуецца 150 кв.м ужо адкрытых фрэсак XII стагодзьдзя закансэрваваць, а заадно аднавіць расейскі алейны жывапіс XIX ст. у рэшце храму. Плянуецца таксама ўрачыста ўсталяваць новую сярэбраную раку для мошчаў сьвятое. Купал пакрыюць золатам. Launched Ператынкуюць царкву звонку. У сярэдзіне сьвятыні зробяць абзорную пляцоўку з жалезнымі лесьвіцамі.

Больш неадпаведную ідэю для старажытнага помніка прыдумаць цяжка, мяркуюць рэстаўратары. На іхную думку, навукова таксама ніяк не абгрунтаваная ідэя стварэньня ў Спасаўскай царкве дарагой мазаічнай падлогі, якая нібыта мае адпавядаць першапачатковай. Але самае прыкрае: ўнікальныя фрэскі аддаюцца ў рукі расейскіх рэстаўратараў, якія раней на аб’екце не працавалі.

Працы па рэстаўрацыі будуць даручаныя Міжабласному навукова-рэстаўрацыйнаму мастацкаму ўпраўленьню пры Міністэрстве культуры й масавых камунікацыяў Расеі, якое раней выконвала працы ў Суздалі, Ноўгарадзе й Македоніі. Расейскія ж будаўнікі з кампаніі «Урал-аспект» будуць мяняць дах, залаціць купал і крыж царквы.

Беларускіх рэстаўратараў абурае тое, што праект «экспрэс-рамонту» Спаса-Эўфрасіньнеўскае царквы быў зацьверджаны без навуковае й архітэктурнае экспэртызы. І тым больш без уліку праекту рэстаўрацыі, распрацаванага Ў.Ракіцкім з калегамі.

Сам У.Ракіцкі пазьбягае камэнтаваць сытуацыю. Аднак стала вядома, што на знак пратэсту Ў.Ракіцкі прыпыніў сваю працу й накіраваў на імя міністра культуры ліст, у якім просіць адхіліць яго ад навуковага кіраўніцтва рэстаўрацыяй храму.

Царква была пабудаваная ў XII ст. на загад сьвятой Эўфрасіньні Полацкай. Менавіта ў гэтай бажніцы перахоўваюцца мошчы Прападобнай Эўфрасіньні. Гэта сапраўдны цуд — тое, што гэтая царква захавалася да нашага часу, і што ў ёй захаваліся выкананыя больш як 800 гадоў таму фрэскі. Сёньня сьцены Спасаўскае царквы ўтрымліваюць культурныя слаі многіх пакаленьняў у выглядзе напластаваньняў, падобных да палімпсэсту. Пасьпешлівасьць тут, бадай, недарэчная. Помнікі — ня тая сфэра, дзе праходзяць штурмаўшчына і валюнтарызм.

**Сяргей Харэўскі**

# Суворава нам не хапала

Трусаў, Марачкін, Пашкевіч скіравалі ліст мітрапаліту з нагоды будаўніцтва храму ў гонар Суворава.

Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі выказаліся супраць ушанаваньня такім чынам памяці расейскага палкаводца ў Кобрыне. Ад серады распачынаецца збор подпісаў пратэсту.

Ініцыятарамі ўзьвядзеньня храму ў гонар расейскага палкаводца Суворава сталі старшыня апякунчае рады па будоўлі Мікалай Кожух ды мясцовы сьвятар Мікалай Лукашык. Апошні ў інтэрвію газэце «Союз» падкрэсьліў: «Пасьля ўводу ў эксплюатацыю храму-помніка аўтаматычна адчыняецца магчымасьць стварэньня Сувораўскага ваенна-гістарычнага комплексу, аналягаў якому няма нават у Расеі». Будучы храм мяркуецца пабудаваць за кошт як бюджэтных, так і «пазабюджэтных сродкаў», а таксама ахвяраваньняў ад прадпрымальнікаў і насельніцтва, прыбытку ад лятарэі «Пабудуем наш храм разам».

Ініцыятары пабудовы храму не хаваюць зацікаўленасьці ў фінансавай падтрымцы з боку Расеі і нават абгрунтоўваюць гэтым выбар асобы Суворава ў якасьці ўшанаваньня: «Пытаньне разглядалася ў Маскве на ўзроўні патрыярха. І калі ён прачытаў пра сувораўскі храм у Кобрыне, то адразу загадаў: «У першую чаргу памагчы гэтаму храму!» Бачыце, які вынік дае імя Суворава», — паведаміў радыё «Свабода» благачынны Берасьцейскай япархіі Ўладзімер Карнялюк.

Аўтары адкрытага ліста выказваюць сваю нязгоду з ідэяй пабудовы храму ў гонар Суворава. На іх думку, праблема «Сувораў і Беларусь» стварае прэцэдэнт пераасэнсаваньня цэлага шэрагу гістарычных асобаў, што, як і Сувораў, дзейнічалі на беларускай зямлі ў інтарэсах Расейскай і савецкай імпэрый насуперак інтарэсам карэннай нацыі.

Як вядома, Сувораў кіраваў задушэньнем паўстаньня Касьцюшкі, а падначаленыя яму салдаты насаджвалі немаўлятаў на пікі ў захопленай Варшаве.

«Моцным бокам праваслаўнай царквы зьяўляецца яе кансэрватыўнасьць у пазітыўным сэнсе гэтага слова, а сама яна заўсёды была мудрым Настаўнікам для сваіх вернікаў», адзначаецца ў лісьце. Аўтары ліста просяць мітрапаліта Філарэта не рабіць пасьпешлівых, непрадуманых крокаў пры вырашэньні дадзенай праблемы.

21 лютага распачынаецца збор подпісаў супраць пабудовы «сувораўскага» храму ў Кобрыне.

**Сямён Печанко**

# Мілінкевіч запрасіў ван дэр Ліндэна на Дзень Волі

«Вы зможаце асабіста пераканацца ў тым, што насамрэч адбываецца ў Беларусі».

Лідэр беларускай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч 21 лютага зрабіў чарговы неардынарны крок. Ён зьвярнуўся з адкрытым лістом да старшыні ПАРЭ Рэнэ ван дэр Ліндэна. Мілінкевіч запрасіў эўрачыноўніка прыняць удзел у сьвяткаваньні Дня Волі.

Мілінкевіч піша: «Мінулы свой візыт Вы ажыцьцяўлялі на запрашэньне афіцыйнага беларускага боку. Спадзяюся, што Вы разумееце важнасьць візыту на запрашэньне, што зыходзіць ад дэмакратычных сілаў Беларусі. Вы зможаце асабіста пераканацца ў тым, што насамрэч адбываецца ў Беларусі».

Нагадаем, што старшыня ПАРЭ знаходзіўся ў Менску сёлета ў студзені. Гэты візыт расцэньваўся як пачатак дыялёгу паміж афіцыйным Менскам і Эўропай.

Прыезд ван дэр Ліндэна 25 Сакавіка амаль напэўна гарантаваў бы бясьпеку маніфэстацыі на Дзень Волі.

**Зьміцер Панкавец**



«СБ»

# Інтэрвію з сынам Лукашэнкі

выйшла ў прэзыдэнцкай газэце «Советская Белоруссия» пад двухсэнсоўным загалоўкам «Заўтра пачынаецца сёньня». Яно суправаджаецца вялікай фатаграфіяй Дзьмітрыя Лукашэнкі за шыкоўным працоўным сталом.

**МБ**

# Люты ў маразы абуты

Прыйшлі брутальныя халады.

20 лютага вецер у краіне зьмяніўся на паўночны, і пачало халаднець. Бліжэйшы тыдзень захаваецца вельмі халоднае надвор'е з начным марозам да 20 градусаў, пры праясьненьнях да -27 градусаў. Дзённая тэмпэратура не перавысіць 6—15 градусаў марозу.

Гэтыя дні небясьпечныя для ўсіх тых, у каго няма добрага жытла, хто адзінокі і хворы. Самы час паклапаціцца пра такіх людзей.

**МБ**

# Дзянісаў зьмешчаны ў СІЗА


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Дзяніса Дзянісава затрымалі 16 лютага на чыгуначным вакзале. Яму закідаецца «арганізацыя і падрыхтоўка групавых дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак» (арт. 342 ч.1 КК). Хлопца ўтрымліваюць у СІЗА №3 Гомеля. Там пацьвярджаюць факт утрыманьня пад вартай Дзянісава, але пры гэтым адмаўляюцца ўзяць перадачу для яго. Паводле відавочцаў, у момант затрыманьня хлопец быў лёгка апрануты.

У СІЗА кажуць, што Дзянісаў хутка будзе перавезены ў іншае месца ўтрыманьня, але куды канкрэтна, стане вядома ў дзень адпраўкі.

Васіль Палякоў, кіраўнік абласной арганізацыі АГП, партыі Дзянісава, мае інфармацыю зь СІЗА, што Дзянісава маюць неўзабаве перавезьці ў Віцебск.

Мінулым летам супраць Дзяніса Дзянісава, а таксама Тацяны Елавой была распачатая крымінальная справа па факце вывешваньня ў Віцебску бел-чырвона-белых сьцягоў.

Малады чалавек улетку належаў да незарэгістраванай арганізацыі «Бунт», што зладзіла ўлетку шэраг акцыяў у Віцебску, Горадні і Менску.

Паводле арт. 342-1 Дзянісу пагражае штраф, арышт тэрмінам да 6 месяцаў, альбо абмежаваньне волі да 3 гадоў, альбо пазбаўленьне волі на той жа тэрмін.

У аўторак з адмысловай заявай у падтрымку Дзянісава выступілі лідэры сакавіцкіх пратэстаў на Плошчы Алесь Мазур, Вячаслаў Сіўчык, Алесь Чыгір.

**СП**

# Часопісу «ARCHE» вынесьлі два папярэджаньні

Цяпер выхад унікальнага беларускамоўнага часопісу можа быць спынены ў кожны момант.

Рэдакцыя часопісу «ARCHE» атрымала папярэджаньні аб парушэньні «Закону Рэспублікі Беларусь аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», датаваныя 12 лютага 2007 г., за подпісам першага намесьніка міністра інфармацыі Лiлii Ананіч. Абодва папярэджаньні вынесеныя за адно і тое ж: за тое, што пасьля трохмесячнага прыпыненьня ў 2006 годзе Рэдакцыя выдала ўсе тры затрыманыя нумары за адзін месяц.

Папярэджаньне за № 29 вынесена заснавальніку часопісу «АРХЭ-пачатак» на падставе артыкулу 16 «Закону Рэспублікі Беларусь аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» за тое, што не было пісьмова ў месячны тэрмін паведамлена ў Міністэрства інфармацыі аб зьмяненьні пэрыядычнасьці выхаду часопісу ARCHE (па




умовах рэгістрацыі штомесячнік, але ў сьнежні 2006 г. былі выпушчаныя тры нумары — №№ 10—12) для ўнясеньня адпаведнага зьмяненьня ў пасьведчаньне аб рэгістрацыі выданьня, што зьяўляецца парушэньнем артыкулу 11 «Закону Рэспублікі Беларусь аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі».

Папярэджаньне № 30 выносіцца рэдакцыі часопісу за парушэньне артыкулу 16 Закону аб друку. «Па ўмовах рэгістрацыі «ARCHE» ёсьць штомесячным пэрыядычным выданьнем. Аднак у парушэньне ўмоваў яго рэгістрацыі рэдакцыя на працягу сьнежня 2006 г. выпусьціла тры нумары часопісу (10—12) без паведамленьня ва ўстаноўленым парадку ў Міністэрства інфармацыі аб зьмене пэрыядычнасьці выпуску выданьня. Мініністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь папярэджвае рэдакцыю часопісу аб недапушчальнасьці парушэньня арт. 10 і 11 «Закону РБ аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі».

Нагадаем, што ў верасьні 2006 г. часопісу выносілася папярэджаньне — за парушэньне артыкулу №11 «Закону РБ аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (за зьмену тэматыкі (спэцыялізацыі) часопісу «ARCHE», публікацыямі грамадзка-палітычнага характару).

У выніку на падставе арт. 16 «Закону РБ аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» Міністэрства інфармацыі прыпыніла выданьне часопісу «ARCHE» на тры месяцы.

У сьнежні, пасьля трохмесячнай паўзы, выйшлі тры нумары часопісу (№ 10, №11, № 12). Калі б такога не адбылося, «Белпошта» скасавала б падпіску, а чытачы засталіся б без аплачаных нумароў.

Два папярэджаньні запар можна разглядаць як своеасаблівую «чорную метку» выданьню. Аднак таксама як знак, што ніякай дэмакратызацыі ў сфэры СМІ не адбудзецца.

**Ул.інф.**

# Працэс Лукашова

З 15 лютага доўжыўся працэс Кастуся Лукашова. Яго вінавацілі ў непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі 29 сакавіка, калі ён вывез са шпіталя свайго брата Вячаслава, якога хацелі забраць міліцыянты.

Кастусь Лукашоў у турэмнай клетцы. Ён кашляе, вочы блішчаць ад нядосыпу й прастуды. Але гаворыць ён гучней за пракурора й судзьдзю.

Лукашоў цалкам адмаўляе абвінавачаньне, што штурхаў міліцыянтаў і наехаў на аднаго зь іх машынаю. Кажа, міліцэйскіх пасьведчаньняў ня бачыў.



WWW.SVABODA.ORG

## Маці

Маці Кастуся плача і просіць прабачэньня ў сына. Яна просіць даравац, што выклікала яго па дапамогу — і цяпер сына судзяць.

Галіна Сіўчык шкадуе, што падумала: «Каб ты зваліўся!» на невядомага ў спартовым (у судзе — пацярпелага міліцыянта Сушчэню)... А ён і зваліўся, калі даганяў машыну.

## Пацярпелы

Спартовыя каротка стрыжаныя хлопцы ў аднолькавай цёмнай вопратцы. Гэта пацярпелы з калегамі.

Старшы лейтэнант Сушчэня распавядае, што з калегаю прыехаў у больніцу забраць Вячаслава Сіўчыка. Што выклікаў для гэтага дапамогу, бо быў вялізны натоўп. Але АМОН, на жаль, пад'ехаў да іншага ўваходу.

Нягледзячы на гэта, Сушчэня паказаў пасьведчаньне і паспрабаваў загад выканаць. Але Лукашоў штурхаў яго ад машыны, перашкаджаў і зьбіў машынаю, зламіўшы пры гэтым мабільны тэлефон міліцыянта.

Пацярпелы незадаволены, як сьведкі распавядаюць, што Сушчэня, даганяючы машыну, зваліўся ў бруд. Гэтага не было! Сушчэня — спартовец, і за машынаю бег.

Старшы лейтэнант Сушчэня нядаўна атрымаў чарговую зорачку. Кар'еру ён распачынаў у СІЗА №1.

Менавіта туды ўвязьнілі Кастуся Лукашова, і ён зьдзіўляўся, чаму канваіры заўсьміхаліся, пачуўшы прозьвішча пацярпелага.

Пацярпелага пытаюцца, як, ён лічыць, трэба пакараць абвінавачанага. «З улікам асобы абвінавачанага...» Сушчэня абсякаецца — і іншым галасам дадае, што патрабуе максымальнага пакараньня, бо ў яго асобе нанесеная абраза ўсёй міліцыі і ўладзе, бо ён — твар улады.

## Сьведкі

Алесь Міхалевіч і Вячаслаў Сіўчык безь перашкодаў выступаюць па-беларуску, а Сіўчык падрабязна распавядае пра сваё затрыманьне…

Сьведкі распавядаюць, што ня бачылі дакумэнтаў (толькі міліцыянт сказаў пра пасьведчаньні, а сьведка Паўлюк Быкоўскі ўзгадаў нейкія бэджыкі) — але для абвінавачаньня гэта дастатковыя доказы, што былі прад'яўленыя міліцэйскія дакумэнты.

Абурэньне пракурора выклікае, што галоўныя сьведкі з боку абвінавачаньня — працоўныя-будаўнікі, — раптам паказваюць, што ня бачылі ці ня памятаюць, каб падсудны кагосьці штурхаў. Але на гэты выпадак ёсьць матэрыялы сьледзтва, дзе запісаны супрацьлеглыя паказаньні.

Аніхто зь сьведкаў ня бачыў сутыкненьня (затое многія распавядаюць, што перасьледнік зваліўся). Абвінавачаньне на гэта: сьведкі блытаюцца, а паказаньням Сушчэні можна давяраць.

У судовым калідоры шмат людзей. Зінаіда Бандарэнка і Радзім Гарэцкі, акадэмік Вайтовіч, Мілінкевіч з Інай Кулей — і Ірына Казуліна, Тацяна Клімава і Лябедзька, Барыс Гарэцкі і Зьміцер Хведарук, кінарэжысэр Хашчавацкі. Падтрымаць Кастуся прыехалі аднакласьнікі і нават суседзі зь лецішча.

Клясная настаўніца прыехала распавесьці суду, які Кастусь у дзяцінстве быў «адказны й добрасардэчны», гэта захавалася й дасёньня — і працытавала Біблію.

Адвакатка пытаецца ў пацярпелага, якую юрыдычную працэдуру той выконваў у шпіталі: арышт ці прывад. Сушчэня губляецца, але падкрэсьлівае, што трэ было выканаць загад. Адвакатка даводзіць, што нават калі б у міліцыянтаў былі ўсе належныя дакумэнты, яны не маглі забіраць чалавека на бюлетэні. (Прывад немагчымы, калі чалавек хворы, адпаведна, загад затрымаць — незаконны.)

## Прысуд

Маглі даць шэсьць гадоў. Прысуд два гады ўмоўна з адтэрміноўкаю на два гады выглядае ледзьве не падарункам.

Пракурор Канода чытаў матэрыялы сьледзтва, утаропіўшыся ў паперкі, дапытваў сьведкаў, дакранаючыся да свайго твару. Гэта жэсты дыскамфорту й няёмкасьці, унутранага канфлікту ці, прынамсі, складанай задачы.

Два гады ўмоўна — хіба гэта страшна?

Наадварот — гэта мяккасьць, гуманізм да асуджанага. Ён на свабодзе. Гэта ўсё, што могуць зрабіць судовыя чыноўнікі на сваіх пасадах. У нашых палітычных умовах. Сумленьне людзей сыстэмы «чыстае». Кожны зь іх зрабіў свой выбар.

**Андрэй Расінскі**

**Суд пад старшынствам судзьдзі Красоўскай прысудзіў Кастуся Лукашова да двух гадоў умоўна з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады. Апроч таго, з Лукашова быў спагнаны 1 мільён рублёў на карысьць пацярпелага.**

**Пракурор патрабаваў пакараньня два гады ўмоўна з адтэрміноўкай на тры гады і спагнаньня двух мільёнаў.**

**Па вызваленьні з-пад варты Кастусь Лукашоў падзякаваў усім, хто яго падтрымліваў. Ён сказаў, што працэс быў помстай ягонай сям'і й спробай спыніць яе актыўнасьць. Але вольную думку ўвязьніць немагчыма, — заявіў спадар Лукашоў.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# «Яўропа!»

Штодня ў Алёшчы загружаюць два-тры вагоны «на Яўропу» — у Італію, Вугоршчыну, Прыбалтыку. За куб круглага лесу — бярозы, асіны, хвоі — на эўрапейскім рынку плацяць ад 20 да 30 эўра. Нягледзячы на спорны гандаль, канцэрн «Полацаклес» балянсуе на мяжы банкруцтва, бярэ крэдыты пад заробак, і штомесяц Сітна ўскалыхваюць чуткі, што леспрамгас вось-вось зачыняць.

Лесанарыхтоўка — адна з тых галінаў беларускае гаспадаркі, якой увесну наўпрост пагражае адмена эўрапейскіх прэфэрэнцыяў. Зразумела, што «правы працоўных», «тэхніка бясьпекі» і «годны заробак» тут паняткі пустыя. Але афіцыйная рэакцыя на эўрапейскія абвінавачаньні ў Алёшчы ўжо зьявілася. На загад з Полацку ў рабочае бытоўцы нечакана вывесілі сьпісы «кіраўніцтва маласіценскага прафсаюзу»(!), «леспрамгасаўскага цэхавага камітэту»(!), а таксама «грамадзкіх інспэктараў»(!). Самі *прафсаюзьнікі, цэхавікі ды інспэктары*, якія ўпершыню даведаліся аб сваіх пасадах з загадкавых папераў, узьнялі дружны рогат: «Гля, Пятро, а ты, аказваецца, інспэктар!», «Ды ты сама, Паўлаўна, проф-груп-орг!». «Цьху ты, не абзывайся…»

«Яўропа! — задаволена выгукае вусаты, з залысінамі, «хімік» Мікола, — усё, цяпер на Захад пойдзем. Будзем па дваццаць еўрыкаў у гадзіну, як у Германіі, атрымліваць». «Раскатаў губу, — ківае кранаўшчык Іван, — Яўропа… У нас хоць ты еўрыкі, хоць тыгрыкі плаці — народ іх прап'е. Яўропа — гэта калі чалавек *к чаму-та страміцца*».

Рэпліка алёшчынскага кранаўшчыка расшыфроўвае лёзунг «Беларусь — у Эўропу!» значна больш дакладна, чым афіцыёз, і куды больш ёміста, чым апазыцыйныя стратэгіі. Па вялікім рахунку, рэч ня ў тым, што нам трэба весьці «шматвэктарную палітыку» ды нават не ў імпэрскай палітыцы Крамля (хаця ўсё гэта — лепш позна, чым ніколі ўсьвядомленыя аксіёмы). У чалавеку ключ. У беларусу. І ў ягоным імкненьні ці неімкненьні.

*Імкненьне* — сутнасьць гістарычнага фэномэну Эўропы. Моцнае, на мяжы магчымасьцяў, імкненьне да свабоды, справядлівасьці, творчасьці. Да духовага адкрыцьця. Да дасканаласьці. Да Бога, урэшце. Калі размаўляеш з украінскімі ды маладаўскімі дэмакратамі, бачыш па тэлевізіі шчасьлівых румынаў ды баўгараў, нават Грузію, што штурмуе брамы Эўразьвязу, бачыш адразу: імкнуцца. А беларуса, старэйшага за сорак, дагэтуль адрозьнівае глыбокі сум, апатыя й бязьвер'е.

Парадаксальна, але менавіта «імкненьне» — найвялікшае пытаньне зараз і для самое Эўропы, асабліва Заходняй, якую зь лёгкай рукі амэрыканцаў ужо павялося называць Старой. У прывабных і велічных рысах Парыжу й Лёндану, Рыму й Мадрыду ўсё часьцей праглядваюць друзлая самазадаволенасьць, апатычнае спажывецтва, расьпешчаны й разбэшчаны дэкаданс, і, як вынік — бездапаможнасьць перад глябальнымі пагрозамі. Часам на адпачынку зазіраеш у вочы Эўропы,

## ХРОНІКА

**15 лютага**

### Інтэрнэт-кавярні ў кіпцюрах КДБ

Цяпер уладальнік інтэрнэт-кавярні або ўпаўнаважаная ім асоба абавязаныя весьці журнал дамэнных імёнаў сайтаў, да якіх карыстальнікі атрымлівалі доступ. Журнал павінен захоўвацца ня менш як 12 месяцаў і падавацца пры неабходнасьці супрацоўнікам дзяржбясьпекі, праваахоўным органам і органам дзяржкантролю. Адпаведныя палажэньні зьмешчаныя ў пастанове, якую прыняў беларускі ўрад «у мэтах рэгуляваньня адносінаў у сфэры ажыцьцяўленьня дзейнасьці кампутарных клюбаў і інтэрнэт-кавярняў».

**16 лютага**

### Саюзу левых партый адмоўлена ў рэгістрацыі

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў дзяржаўнай рэгістрацыі **Саюзу палітычных партый** «Саюз левых партыяў». СЛП закідаюць парушэньне вызначанага парадку стварэньня саюза: згодна з дзейным заканадаўствам, дзейнасьць палітычных партыяў, зарэгістраваных у Беларусі, можа распаўсюджвацца толькі на тэрыторыю Беларусі.

Акрамя таго, паводле Міністэрства юстыцыі, правядзеньне канфэрэнцыі ў Чарнігаве суправаджалася неаднаразовымі парушэньнямі заканадаўства.

### Амэрыканскіх грамадзянаў дэпартавалі зь Беларусі

**Дзесяцёх грамадзянаў ЗША**, якіх зьвінавацілі ў парушэньні правілаў знаходжаньня ў краіне, дэпартавалі зь Беларусі. Паводле афіцыйнага тлумачэньня, замежныя грамадзяне нібыта незаконна выкладалі й ажыцьцяўлялі рэлігійную дзейнасьць. Усе амэрыканцы аштрафаваныя на адну базавую велічыню. Ім забаранілі наведваць Беларусь цягам двух гадоў. Амэрыканцаў запрасіла **аб'яднаньне «Стэфанус»** — у межах дабрачыннай акцыі «Ангельская мова для ўсіх» яны вялі бясплатныя практыкумы ангельскай мовы. Заняткі праходзілі ў царкве Эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў.

### Аляксандру Казуліну працягнулі рэжым выхаду з галадоўкі

Адміністрацыя калёніі «Віцьба-3» працягнула адмысловы рэжым для палітвязьня **Аляксандра Казуліна**, у якога пасьля спыненьня 53-трохдзённай галадоўкі рэзка пагоршала здароўе. Раней адвакатам і сваякам асуджанага ў калёніі казалі, што 15 лютага Аляксандра Казуліна перавядуць на звычай-

«Эўраньюз», і заўважаеш надзіва родную млявасьць і абыякавасьць да жыцьця, уласьцівую старэйшым пакаленьням беларусаў.

Жывое, актыўнае хрысьціянства, якое і прадвызначыла тысячагадовы эўрапейскі ўздым, зьмянілася панаваньнем матэрыялізму, месцамі з рытуальнай рэлігійнасьцю. Бяз моцнага ўнутранага штуршка, які скаланае нацыі й грамадзтвы, дапамагае пераадолець крызіс і зноў адчуць сваю місію ў духовым імкненьні, Эўропа ўпадае ў дэпрэсію.

Новае эўрапейскае абуджэньне ідзе з *Новай*, Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Ужо сёньня і Польшча, і Ўкраіна, і Латвія, і Балканы перажываюць хрысьціянскае ўзрушэньне. Беларусь пакуль ледзь угадваецца ў гэтым шэрагу. Але варта ўзьняцца Беларусі — і Новая Эўропа, раптам стаўшы адзінай, выбухне эўрапейскім узыходам.

Бо беларуская Эўропа — гэта не спадарожнікавая міска на паўразваленай хаціне, купленая за «ягадныя грошы», гаспадар якой шчоўкае пультам, шукаючы эратычных каналаў, і не набор лядоўняў ды пральных машынаў «Siemens», нажытых на продажы «максімкі» аднавяскоўцам. У адрозьненьне ад *Яўропы*, Эўропа — гэта ня зьнешні марафет. Сапраўдная Эўропа — у сэрцы, поўным любові да Бога, бліжняга і Радзімы.

Беларускія эўрапейцы — гэта маладафронтаўцы, якія сёлета вось ужо дзясяты год абыходзілі заходнія амбасады зь віншаваньнямі на Дзень Сьвятога Валянціна. У іх перасаджалі лідэраў, павыклікалі падчас акцыі ў КДБ арганізатараў, блякавалі ля пад'ездаў дасьведчаных «вулічнікаў», а шэсьце ўсё адно рушыла. Нарэшце выхапілі проста з калёны стыхійных завадатараў — а маладафронтаўцы ідуць. Імкнуцца! І даходзяць да Польшчы, Нямеччыны, ЗША, каб перадаць ім: мы хочам быць Эўропай! І невыпадкова адзіны апазыцыйны лідэр у маладзёвым шэсьці — стоадсоткавы *эўрапеец* Аляксандар Мілінкевіч.

І Малады Фронт, і Мілінкевіч раптоўна ўкліньваюцца ў «заходнюю гульню» рэжыму і блытаюць яму ўсе карты. Адсюль — і арышты, і крыміналкі, і штрафы, і прапагандовы шал. Чарговы сыгнал Брусэлю: «Но-но, гаспада, ніякіх размоваў пра палітыку — нас цікавіць толькі эканоміка».

Абвясьціўшы разварот на Захад, рэжым пасьлядоўна *кітаізуе* Беларусь. Характэрнае азіяцкае прымружваньне ў самым цэнтры Эўропы — выклік усёй заходняй дэмакратыі.

Таму беларускім дэмакратам ня мае сэнсу засяроджвацца на эканамічным гандлі, які распачаў рэжым. Найбольш моцны кірунак апазыцыйнага дыялёгу з Эўропай палягае якраз у сфэры нематэрыяльных каштоўнасьцяў. У тае сфэры, якая зрабіла Эўропу Эўропай. Адстойваньне нацыянальнай незалежнасьці. Пытаньні мовы й культуры. Абарона правоў чалавека й хрысьціянскіх прынцыпаў.

Беларусь — сэрца Эўропы.

І я веру: зараз менавіта ў сэрцы беларуса вырашаецца, быць ці ня быць Эўропе.

Задача пад сілу нацыянальнаму абуджэньню!

*в.Малое Сітна*

«Яўропа — гэта калі чалавек к чаму-та страміцца».

## ХРОНІКА

ны рэжым утрымання і прымусяць ізноў працаваць. Цяпер А. Казулін па-ранейшаму мае права не выходзіць на працу — яго глядзяць лекары, ён атрымлівае адмысловае харчаваньне з улікам былой галадоўкі.

### Дзень Салідарнасьці ў Менску

Каля ста моладзевых актывістаў прайшлі з запаленымі сьвечкамі па праспэкце Францыска Скарыны ў Менску. Такім чынам маладыя беларусы выказалі салідарнасьць з палітвязьнямі і сем'ямі зьніклых апазыцыянэраў. Супрацоўнікі АМОНу цягам акцыі суправаджалі моладзевых актывістаў, а ў сквэры імя Янкі Купалы, калі людзі паставілі сьвечкі на зямлю, затапталі агеньчыкі нагамі. Нікога з удзельнікаў акцыі, тым ня менш, не затрымалі.

На сьцяне кінатэатру «Кастрычнік» і на мосьце каля Чыгуначнага вакзалу зьявіліся расьцяжкі з надпісам «Свабоду палітвязьням!»

### ...у Бабруйску

Чарговая акцыя, прысвечаная Дню беларускай салідарнасьці, у Бабруйску прайшла без перашкодаў з боку супрацоўнікаў міліцыі. Людзі сабраліся з запаленымі сьвечкамі каля капліцы на вул.Менскай.

### 19 лютага

### Справу Хведарука передалі ў пракуратуру

Моладзевы актывіст **Зьміцер Хведарук**, супраць якога разам з **Алегам Корбанам** 4 лютага была ўзбуджаная крымінальная справа за дзейнасьць ад імя незарэгістраванага «Маладога Фронту», атрымаў афіцыйнае паведамленьне аб тым, што справа была перададзеная ў пракуратуру. Пастанова падпісаная **капітанам КДБ Дзьмітрыем Сьвістуном**. Тым самым, што кіраваў дзеяньнямі супрацоўнікаў ПМСН падчас затрыманьня ўдзельнікаў паседжаньня Цэнтральнай Рады МФ 4 лютага.

### 20 лютага

### Справа царквы «Новае жыцьцё» перанесеная ў чарговы раз

Прычынай пераносу стала няяўка праўніка Менгарвыканкаму Ігара Касьяровіча. Гэта ўжо трэці перанос справы па яго віне. На паседжаньне зьявіліся два прадстаўнікі Менгарвыканкаму, кожны зь якіх, па сьведчаньні **праўніка царквы Сяргея Луканіна**, меў паўнамоцтвы для вядзеньня справы. Аднак **прадстаўніца аддзелу па справах рэлігіяў Менгарвыканкаму Алена Радчанка** ініцыявала перанос справы на чацьвер.

# Таму, які так і ня стаў на шлях выпраўленьня

У нядзелю, 11 лютага, у Малым Сітне Павал Севярынец атрымаў прэмію імя Алеся Адамовіча.

Гэтую прэмію Беларускі ПЭН-цэнтар традыцыйна ўручае найлепшаму публіцысту году. Павал Севярынец уганараваны за цыкл публікацыяў «Лісты зь лесу», што друкуецца ў «НН» ад самага пачатку Паўлавай высылкі.

Зь Менску ў Малое Сітна накіраваліся пісьменьнік Уладзімер Арлоў, перакладчык Лявон Баршчэўскі, дырэктар зачыненага ліцэю імя Якуба Коласа Ўладзімер Колас. У Полацку да іх далучыліся пісьменьнікі Ірына Жарнасек, Лера Сом і Вінцэсь Мудроў.



WWW.SVABODA.ORG

**Уладзімер Арлоў, Лявон Баршчэўскі, Вінцэсь Мудроў апроч прэміі прывезьлі Паўлу стос новых кніжак.**

Апроч дыплёму ды памятнага мэдаля везлі Севярынцу, як зазвычай, гарбату, чакаляд, але найперш яблыкі, апэльсыны. Бо зараз у Сітненскай краме можна знайсьці вітаміны толькі аднага гатунку — салянка ў слоіках.

Павал сустракае гасьцей на ганку інтэрнату, ён рады бачыць кожнага, хто прыяжджае да яго. Ля ног Севярынца круціцца кот Партызан.

Праходзім у пакой. Паўлаў сусед перапрашаецца і зьнікае, «каб не замінаць». Трымаючы ў руках дыплём, Севярынец адзначыў: «Атрымаць прэмію, названую ў гонар Алеся Адамовіча — вялізная адказнасьць. Алесь Адамовіч быў тым чалавекам, які ў страшным для беларусаў XX стагодзьдзі сфармуляваў беларускі адказ на мілітарызм, нацыянальны прыгнёт, на падаўленьне ўсяго беларускага».

Павал частуе гасьцей гарбатай з кавай. Ён асьцярожна разважае пра датэрміновае вызваленьне. Камісія па разглядзе ягонай справы была прызначаная на 15 лютага. (Рашэньне будзе ранейшым: «Асуджаны так і ня стаў на шлях выпраўленьня».)

Павал жартуе, дзеліцца ідэямі, расказвае пра пляны стварэньня ў Сітне філіі ТБМ. Кажа, што яму бракуе інфармацыі, таму распытвае абсалютна пра ўсё, што робіцца ў Менску. Расказваем, як можам, але высьвятляецца, што ў Сітне пра ўсё гэта ўжо ведаюць.

У Паўла новыя суседзі па інтэрнаце. «За час маёй «хіміі» праз мяне чалавек 30 пасьпела праплысьці, а я, як тая малпа з показкі, сяджу і лічу», — кажа ён. Адзін Паўлаў сусед нядаўна п'яным выкраў Севярынцаў мабільнік і пабег на гару, дзе «цягне» сувязь, тэлефанаваць «опэру», але яго ўдалося выкрыць.

Севярынец паказвае паштоўкі салідарнасьці, што прыходзяць зь дзясяткаў краінаў. За час зьняволеньня Павал атрымаў больш за тысячу лістоў.

Тры гадзіны гасьцяваньня ў Севярынца пралятаюць імгненна, ужо час ехаць дадому, бо пачынае цямнець. Севярынец пацiскае на разьвітаньне кожнаму руку і доўга махае нам усьлед. Нехта ў спадзяваньні кажа: «Няхай бы болей нікому не было патрэбы сюды прыяжджаць да Севярынца».

Між Дрэтуньню і Полацкам на дарозе мы бачым пару ласёў з маленькімі ласянятамі. «Нашая беларуская Сібір», — жартуе Ўладзімер Арлоў.

**Зьміцер Панкавец,**
**Малое Сітна — Менск**

# Дашкевіч вылучаны на прэмію імя Кэнэдзі

Рашэньне аб вылучэньні прынялі 15 лютага беларускія праваабаронцы (Людміла Гразнова, Іна Кулей, Міхаіл Пастухоў, Гары Паганяйла, Алег Волчак).

Праваабаронца Людміла Гразнова распавяла, што атрымала ліст ад «Мэмарыялу Робэрта Кэнэдзі» з прапановай вылучыць у бягучым годзе кандыдата на прэмію імя Кэнэдзі. Крытэры прэміі — абарона правоў чалавека, асабістая сьмеласьць і аўтарытэт, а таксама прыналежнасьць да недзяржаўнай арганізацыі, якая робіць істотны ўнёсак у працэс пераўтварэньняў у краіне. Па яе словах, Зьміцер Дашкевіч цалкам адпавядае неабходным крытэрам.

Былы судзьдзя Канстытуцыйнага суду Міхаіл Пастухоў ад сябе прапаноўваў кандыдатуру праваабаронцы Валер'я Шчукіна, аднак было вырашана, што ён не зусім адпавядае крытэрам, бо займаецца праваабаронча дзейнасьцю па-асобку.

Цяпер праваабаронцы займаюцца зборам неабходнай інфармацыі пра дзейнасьць лідэра незарэгістраванага «Маладога фронту», якую трэба даслаць у «Мэмарыял Робэрта Кэнэдзі» да 15 красавіка.

Прэмія імя Робэрта Кэнэдзі заснаваная ў 1984 г. старэйшай дачкой Р. Кэнэдзі Кэтлін. Летась ляўрэатам прэміі стала праваабаронца з Дамініканскай Рэспублікі Соня П'ер. Прэміяльны фонд складае 30 тысячаў даляраў.

**Сямён Печанко**

# Пятрушка Шустрава: Уладзь Міхайлаў патрабуе салідарнасьці

Вядомая чэская дысыдэнтка даслала ў «Нашу Ніву» ліст, даведаўшыся аб прызнаньнях Уладзя Міхайлава, які пакаяўся ў супрацоўніцтве зь беларускім КДБ на шкоду беларускай дэмакратычнай апазыцыі.

Напрыканцы студзеня польскі «Tygodnik Powszechny» надрукаваў даўгое інтэрвію з дваццацігадовым беларускім студэнтам у Польшчы Ўладзем Міхайлавым, які прызнаўся, што стаў агентам беларускага КДБ. Міхайлаў даволі падрабязна апісвае спосаб, якім афіцэры КДБ схілілі яго да супрацоўніцтва, як яму пагражалі, апісвае таксама, якія меў праблемы ва ўнівэрсытэце, калі паспрабаваў ад супрацы тае адмовіцца. Яму пашчасьціла зьехаць на навучаньне ў Польшчу, ды ўжо там ён вырашыў усё распавесьці.

На дзень раней, чым у польскім друку, ён зьмясьціў прызнаньне на сваёй інтэрнэт-старонцы, і дыскусія, якая пад ягоным тэкстам разгарэлася, вельмі павучальная, калі не сказаць — тыповая. Частка дыскутоўцаў ухваляе рашэньне Міхайлава прызнацца ў супрацы, але шмат хто гнеўна вычытае яму тую супрацу, часам і ў вельмі злоснай форме, за здраду апазыцыйнаму руху.

Часткова я разумею тую злосьць: гэта заўсёды шок — даведацца, што нехта здраджваў сваім сябрам і калегам. Нядаўна мы сядзелі ў рэстарацыі, наша гутарка пайшла пра былых супрацоўнікаў чэхаславацкай Дзяржаўнай бясьпекі вакол Хартыі'77, якія прызналіся толькі тады, калі іх пра тое засьведчылі ўжо адкрытыя матэрыялы з архіваў. І праз 17 год было бачна, што мы не абыякавыя да гэтага, хай і даўна жывем у свабоднай краіне і, безумоўна, мелі шмат часу са старымі здрадамі разабрацца. Але відавочна, што гэта ня так проста.

Адначасова я разумею, у якім цяжкім становішчы цяпер Уладзь Міхайлаў: беларускі КДБ яму адкрытую заяву безумоўна не забудзе, а таму ён патрабуе салідарнасьці вакол сябе ад людзей са свайго асяродзьдзя. Таму болей разумна было б прыглушыць эмоцыі, не сварыцца на вінавагага, які да ўсяго сам прызнаўся, а наадварот, імкнуцца неяк дапамагчы яму. Вядома, будзе шмат такіх, якія ўжо ня будуць здольныя Міхайлаву верыць — але, зь іншага боку, яны і ня мусяць яму ўсё распавядаць.

Даць згоду на супрацу хай зь беларускім КДБ ці якой іншай камуністычнай таемнай службай, безумоўна, было памылкай. Але адначасова трэба і дадаць, што працаўнікі таемных службаў умелі і ўмеюць добра вызначаць, чым каго прыманіць і што на кім выкарыстаць, ды ведаюць, што ня кожны здольны адолець гэты ціск. Пра гэта мы даведваемся сёньня нават у свабодных грамадзтвах.

Найразумнейшым спосабам як выйсьці з такога непрыемнага становішча ёсьць акурат той, што абраў Міхайлаў. Агент, які прызнаўся, ужо ня будзе карысны для таемных службаў. У выпадку дваццацігадовага студэнта з апазыцыйнымі поглядамі гэта ўжо амаль на 100 адсоткаў! Ведаю некалькі такіх выпадкаў з былога чэхаславацкага дысыдэнцкага руху — рэакцыі былі падобныя. Адныя абураліся, іншыя з разуменьнем успрымалі



TYGODNIK POWSZECHNY

чалавечыя памылкі. Аднак я ведаю і прыклады, калі людзі спрабавалі ўнікнуць супрацы, але пры гэтым нават не сказалі сябрам і знаёмым, што ўласна здарылася. У такіх выпадках перасьлед гэбістаў быў асабліва жорсткі.

Другі варыянт — працягваць супрацу пад страхам, каб сябры ды калегі не пакінулі чалавека, не адвярнуліся, ёсьць, напэўна, тым найгоршым, які можна прыняць у такім становішчы. Лукашэнкава панаваньне ў Беларусі не назаўсёды, калісьці і там супольнасьць стане дэмакратычнай і архівы КДБ выдадуць свае таямніцы.

**Пятрушка Шустрава,**
**адмыслова для Нашай Нівы,**
**пераклад з чэскай**
**Ільля Глыбоўскі**



**Пятрушка Шустрава**

публіцыстка, былая рэдактарка «Lidové Noviný». У 1969—71 г. была зьняволена за апазыцыйную дзейнасьць. Падпісантка Хартыі'77 (1 студзеня 1977), з 6 студзеня 1985 г. да 7 студзеня 1986 г. — прэс-сакратарка Хартыі'77. У сярэдзіне 90-х — віцэ-міністар унутраных спраў Чэскай Рэспублікі.

## Насуперак прагнозам

Ляўрэатам літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» за 2006 год — за кнігу «Дыялёгі з Богам» — стаў пісьменьнік Валянцін Акудовіч. Пра гэта ў пятніцу, 16 лютага, аб'явіў старшыня Таварыства вольных літаратараў Алесь Аркуш.

Разам з Акудовічам намінантамі на «Гліняны Вялес» сёлета былі Сяргей Балахонаў, Зьміцер Вішнёў, Міхась Андрасюк ды Андрэй Хадановіч.

Летась «Вялеса» за кнігу публіцыстыкі «Вострая Брама» атрымаў Сяргей Дубавец.

**Зьміцер Панкавец**

## Нобэлеўскі ляўрэат Архан Памук уцёк з Турцыі



Калі на пачатку сьнежня, праз два месяцы пасьля атрыманьня літаратурнага Нобэля, Архан Памук прыляцеў у Турцыю, у аэрапорце яго віталі сотні прыхільнікаў, а ўсе СМІ казалі пра прыезд «сына народу».

Напрыканцы студзеня, два тыдні пасьля забойства нацыяналістам армянскага журналіста Гранта Дзінка, Памук пакідаў Турцыю ў сьпешцы і бяз шуму. З таго часу пісьменьнік, гэтак жа, як і Дзінк, зьненавідны для шавіністычных колаў, маўчыць.

Ён адмяніў заплянаванае на люты турнэ па Нямеччыне, дзе жыве найбольшая ў Эўропе дыяспара туркаў (3 мільёны чалавек). Турэцкія і нямецкія СМІ пісалі, што прычынай раптоўнай зьмены пляну была інфармацыя пра замах, што рыхтуецца на ляўрэата ў Нямеччыне. Колькі дзён да таго Ясін Хаяль, якога абвінавачваюць у замове забойства Гранта Дзінка, пагражаў у судзе Памуку, што той будзе наступным.

У сваіх кніжках Памук піша пра Турцыю і туркаў, якія знаходзяцца на вечным раздарожжы паміж Усходам і Захадам, сучаснасьцю і адсталасьцю. Пісьменьнік закранае спрэчныя для туркаў тэмы — забарону мусульманскіх хустак у школах, супрацьстаяньне сьвецкіх і рэлігійных сілаў, няўменьне расквітацца зь мінулым.

Памук, якога ўжо даўно крытыкуюць за брак патрыятызму, выклікаў сярод шавіністаў сапраўды магутную хвалю абурэньня два гады таму, калі ў інтэрвію швайцарскай газэце, кажучы пра вынішчэньне туркамі армянаў на пачатку XX ст., заявіў, што «загінуў мільён армянаў і ні ў кога няма адвагі казаць пра гэта». За гэтыя словы яго прыцягнулі да суду, аднак справа была спыненая.

Выдавец пісьменьніка сьцьвярджае, што ад'езд у ЗША кароткачасовы, а мэдыі шукаюць сэнсацыі там, дзе яе няма. Аднак вядомы турэцкі публіцыст Фаціх Алтайлы высьветліў, што Памук забраў з сваіх рахункаў у Турцыі ўсе зьберажэньні. Ён таксама размаўляў са знаёмымі Памука, якім той прызнаваўся, што баіцца за сваю бясьпеку. «Ён казаў, што пакідае Турцыю і няхутка вернецца дахаты», — сьцьвярджае Алтайлы.

Падчас свайго знаходжаньня ў Турцыі Памук быў пад аховай паліцыі. З часу забойства Дзінка такая ахова прызначаная ўжо больш як тузіну інтэлектуалаў.

**Вольга Данішэвіч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Мэдыкі выратавалі Законьнікаву руку

Нядаўна паэт перанёс складаную апэрацыю.

«Ён парваў мышцу на руцэ, і сухажыльле таксама, — распавяла «Народнай волі» жонка Сяргея Законнікава. — Нялоўка падняў кардонную скрынку кілаграмаў дзесяць вагой. А па маладосьці плячо было траўміравана ў аўтааварыі, вось пашкоджаная мышца і ня вытрымала...»

Пасля апэрацыі Законнікаў адмовіўся ад абязбольвальных. «Яму адзін укол слабенькі ўшпілілі, але адразу сэрца схапіла — яно крыху барахліць, — кажа жонка паэта. — І апэрацыю праз гэта прыйшлося рабіць пад мясцовым наркозам».

Зычым Сяргею Іванавічу хутчэйшага выздараўленьня!

**Паводле «Народнай волі»**

# «Плошчы» не было

У аўторак у галерэі «Мастацтва», што на Незалежнасьці, 12, адбылося адкрыцьцё пэрсанальнай выставы мастака Аляксея Марачкіна. Выстава мае назву «ТАМ», якая літаральна расшыфроўваецца як «Тутэйшым Аматарам Мастацтва», альбо «Такі Алесь Мара». Рэдкі выпадак, калі падкрэсьлена нацыянальны мастак змог атрымаць для экспазыцыі сваіх працаў галерэю ў цэнтры сталіцы.

Нягледзячы на тое, што выстава Марачкіна была ня дужа добра прааНансаваная ў СМІ, сабралася поўная заля людзей. Прыемна, што ў «Мастацтве» сабраліся людзі розных вякоў. Ад зусім яшчэ маладых навучэнцаў Мастацкай вучэльні імя Ахрэмчыка да мэтраў беларускага жывапісу.

Павіншаваць Аляксея Марачкіна прыйшлі старшыня Саюзу мастакоў Беларусі Ўладзімер Басалыга, скульптар Алесь Шатэрнік, драматург Аляксей Дудараў, паэт Генадзь Бураўкін. Таксама супала, што акурат у гэты дзень сваё 60-годзьдзе адзначае вядомы рэжысэр Валер Мазынскі, таму віншаваньні і прэзэнты ад гасьцей накіроўваліся ня толькі Марачкіну.

Сам Аляксей Марачкін чытаў свае гумарыстычныя паэтычныя прысьвячэньні Яўгену Шунейку, Рыгору Сітніцу, Міхасю Савіцкаму, Паўлу Севярынцу. На імпрэзе прысутнічалі таксама жонка і ўнукі мастака.

Прагназаванай прэзэнтацыі карціны «Плошча» не адбылося. У працiўным выпадку Марачкін мог падставіць і галерэю, і яе кіраўнічку, якая згадзілася прадставіць залю толькі калі пераканалася, што «Плошчы» там ня будзе. Сам Марачкін абяцае бліжэйшым часам усё ж прэзэнтаваць гэтую карціну. Праўда, пакуль невядома, калі і дзе. Найбольш верагодна, што ва ўправе БНФ.

Бліжэйшымі днямі выстава працягне сваю працу. Таму ўсе ахвотныя яшчэ пасьпеюць паглядзець на працы мастака.

**Зьміцер Панкавец**

## Прапаную стварыць рух «За ашчаднасьць»

**Ашчаднасьць ёсьць важкім складнікам сучаснага сьветапогляду. Без ашчаднага стаўленьня да прыродных рэсурсаў існуе пагроза існаваньню самога «гаспадара прыроды».**

Часта ашчаднасьць разглядаюць як штосьці грамадзкае, дзяржаўнае, што не пад сілу аднаму чалавеку. Але ёсьць прыклады, калі ашчаднасьць карысная найперш асобе, а памножаная на грамадзтва — усім.

Цяперашнім часам у крамах можна набыць энэргаашчадныя лямпы, што спажываюць у пяць (!) разоў менш электраэнэргіі, чым звычайная лямпа (18 Вт замест 100 Вт) з той самай колькасьцю сьвятла. Ашчадная лямпа дае прыемнае для вачэй асьвятленьне, мала награецца, мае тэрмін службы 3000 гадзінаў. Каштуе такая лямпа прыкладна 7 тысячаў, зьберагае ж (100 – 18 Вт) × 3000 гадз = 246 кВт/гадз электраэнэргіі. Памножце на тарыф, і вы пабачыце, што адна лямпа дае эканомію 10 тыс. рублёў нават пры ільготным тарыфе. А ў кватэры, у доме, у службовым памяшканьні, на прадпрыемстве — не адна лямпачка. Памножаная на мільёны спажыўцоў, эканомія толькі на асьвятленьні можа сягаць да 1000 МВт электраэнэргіі. А гэта ўзровень магутнасьці атамнага рэактару. Толькі пераабсталяваць адзін з заводаў на вытворчасьць ашчадных лямпаў будзе каштаваць шмат таньней, чым будаваць той рэактар. Дый у выніку краіна будзе мець сучаснае прадпрыемства, а не гнілы зуб — АЭС, выдаляць які давядзецца нашым нашчадкам. Да таго ж, кожная АЭС забруджвае наваколье — гэта «Чарнобыль запаволенага дзеяньня». А грошы, заплянаваныя на будаўніцтва АЭС, можна пусьціць на энэргазьберагаючыя тэхналёгіі, на заводы па перапрацоўцы батарэйкаў, акумулятараў, сьмецьця. Ад гэтага будзе больш карысьці здароўю людзей.

Мной пазначана толькі адна крыніца эканоміі. Мяркую, што агульнымі высілкамі будуць знойдзеныя і іншыя, а вынікам грамадзкага руху «За ашчаднасьць» хацелася б бачыць адмову ад будаўніцтва АЭС у нашай краіне. Прапаную спадарству выказаць сваё гледжаньне на гэтую тэму.

Я ж магу паведаміць такія дадзеныя:

Наша сям’я пачала карыстацца ашчаднымі лямпамі ў лістападзе 2006 г., а са студзеня 2007 г. нашу кватэру асьвятляюць ужо сем такіх лямп. У выніку за тры зімовыя месяцы спажыта 630 кВт/гадз электраэнэргіі, а за дзьве папярэднія зімы было спажыта па 1000 кВт/гадз (у нас электрапліта). Такім чынам, нават пры нашым ільготным тарыфе за тры месяцы мы ўжо вярнулі кошт трох набытых лямпачак.

Таму, хто не сьпяшаецца далучыцца да руху «За ашчаднасьць», раю пачытаць пастанову ўраду ад 30.01.2007 г. адносна новых тарыфаў на энэргію для насельніцтва.

**Валер Конаш, Менск**

Кантакт аўтара ёсьць у Рэдакцыі.

## Балта-Чарнамор’е, старадаўнія паркі, падарожжа Ядвігіна Ш.

**Вось ужо другі месяц ідзе так званая газавая і нафтавая вайна паміж Менскам і Масквой.** Чаму ж вы не надрукуеце матэрыялы 90-х гадоў на гэтую тэму З.Пазьняка? Я сам добра памятаю тыя часы, і калі мне трапілі ўлёткі Народнага Фронту, я і сам добра не разумеў тады, што такое Чарнаморска-Балтыйскі калектар . На вашым месцы я сабраў бы ўсе выступленьні Лукашэнкі з аднаго боку, а з другога — усё, што гаварыла, пісала, прапаноўвала наша апазыцыя. Стала б ясна, хто меў рацыю.

Па-другое. На тэрыторыі Беларусі да гэтай пары захавалася больш за 400 старадаўніх паркаў. Яны розныя па сваёй плошчы, ад велічных садова-паркавых ансамбляў Нясьвіжу, Гомеля да невялікіх паркаў пры маёнтках. Захаваліся ў рознай ступені. Час і чалавек робяць сваю справу, яны зарасьлі, зьдзічэлі, месцамі часткова высечаны і забудаваны, часам перапляняваны і нярэдка ня ў лепшы бок. Колькі яны тояць цікавага, таямнічага і яшчэ многа чаго! Пішыце пра гэта.

Па-трэцяе. У факсымільным выданьні «НН» за 1910 год «Лісты з дарогі» Ядвігіна Ш. — 16 лістоў. З падарожжа майго земляка пешшу зь Вільні ў Карпілаўку. От каб хто праехаў, прайшоў праз 100 гадоў той жа дарогай.

**У.Матусевіч, Шапялі (Менскі р-н)**

## Хіба гэта незалежнасьць?

**Сяджу вось і ўспамінаю казку пра Бураціна. А цяпер загадка: калі ў вышэйзгаданай казцы зьмяніць словы «закапай манэткі ў глебу» на «набудзь білецік «Наша лято», то як завецца Краіна Дурняў?**

Не лічу краіну нашу Краінай Дурняў. Але ўсё ж...

Замест славы нашых рыцараў — кветачкі-пшанічка: мы ж «мірныя людзі». Мірныя... Пасярэдзіне Эўропы, усю гісторыю пабудавалі на змаганьні, а стаўшы намінальна незалежнымі, адракаемся ад роднае мовы, зьняволіваем патрыётаў, каб не крычалі залішне, а гістарычны сьцяг прызнаём незарэгістраванай сымболікай...

Якая можа быць улада народу, калі ў нашыя галовы старанна ўбіваецца страх выказаць думкі. Навошта ж пісаць правы чалавека, калі мы адкрыта іх парушаем? Выкрасьліце 6 гэтыя пункцікі. Ці гэта — нашая незалежнасьць? Не, гэта залатыя краты, на якія мы старанна не зважаем. А яшчэ шырока распаўсюджаны прынцып: «Ня лезь. Навошта табе праблемы?» А з партрэту культурнага чалавека зацята выбіваюць палітычную сьвядомасьць і актыўнасьць.

**Ганна, Менск**

## Ці збавяць нас камяні?

У заходніх краінах захоўваюць помнікі дойлідства, усё, што зьвязана з гісторыяй. Мы ж маем усё наадварот. Чытаем у прэсе: там і там зруйнавалі рэшткі сядзібы ... ст., будынак ... ст. і г.д. Чытаем, што трэба абараняць той помнік, гэты. Але ці збавяць наш народ гэтыя камяні?

Найперш Беларусі патрэбен Хрыстос. Адрынулі людзі ад сэрца Бога. Як вынік гэтага Госпад адняў у народа, за некаторым выключэньнем, розум, мову, пазбавіў духоўнага адзінства, што вызначае людзей як нацыю. Кругом пануе страх, распуста, у многіх гарадах і вёсках вечарам страшна выйсьці на вуліцу, беларускае выгнана за межы Беларусі на 90%.

Ня трэба шкадаваць, што разбураюць дзесьці адно і другое. Ці ня Суд гэта Госпадні за тое, што амаль зь дзесяцімільённага народу адзінкі падтрымалі моладзь, якая пайшла на Плошчу? Мне па-чалавечы шкада, што ў турме Казулін, Севярынец, Дашкевіч, Фінькевіч і іншыя, каго штрафуюць, звальняюць. Браты і сёстры! Бог з вамі, і тысячы вашых аднадумцаў салідарныя з вамі, ня падайце духам, верце, што гэткім чынам Бог ачышчае нашу Беларусь для маладога пакаленьня, якое будзе жыць пахрысьціянску. А тым, хто зараз церпіць за Праўду, за Веру, скажу Словам Пісаньня: «І першыя стануць апошнімі, а апошнія стануць першымі».

**Беларус Сяргей Ц., Бегам’е**

## Dzivu dajeśsia

**Ja pilna saču za tym, što kažuć palityčnyja ahladalniki z BT (choć jon zaraz nazyvajecca «Pieršy», ale «jak tolki ty śviŋniu nia klič, jaje zaŭsiody vydaść łyč»).** Jość voś jakaja cikavostka: zaŭsiody padčas niejkich kanfliktnych sytuacyj na telebačańni pačynajecca «pieratrus» asobaŭ, jakija čymści «nasalili» uładzie. Paśla zakančeńnia vybaraŭ, apoŭnačy, pačaŭsia «pieratrus» Milinkievča. Hazavy kanflikt z Rasiejaj — «pieratrus» rasiejskaha hazavaha i naftavaha kiraŭnictva, ministraŭ. Čaho tolki vartyja roliki pa ANT pra Hiermana Hrefa i inšych čalcoŭ rasiejskaha kabinieta ministraŭ. Dzivu dajeśsia, bačačy j čujučy toje: dzie našy dobryja ŭzajemaadnosiny z «braterskaj» Rasiejaj.

Ščyra vinšuju vas sa 100-hodździem i sardečna žyču vam jašče šmat hod trymacca adnoj z samych aŭtarytetnych hazet niezaležnaj Biełarusi. Niachaj vaša hazeta, jak pachodnia, śviecić našamu narodu ŭ pošukach našaj svabody, našaj lepšaj doli.

**Aleś Šybieka, v.Litusava, Sieńnienski rajon**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

### Сайты ПБНФ і КХП-БНФ

**У №4 «НН» ад 2 лютага на старонцы 26 у рубрыцы, прысьвечанай лістам у Рэдакцыю, падаецца памылковы адрас сайту Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ.** Надрукаваны ў газэце адрас — pbnf.org — ёсьць адрасам іншай партыі: ПБНФ (ст. В.Вячорка). Афіцыйны сайт Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ знаходзіцца ў Інтэрнэце пад адрасам www.pbpf.org.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# У пекле Азіі

Рэпартаж з Аўганістану. Піша **Аляксей Лявончык**.

**Працяг. Пачатак у №4, №5.**

## Травеньскі мяцеж

Травень у Кабуле звычайна вельмі сьпякотны. Уначы спаць проста немагчыма — маскіты, задуха, гукі вясельля з дому насупраць, дзе атайбаваўся спадар Муджададдзі, сьпікер парляманту ды аднойчы — прэзыдэнт Аўганістану. Раней было ціха-мірна — там сядзела простая сьціплая дацкая некамэрцыйная арганізацыя, супрацоўнікі якой штоцацьвер (бо ў ісламскіх краінах пятніца ды зрэдку субота — выходныя дні) ехалі ў «ля Атмасфэру» на вячоркі. Ёсьць у нашай ваколіцы такое культавае месца, куды наведваюцца ўсе замежнікі. Калі сур’ёзна — звычайная, сярэдняга ўзроўню рэстарацыя, але ў ёй ёсьцека басэйн, адзіны ў Кабуле. Толькі вось цэны — не кабульскія, а франкфурцкія. Але зразумела, бо цяжка сядзець кожны дзень у кампаўндзе і нікуды не выходзіць, нават калі табе за гэтае сядзеньне плацяць 5000 даляраў штомесяц. А вось «Атмасфэра» — прыйдзі ды забудзься. Самая прыдатная тэма для гутарак — якія аўганцы тупыя ды лянотныя. Самы прыдатны напой — кактэйль «Беларускі» (ён у арыгінале мае назоў «Белы Расейскі», брыдота такая: малако, гарэлка ды кава плюс нейкі прыкры лікёр), але я згуляў на ўсеагульнай назьве нашае краіны. Самы прыдатны занятак пасьля — сьпяваць песьні на нашай змрочнай Сарак-і-Чоор (чацьвертай вуліцы) на французскай мове. Бо рэстарацыя належыць французам і аднаму аўганцу, які ў свой час адвучыўся ў Гамбургу і дасюль нядрэнна валодае нямецкаю мовай.

Тады мы паехалі ў Пул-і-Чархі. Палігон за горадам, ля пагоркаў, дзе аўганская войска звычайна адпрацоўвае свае стралковыя ўменьні. Усё ішло, як звычайна. За выключэньнем таго, што аўганскі кіроўца не заліў патрэбнае колькасьці бэнзіну, і машына стала. І брытанцы, што правoдзілі трэнінг па бясьпецы ды дзеяньнях у сытуацыях захопу, выбуху прыдарожнае бомбы і гэтак далей, проста ашалелі. Іх ледзьве супакоілі — такое ўражаньне, што яны ня ведалі «абавязковасьці» аўганцаў. І тут па тэлефоне: «Не прыяжджайце, у горадзе мяцеж, паляць крамы». Амэрыканцы да таго часу ўжо зачынілі ўсе выхады з гораду.

У сусьветных навінах то прайшло проста адной стужкаю. Мяцеж. Восем параненых, двое забітых. Толькі адзін замежнік. Спаленыя дзесяць будынкаў, усе належалі міжнародным НКА. Кропка. Да «глябальнага розуму» дадалася прымха: «Якія аўганцы тупы-ы-ы-я-а-а. Ну проста дзікуны». Амэрыканцы як заўжды адседжваліся ў сваім Баграме.

Як насамрэч выглядаў той інцыдэнт, што спрычыніўся да найбуйнейшага мецяжу ў Кабуле зь мінулага году, — ведае толькі камандаваньне войска ЗША. Бо інцыдэнт распачаўся пасьля таго, як амэрыканскі канвой расстраляў з кулямётаў натоўп, які сабраўся вакол амэрыканцаў, як тыя зьбілі машыну з чатырма пасажырамі, двое зь якіх загінулі. Нехта кінуў камень, астатнія падхапілі гэта. А амэрыканцы, замест таго, каб схавацца ў БТРы ды проста праехаць праз натоўп, ня ўзброены на той момант, адразу пачалі страляць. Даю веры. Бо пасьля былі два выпадкі, калі машыны мінакоў занадта блізка набліжаліся да канвояў войска ЗША і тыя, замест таго, каб некалькі разоў пасыгналіць «адыдзіце», адразу пачыналі праверку кулямётаў.

Гаварылі, што тыя амэрыканцы былі п’яныя, што яны танчылі на вежах сваіх БТРаў, што яны былі «задурманеныя». Я б мог даць веры апошняму — бо амэрыканцы часьцяком ад самоты наймаліся мясцовым на перавозку опіюму ды ў якасьці целаахоўнікаў. Зразумела, тое адбывалася без афіцыйнае згоды камандаваньня. Спажываньне опіюму таксама вырасла ў разы, бадай што ў Аўганістане знайсьці яго не складае аніякае праблемы. Але вось п’яныя танцы — то прыдумкі аўганскага сусьветнага розуму. У Кабуле алькаголь маглі бесьперашкодна атрымліваць толькі французы ды немцы...

Факт — тое, што па няўзброеным натоўпе, які відавочна ня мог мець процітанкавых гранатамётаў, быў адкрыты агонь зь вежавых кулямётаў. Таксама факт тое, што пасьля, праз дваццаць хвілін пасьля інцыдэнту, вялізныя групы аўганцаў, узброеных Калашнікавымі і М-16, пачалі рухацца ў цэнтар гораду. Праходзячы, яны палілі ўсё, што выглядала занадта «заходнім» ці належала іншаземцам. Факт таксама і тое, што паліцыянты, якія стаяць на кожным раздарожжы ці скрыжаваньні, ніякім чынам не заміналі ім гэтага рабіць. Шмат проста адыходзіла ды пазірала на тое, як разьюшаны натоўп руйнуе ўсё, а частка далучалася да натоўпу.

Яшчэ факт — тое, што прэзыдэнт Карзай замест таго, каб абвесьціць камэнданцкую гадзіну ды ўвесьці войска ў сталіцу, першыя дзьве гадзіны мармытаў па тэлебачаньні, што ўвесь гэты вэрхал быў зладжаны «ворагамі нацыі». Ці адчуваеце сувязь са стылем Джорджа Буша? І апошні факт — тое, што армія была выкліканая толькі калі мяцежнікі прасунуліся амаль да будынку парляманту на Сарак-і-Дaруламон, што амаль за 15 кілямэтраў ад цэнтру сталіцы. А мяцеж і ўвогуле распачаўся з Кхаір-Хона, што на выселках, ля вайсковага лётнішча. Паводле самых сьціплых падлікаў, адтуль да парляманту каля 25 кілямэтраў. А прэзыдэнт маўчаў.

Толькі пад вечар у горадзе быў наведзены парадак.

А тым часам замежнікам з АКТЭ-Ду, чыя рэзыдэнцыя была заатакаваная, давялося бегчы праз пагорак спачатку на бліжэйшую вайсковую базу аўганскага войска, а потым, калі навіны аб падзеях у горадзе пачалі сягаць і праз муры часткі, далей, хавацца ў дамах аўганскіх супрацоўнікаў.

Будынак «Інтэрньюз» быў абпуляны каменьнем, але нас выратавала тое, што паўсюль стаялі рыштаваньні. Калі натоўп праламаў браму, яны палічылі, што будынак пусты, ды пакінулі двор.

На падыходзе да «Кабул Сіці Сэнтар» быў разгорнуты ўзвод добра ўзброеных прыватных ахоўнікаў. Менавіта яны і абаранілі дом ад разбурэньня, таму што аўганцы ў такіх



**Закалот у Кабуле. Аўганцы паляць амэрыканскі сьцяг.**

выпадках у сваіх вельмі рэдка пуляюць. А вось прыкласьціся некалькі разоў па нырках — калі ласка.

Вынікам таго стала камэнданцкая гадзіна, зачыненыя крамы ды ўзрослы недавер да замежнікаў. Калі раней да АйСАФ ставіліся цярпліва, аддзяляючы іх ад уласна амэрыканскае арміі, то цяпер насіць вайсковую форму ў Кабуле стала і ўвогуле сьмяротна небясьпечна. У жніўні—верасьні не было аніводнага дня, каб нешта ня выбухнула. Звычайна то былі акцыі застрашэньня: нехта падыходзіў з рокет-лончэрам як мага бліжэй, як дзвалялі блёкпасты, і пуляў, куды руля пацэліць. Звычайна ахвярай такога «ініцыятара» станавіўся які самотны хмыз на выселках, але і гэтага хапала, каб настрашыць замежнікаў да страты прытомнасьці. ААН увогуле спыняла працу. Сумна, але «ля Атмасфэра» была напоўненая звыш галавы кожны дзень, хаця яна — зь ейнай прамоцыяй — была вядомая сярод усіх месьцічаў. Таксама таму, што тыя самыя аўганскія месьцічы ведалі, што бяз пашпарту іх туды ня пусьцяць, а алькаголь адліваць ня будуць у любым разе, калі толькі за барнай стойкай ня будзе сумаваць Тама.

Француз-расеец, ён тры гады правучыўся ў Расеі. Расейскай мовы ў яго не дадалося, затое з Расеі ён прывёз той самы непазбыўны «авось», цягу да розьведу новых земляў і адсутнасьць страху да чаго б ні было. Ён хадзіў па вуліцах а трэцяй гадзіне ўначы, вандраваў на ровары ў самоце па гайвэі Кандагар—Кабул у некамэрцыйных арганізацыях, працаваў валянтэрам, а для грошай — бармэнам. Вельмі ў хуткім часе ён стаўся цэнтрам прыцягненьня расейскамоўнае ці калярасейскамоўнае меншасьці ў Кабуле. Французы яго ня вельмі шанавалі — яны не разумелі такіх разхлыбаных паводзінаў. Але аўганцы — вельмі. Бо ён наліваў усім. Хутка ў нашай камандзе апынуўся лібанец — будаўнік, які рабіў тутака бізнэс, некалькі амэрыканцаў, якія ўсё сьвядомае жыцьцё працавалі ў былых рэспубліках Савецкага Саюзу і выдатна валодалі ўзбэцкай ды расейскай мовамі, некалькі аўганцаў, што вучыліся ў Адэсе, і проста натоўп палякаў. Небясьпека зьбліжае. Ніводзін з тых, хто быў тады з намі, ня быў нармальным у разуменьні астатніх. Французы, хоць і вучыліся фарсі і неяк на свой лад любілі гэты народ, і неяк былі больш неаглядныя, усё роўна не разумелі такога: як у камэнданцкую гадзіну можна было пайсьці па цыгарэты а трэцяй гадзіне ўначы. А немцы і ўвогуле ўсе пачалі зьяжджаць, як пачалі рвацца бомбы.

На жнівень ды верасень трапіла сэрыя самазабойчых нападаў, зьдзейсьненых праз маджагедаў з Пакістану. Ракеты таксама сталі падаць больш трапна, адна ледзьве не падарвала гасьцініцу. Але снарад затух, папаўшы ў рухавік генэратару. Пачасьціліся атакі супраць канвояў паліцыі ды ААН. На нашай радзе пастанавілі, што на шашу да Джалалабаду лепей увогуле ня тыркацца.

Ведаеце, калі я пачуў сябе найбольш шчасьлівым? Тады, калі паліцыя спыніла нашу машыну на раздарожжы ўначы ды пратрымала мяне ў пастарунку за гарбатай, пакуль высьвятлялі маю асобу, усю ноч. Звычайна пасьля дзевяці ўвечары паліцыянты, узброеныя «калашамі», спыняюць на ўсіх асноўных скрыжаваньнях усе машыны. Хуткі позірк — буру бахайр[1]! Зрэдку пытаюцца ліцэнзію. Калі яе няма — досыць будзе хабару ў паўдаляра. Вось так тэрарысты заяжджалі ў горад.

Тады я адчуў, што дзьверы нарэшце зачыняюцца. І сапраўды, зь верасьня, за выняткам выпадковых дэтанацыяў ды расстрэлаў амэрыканцамі машын, што занадта наблізіліся, нічога не адбывалася.

Надыходзіла зіма.

**Працяг будзе.**

[1] У добрую дарогу! (пэрс.—аўг.)

**АКТЭД (ACTED)** — Агенцыя па дапамозе тэхнічнаму разьвіцьцю. Яна займаецца рэалізацыяй будаўнічых (масты, камунальныя спаруды) праектаў. Грошы на праекты надыходзяць ад Эўрапейскае Камісіі да Канадзкае агенцыі па міжнародным разьвіцьці.

**«Інтэрньюз» (Internews)** — сусьветная арганізацыя, якая займаецца падтрымкаю (трэнінгі, тэхнічная дапамога) мэдыяў. Грошы на праекты дае USAID Амэрыканскае агенцтва па міжнародным разьвіцьці.

**АйСАФ (ISAF)** — International Stabilization and Assistance Force, асобныя ад антытэрарыстычнае кааліцыі (куды ўваходзяць амэрыканцы ды брытанцы) вайсковыя сілы, якія складаюцца з жаўнераў больш як 20 краінаў, што займаюцца падтрымкаю бясьпекі ды будаўнічымі праектамі ў 25 правінцыях Аўганістану.

**«Кабул Сіці Сэнтар» (Kabul City Center)** — першы ў Кабуле гандлёвы цэнтар, што працуе на заходні капыл (накшталт гіпэрмаркету).

**Кароткі зьмест папярэдніх сэрыяў. Просты хлопец Бульбашэўскі вырашыў стаць беларускім супэрмэнам Бульбmanам. Вандруючы на сваім бульбамабілі, ён спакушаецца на падначваньне малазнаёмага байкера пажартаваць з ДАІшнікаў...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Дзякуй за ахвяраваньні

**Хведару К** з Талачынскага раёну.

**Георгію Ж.** з Воршы.

**Вользе К.** з Гарадзенскага раёну.

**Канстанціну С., Фаіне Г., Васілю К., Яўгену К.** зь Віцебску.

**Тацяне Н.** зь Ліды.

**Андрэю Л.**, Уладзімеру Ш. з Салігорску.

**Іне П.** з Пухавіцкага раёну.

**С.Д.** з Вузды.

**Станіславу Б., Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**А.Р., Л.Г.** з Мастоўскага раёну.

**Т.Б.** з Магілёва.

**Максіму Б., І.У.** з Бабруйску.

**А.К.** з Крупскага раёну.

**Г.К., Артуру І., А.А., Н.К., А.К.. М.Я., М.Я., Г.І., Аляксандру А., Андрэю Ф., Натальлі Б., Канстанціну Ж.** з Горадні.

**М.К., Ірыне М.** з Жыткавіцкага раёну.

**Дар'і Л.** з Смургонскага раёну.

**Антону П.**, Аляксандру Ш. з Жодзіна.

**Канстанціну П., Сяргею Б., Сяргею П., Валянціне З., Зьмітру Ж.** з Гомеля.

**Валеру П., А.М., А.А., Анжэле Б., Руслану Г., Віктару М.** з Баранавічаў.

**Зьмітру Ш., Алесю П.** з Наваполацку.

**Андрэю А., Н.** зь Менскага раёну.

**Уладзімеру В.** з Кобрынскага раёну.

**А.К., Ірыне В., Мікалаю Б.** зь Берасьця.

**Тадэвушу Ш., Сьвятлане Ц., І.М.** з Маладэчна.

**І.Б., С.Р., Т.Ш.** зь Бярозаўскага раёну.

**А.Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**В.Ш.** з Круглянскага раёну.

**Сяргею Ц., А.Б.** з Ваўкавыскага раёну.

**Аляксандру Ш.** з Аршанскага раёну.

**Юр'ю С., В.Я., І.Б., А.Л., В.М., Тацяне Я., Ігару П., Марыі Л., Мікалаю П., Валер'ю К., Натальлі Д., Людміле Ж., Аляксандру Я., А.Н., Анатолю В., Аляксандры В., Ірыне М., Віталю К., Алене С., Сьвятлане К., Д.К., Дыяне Ф., Тацяне Р., В.Л., Ю.В., Леаніду Л., Валерыі Х., Марыі Б., Міхаілу К., О.Т., Зьмітру К., Валянціне Ш., Алене С., Д.Т., С.М., Ірыне С., Міхаілу З., Раману М., Д.М., Ю.Б., Аўгену Ш., Віктару П., М.Г., Ларысе С., Пятру К., Уладзімеру П., Д.К., Вользе Б., Уладзімеру П., Аляксею Ш., Сяргею Б., І.Л., В.Х., Аляксею Ш., Паўлу Ф., Алене К., Л.Ф., Валянціне П., Н.Х., М.К., Але Г., Сьвятлане В., А.С., Віктару К., У.Л., І.Г., Я.М., ГенадзюП., А.Ц., Д.Ш., А.Ш., Сьвятлане Г., Генадзю Я., Тарэсе Р., Веньяміну Г., В.Д., Віталю С., Віталю С., Маўлюдзе Л., Н.Б., Валянціне Ш., З.К., А.Г., Сяргею Ш., Д.Л., Андрэю В., Віктару Д., Аляксандру Д., Марыі Н., Натальлі А., Аляксандру Ш., І.В.** зь Менску.

**Сяргею Г.** зь Вялейскага раёну.

**Д.** зь Мядзельскага раёну.

**Вользе Б.** са Столінскага раёну.

**М.Б.** з Полацкага раёну.

**Юліі Е.** з Наваградзкага раёну.

**Мікалаю Ж., Аляксандру С.** з Мазыра.

**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.

**А.Р.** з Наваполацку.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

# Цяжар спадчыны

Пра «Энцыкляпэдыю Вялікага Княства Літоўскага» піша **Алег Дзярновіч**.

Ці выпадковасьць гэта, што сынтэтычныя працы па гісторыі ВКЛ выклікаюць жывы розгалас ды палкія дыскусіі? Гістарычная спадчына можа ня толькі ўзбагачаць, але і цiснуць, накладаць абавязкі, спараджаць супярэчнасьці. Так і гісторыя Вялікага Княства Літоўскага — дзяржавы, якая мела вельмі мала шанцаў на ўзьнікненьне, — працягвае заставацца полем для дыскусіі паміж інтэлектуаламі некалькіх краін.

Літоўскія гісторыкі твораць новую балцкую легенду, міт пра Палямона ажывае на старонках іхніх кніг. Апрычонасьць гісторыі балтаў, пэўны ізаляцыянізм — вось маркёры літоўскай гістарычнай канцэпцыі. Беларусь жа нараджае вельмі кантрасныя падыходы да гісторыі ВКЛ. З аднаго боку, тут узьнікла такая знакамітая інтэлектуальная правакацыя, як канцэпцыя Міколы Ермаловіча, якая практычна мінімізуе ўдзел саміх балтаў у працэсе ўтварэньня ВКЛ. Затое Ермаловіч абудзіў у беларускім грамадстве цікавасьць да гісторыі Вялікага Княства ды прымусіў гісторыкаў завострываць аргумэнты. Але адначасова Беларусь захавала і разьвіла кансэрватыўную энцыкляпэдычную традыцыю. Далёка ня ўсе постсавецкія краіны здолелі ўтрымаць энцыкляпэдыі як інстытуцыі — з кваліфікаваным штатам, уласным архівам, даўняй гандлёвай маркай.

Выхад у сьвет у 2005 г. першага тому «Энцыкляпэдыі Вялікага Княства Літоўскага» стаў сапраўднай сэнсацыяй. Так, былі ацэненыя ў Беларусі і па-за ейнымі межамі сам факт выданьня, ягоная канцэпцыя, вобразнае вырашэньне кнігі. І хоць замежныя гісторыкі раней маглі нешта чуць пра гэты маштабны праект, але заяўкі і амбіцыі рэдакцыі ды аўтараў, што ўвасобіліся ў апублікаваным томе, аказаліся значна мацнейшымі, чым можна было лічыць на адлегласьці.

На працягу ўсяго 2006 г. лёгкае хваляваньне ахоплівала публіку — цыркулявалі няясныя чуткі, зрэшты, не пацьверджаныя ў далейшым, пра спыненьне праекту. Гучалі таксама цьвярозыя галасы — калі выйшаў першы том, то мусіць зьявіцца і другі. Цяпер жа, на пачатку 2007 г., трымаючы ў руках заключную частку «Энцыкляпэдыі ВКЛ», мы можам казаць і пра сам том, і пра ўсё выданьне, і пра ягоны грамадзкі кантэкст.

Ёсьць вонкавая супярэчнасьць у падрыхтоўцы падобнага выданьня ў сучаснай Беларусі ды дзяржаўнай яго падтрымкі фінансамі. Ужо створаная асобная каста гісторыкаў, якія на тле сьціплых акадэмічных бюджэтаў атрымліваюць немалыя грошы за распрацоўку дзяржаўнай ідэалёгіі, якой удаецца хутка састарэць; новай непрыхільнасьцю насычаецца адроджаны заходнерусізм. А тут з тэрыторыі насьцярожанага замоўчваньня выцягваюцца цэлыя пяць стагоддзяў, і невядома яшчэ, куды могуць прывесьці гэтыя разгляданьні колераў старажытных гербоў і подпісаў на мапах. Хоць «Пагоня» як герб дзяржавы, пра якую распавядаецца ў выданьні, так і ня трапіла на вокладку «Энцыкляпэдыі ВКЛ». Прыйшлося вынаходзіць іншы сымбалічны эквівалент сымболіцы дзяржаўнасьці — гаспадарскія (вялікакняскія) рэзыдэнцыі. У першым томе гэта Віленскі замак, а ў другім — Каралеўскі палац у Горадні («Новы замак»).

Як кніга, якая распачынае выданьне, першы том складаецца зь дзьвюх частак — уводных аглядных артыкулаў і ўласна слоўнікава-даведачнага блёку. Гэтыя апошні прыблізна на палову ўтвораны артыкуламі, якія перайшлі з шасьцітамовай «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі», другая ж палова артыкулаў была напісаная адмыслова для «Энцыкляпэдыі ВКЛ». Увогуле такая прапорцыя адпавядае крытэрам навізны даведачнага выданьня. Але найбольш арыгінальнымі аказваюцца часам менавіта гэтыя новыя артыкулы, бо яны асьвятляюць тэмы, што маглі трапіць у «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» толькі ў вельмі абмежаваным выглядзе ці як ускосная інфармацыя (што датычыць этнічнай Літвы, а таксама Ўкраіны і Інфлянтаў). Па-сапраўднаму ў «Энцыкляпэдыі ВКЛ» загучала тэма Вільні. Прынамсі, у беларускіх наведвальнікаў цяпер ёсьць шанец, трымаючы ў руках кніжку, ідэнтыфікаваць усе найбольш значныя аб’екты старадаўняй сталіцы.

Другі том рабіўся непараўнальна пасьпешлівей за першы. Збор тэкстаў мусіў завершыцца толькі ў канцы 2006 г., але здача тому ў друк адбылася ўжо ў жніўні. У выніку многія (запланаваныя) новыя артыкулы не былі дапісаныя і ня трапілі ў выданьне. Асаблівыя страты «панесла» замежная палітыка ВКЛ (у другі том не ўвайшлі, напрыклад, артыкулы пра суседнюю Прусію ці важнага партнэра ВКЛ Сьвятую Рымскую імпэрыю). Многія вядомыя замежныя дасьледчыкі гісторыі ВКЛ таксама апынуліся па-за «Энцыкляпэдыяй ВКЛ» (Горст Ябланоўскі, Тэадор Шыман, Курт Фарстройтэр ды інш.). Дадамо сюды перакадаваньне некаторых літоўскіх і польскіх літараў у бібліяграфіі, чаго амаль не было ў першым томе, — якасьць карэктарскай працы таксама панізілася.

Чым гэта патлумачыць? Напэўна, у кіраўніцтва выдавецтва былі свае матывы — агульная атмасфэра вакол выдавецтва праз перасяленьне не




**Вялікае княства Літоўскае: Энцыкляпэдыя.** У 2 т. Т. 1: Абаленскі — Кадэнцыя / Рэдкал.: Г.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Герасімовіч. — Мн.: БелЭн, 2005. — 688 с., іл.

Т. 2: Кадэцкі корпус — Яцкевіч / Рэдкал.: Г.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Герасімовіч. — Мн.: БелЭн, 2006. — 792 с., іл.




была спрыяльнай. Першапачаткова «Беларускую Энцыкляпэдыю» плянавалі выселіць на гарадзкую ўскраіну — недзе на вуліцу Сьцебянёва. Фактычна гэта азначала б маргіналізацыю выдавецтва ў беларускім культурным кантэксьце. Тым больш, прыгадваючы статус выдавецтва ў нацыянальнай культуры на працягу 1960—1990-х г. Урэшце самыя брутальныя прагнозы ня спраўдзіліся, «Беларускую Энцыкляпэдыю» перавялі на завулак Калініна, што побач з цэнтрам — ня так далёка ад найважнейшых бібліятэк і акадэмічных інстытутаў. Такім чынам, «Беларуская Энцыкляпэдыя» можа працягваць сваю дзейнасьць ня толькі як тэхнічная структура, але і як творчая ўстанова. Тым ня менш, званок празьвінеў — у сёньняшніх рэаліях арганізацыйныя праблемы моцна ўплываюць на якасьць працы выдавецтва. Сыгналам таксама стала зьмена рэдакцыйнай калегіі тому. «Пасьпешлівасьць» выявілася і ў прыцягненьні заўважнай колькасьці старых артыкулаў — з ранейшых выданьняў выдавецтва. Такія артыкулы фігуруюць у «Энцыкляпэдыі ВКЛ» бяз аўтарства.

Вось жа, было б зусім несправядліва ў сваіх ацэнках выданьня спыніцца на гэтым. Бо ў сапраўднасьці, паводле замовы Валер’я Пазьнякова, які стаяў ля вытокаў ідэі выданьня, адмыслова для «Энцыкляпэдыі ВКЛ» была напісаная значная колькасьць зусім новых артыкулаў.

Але ў самой ідэі выданьня закладзеныя некаторыя прынцыпы, якія дазваляюць казаць пра запачаткаваньне новай традыцыі наратыву гісторыі Вялікага Княства. Менавіта ў «Энцыкляпэдыі ВКЛ» створаная нечуваная для падобных выданьняў панарамнасьць — укладальнікі імкнуліся, і ў значнай ступені яны гэта здолелі, рэпрэзэнтаваць ня толькі абшары сёньняшняе Беларусі, але і Літвы, Украіны, Польшчы (Падляшша), Расеі (Смаленшчына), Латвіі ды Эстоніі (Інфлянты), на землях якіх цалкам ці часткова пашыралася дзяржаўная тэрыторыя ВКЛ. Нарэшце зазначанае месца Ўкраіны зь яе культурнымі і дэмаграфічнымі імпульсамі ў гісторыі ВКЛ. У дачыненьні да Літвы «Энцыкляпэдыя ВКЛ» вельмі прыязная. Найбольш поўнай выглядае для падобных выданьняў і бібліяграфія — звычайна на ёй заўжды эканомяць.

Цяпер трэба разабрацца, якая канцэпцыя была рэалізаваная стваральнікамі ў «Энцыкляпэдыі...» — а гэта ўласна канцэпцыя дзяржаўнасьці. Так, не этнічная прырода, не што-

**Працяг на старонцы 32.**

# Мэтад выхаваньня цёмнага народу

Горадня на старонках «Нашай Нівы». Піша **Алесь Смалянчук**.

«Наша Ніва» была другой пасьля «Нашай Долі» легальнай беларускай газэтай на пачатку XX ст. У адрозьненьне ад сваёй папярэдніцы, якая больш нагадвала рэвалюцыйную праклямацыю, «Наша Ніва» была больш традыцыйнай газэтай, называла сябе газэтай «усіх беларусоў і ўсіх тых, хто ім спагадае».

Першая згадка Горадні ў аналітычных матэрыялах «Нашай Нівы» была зьвязаная з выбарамі ў II Думу. Адразу пасьля выбараў у Горадні газэта паведаміла пра адміністрацыйнае ўмяшальніцтва ў іх ходу, што і перадвызначыла перамогу «правых». Газэта распавяла пра адмысловую абедню, якую праводзіў архіярэй для сялянскіх дэпутатаў на губэрнскі выбарчы сход. Архіярэй скончыў абедню чарнасоценнай прамовай, у якой «лаяў жыдоў апошнімі словамі» і пераконваў, што памешчыкі — гэта найлепшыя сябры мужыкоў. Пасьля гэтага сялянскіх дэпутатаў разьмясьцілі ў Народным доме пад аховай паліцыі, каб ізаляваць ад гарадзкіх выбаршчыкаў (тых самых «жыдоў»), зь якімі яны раней уклалі пагадненьне. Пасьля выбараў гарадзкія выбаршчыкі падалі скаргу, якую падтрымалі некаторыя сялянскія дэпутаты. Яны прасілі скасаваць вынікі выбараў, заяўляючы, што былі «адурманеныя духоўнымі асобамі» (1907. №2, №8.).

На выбарах у III Дзяржаўную Думу, якія адбыліся ў Горадні ў кастрычніку 1907 г., таксама перамаглі чарнасоценныя кандыдаты. Паводле «Нашай Нівы», гэтая перамога была абумоўленая актыўнасьцю Сафійскага праваслаўнага брацтва і пагадненьнем паміж «исьцінна-рускімі» і «исьцінна-польскімі» чарнасоценцамі. Супрацьстаяў гэтаму саюзу лібэральна-дэмакратычны Прагрэсіўны блёк, пазыцыю якога падзяляла таксама «Наша Ніва».

Уласна беларускае культурнае жыцьцё ў Горадні актывізавалася пазьней. У сакавіку 1910 г. нехта *Паўлюк* (Павал Аляксюк?) паведаміў пра беларускую вечарыну, якая, зь ягоных словаў, «вельмі добра ўдалася». Гэтае паведамленьне датычыла першай вечарыны, арганізаванай Гуртком беларускай моладзі, да якога належала Людвіка Сівіцкая, больш вядомая як *Зоська Верас*. *Паўлюк* заўважыў, што Горадня — горад беларускі, але «дагэтуль аб беларусах нешта мала было чутно, і толькі цяпер пачалі яны тут будзіцца. Спачатку, праўда, ішло туга, але пасьля што раз болей і болей пачалі цікавіцца беларускім адраджэньнем, і вось цяпер ужо маем нямала беларусоў, каторые душой і сэрцам прыналежаць да сваёй бацькоўшчыны… Найбольш нас цешыць і тое, што і нашы браты-славяне — расейцы і палякі — спагадаюць нам тутака, а найболей то цешацца літвіны, што беларускі народ, каторага сілы яшчэ ня выкарыстаны, а нават і не пачынаны, — прачнуўся» (1910. №13).

Пазьней праблему беларускай культуры неаднаразова ўздымаў дзяяч беларускага руху, гарадзенец Павал Аляксюк. Праўда, ягоныя «беларускія замалёўкі» датычылі больш ваколіцаў Горадні. Вось фрагмэнт мінірэпартажу з Эйсмантаў:

«Шляхта тутэйшай аколіцы, відаць, забылася ўжо сваёй прадзядоўскай мовы; а мо і ня ведае гэты цёмны народ, што даўней іх бацькі і дзяды ўжывалі толькі родную беларускую мову… Не забыліся за тое тутэйшыя людзі іншых старасьвецкіх звычаёў: у аколіцы, хоць яна і не вялікая, ёсьць ажно тры карчмы, і як надойдзе сьвята, шляхта наша цягне туды, як жураўлі ўвосень, і там за кварту гарэлкі можна купіць чалавека, як кажуць, з патрахамі… Ня дзіва, што тут беднасьць расьселася як у сваёй хаце, бо а прасьвеце столькі ведаюць, колькі а жалезным ваўку» (1910. №15).

Цалкам іншую карціну ён назіраў у м.Сідра:

«Ці то каталік, ці праваслаўны — кожны зь іх прызнае сябе цяпер толькі беларусам, і кожны зь іх горнецца да беларускай кніжкі, да роднай сваёй мовы. Вельмі любяць яны чытаць «Нашу Ніву», асабліва казкі і розныя апавяданьня… Кепска толькі, што школ яшчэ ў нас нехват для ўсіх тых, каторыя хацелі б там вучыцца. Кепска і тое, што ў мястэчку ёсьць карчма, і стаіць яна — скуль бы ні ехаў — якраз на самай дарозе, — вось і трудна зь ёй разьмінуцца…» (1910. №15).

Паводле інфармацыі таго самага карэспандэнта, «Нашу Ніву» і беларускія кнігі ў Горадні можна было набыць у кнігарнях Заморскай, Любіча і Тракеніцкай. Апроч таго, газэты прадаваў яшчэ хлопчык-газэтчык (1910. №25). (У гэтым месцы немагчыма ўстрымацца ад заўвагі, што сёньня ў Горадні набыць «Нашу Ніву» значна цяжэй).

У траўні 1910 г. П.Аляксюк паведаміў, што ў Гарадзенскі Акруговы суд перададзены тастамэнт Элізы Ажэшкі. Усе грошы і дом яна адпісала сваёй сяброўцы, не забылася і пра старых слуг (1910. №22).

Сьмерць Э.Ажэшкі была падзеяй, якая моцна ўсхвалявала гараджанаў. «Наша Ніва» адрэагавала на сьмерць пісьменьніцы артыкулам «Эліза Ажэшка», падпісаным *В.Л.* (Вацлаў Ластоўскі?). Аўтар адзначаў, што сьмерць Э.Ажэшкі, якая «старалася шырыць агульналюдзкія ідэалы, міласьць да чалавека», ёсьць стратай ня толькі для Польшчы і польскага народу, але для ўсяго культурнага сьвету. Паводле *В.Л.*:

«Большая частка твораў Элізы Ажэшкі, як і сама душа пісьменьніцы, неразрыўна зьвязана з беларускай глебай… Праўдзівай бацькаўшчынай Ажэшкавай была Беларуская зямля, каторая яе ўзгадавала; з Польшчай — апрача мовы і гістарычных перажыткаў — вялікая пісьменьніца мела мала супольнага. І ўсё ж такі беларуская фантазія, беларуская казка, што рожавай дымкай апавівала яе дзіцячыя думкі, ускалыхала вялікага духу пакойнай на славу чужым. Такая ўжо, відаць, доля нашага краю…» (1910. №20).

У лістападзе 1910 г. Гарадзкая дума пастанавіла ўшанаваць памяць пісьменьніцы. Дзеля гэтага было прынятае рашэньне «1) назваць Пяскову вуліцу, на каторай жыла нябожчыца, яе іменем; 2) плаціць з гарадзкіх грошай за навуку пяці бедных вучанікоў; 3) даваць кожны год 100 рублёў на кожны з 4 прытулкаў для дзяцей у Гродні і 4) павесіць партрэт Э.Ажэшка ў залі засяданьняў гарадзкой думы» (1910. №46).

Карэспандэнцыі Паўла Аляксюка пачалі зьяўляцца на старонках газэт з кастрычніка 1909 г. Спачатку гэта былі кароткія паведамленьні пра падзеі з



АРХІЎ УЛАДЗІМЕРА СОДАЛЯ

жыцьця Горадні, якія зьмяшчаліся ў рубрыцы «Зь Беларусі і Літвы». Пазьней рэдакцыя пачала вылучаць іх асобна, і зьявілася рубрыка «З Гродны». Паведамленьні П.Аляксюка стваралі даволі цікавы вобраз штодзённага жыцьця гораду. Да найбольш характэрных сюжэтаў належалі праблема гігіены, асьвятленьня вуліц, крымінальныя здарэньні, гаспадарка і адукацыя:

**Кастрычнік 1909 г.:** У горадзе халера, якой доўга не было. За тры тыдні памерла 30 чалавек…

**Лістапад 1909 г.:** На адной вуліцы шмат ліхтароў, а на іншых няма. Па некаторых завулках боязна хадзіць уначы, а яшчэ і злодзеі цягаюцца...

Цяпер набіраюць навабранцаў у войска. На вуліцы лепш не выходзіць: «Сядзі дома і не вытыкай носа».

**Сьнежань 1909 г.:** Судовая палата разглядала справу адваката Гілерсана, які на беластоцкім працэсе аб пагроме казаў антыўрадавую прамову. «Шмат сабралося на гэта дзела адвакатаў з усёй Расеі, каб бараніць свайго таварыша». Аднак Судовая палата засудзіла яго на год у крэпасьць.

**Люты 1910 г.:** У нашым горадзе ёсьць такія падворкі, што як залезеш туды, то і ног з балота не выцягнеш: хоць па «скорую помач» пасылай. Ёсьць і іншыя парадкі: на Саборнай, напрыклад, столькі таўчэцца народу, ня маючы, відаць, нічога лепшага для работы, што калі патрэба здарыцца прайсьці, то і людзям і сабе паадбіваеш бакі. (Інфармацыю папярэджваў загаловак: «У нашым Гродне ўсё модне»).

Фабрык у Горадні мала. Адна вялікая — тытунёвая І.Шарашэўскага. Нядаўна ён звольніў 100 непатрэбных работнікаў, выплаціўшы ім 2 тыс.руб. Тыя за гэтыя грошы заснавалі ручную фабрыку тытуню. Тавар пайшоў добра. Шарашэўскі нават зьнізіў цэны...

Тутэйшы гандаль, апроч некалькіх багацейшых і 2 — 3 гуртовых крамаў, у руках жыдоў...

Пэдагагічнае таварыства часта праводзіць публічныя лекцыі. Плата невялікая, а карысьць вялізарная. Найбольш прыходзіць жыдоў, а наш брат «усё ззаду на хвасьце»...

Да леташняга году горад быў падзелены Нёманам на дзьве часткі. Багацейшыя трымаліся аднаго берагу, а бедакі, шукаючы таннае жыльлё, перабіраліся на другі бераг. Летась збудавалі мост, і цэны выраўняліся: «І тут, і там дзяруць добра!» Пайшлі скаргі на домаўладальнікаў. Гарадзкая дума прызначыла камісію, каб спыніць рост цэнаў.

**Травень 1910 г.:** Непарадак у Гарадзенскай публічнай бібліятэцы: кнігі выдаюцца неакуратна, а многія згінулі...

Па горадзе цягаюцца кітайцы, якія выдаюць сябе за дактароў ад усіх хваробаў. Зайшлі да адной жанчыны, тая напалохалася (у жыцьці ня бачыла!), выбіла шыбу і пачала крычаць. Думала, што гэта чэрці прыйшлі па яе душу.

**Чэрвень 1910 г.**: Праблема п’янства хвалявала ня толькі П.Алексюка. У студзені 1909 г. у невялікай нататцы *Нето* «Ў гарадзенскіх дэпутатаў», дзе аўтар распавядаў пра сваю сустрэчу з дэпутатамі Дзяржаўнай Думы, ён працытаваў прызнаньне аднаго зь іх: «…Па вёсках у нас пайшло такое п’янства, што, здаецца, ніколі так не пілі. Проста здурэлі людзі з нуды і бяды…» (1909. №1).

У крымінальнай хроніцы таксама неаднаразова фігуравала п’янства. У прыватнасьці, у сакавіку 1910 г. п’яны салдат удзень у цэнтры гораду сьмяротна параніў нажом палкоўніка Нікіціна. Вайсковы Акруговы суд прысудзіў забойцу да сьмяротнага пакараньня (1910. №14). А вось паведамленьне Гарадзкой управы пра ўвядзеньне новых правіл для лодачнікаў-перавозчыкаў успрымаецца кур’ёзна, бо правілам №1 было патрабаваньне цьвярозасьці (1910. №22).

Карэспандэнты газэт зьвярталі ўвагу на дзейнасьць Хаўрусу рабочых Горадні, які ўзьнік увесну 1910 г. Рабочыя сабралі пэўны капітал, «паадкрывалі пасьля свае крамы, пякарні; маюць цяпер ужо свайго доктара, сваю аптэку, кнігарню і іншыя карысныя рэчы; даюць падмогу грашмі бяднейшым таварышам і гэтакім парадкам шмат дабра і карысьці робяць для сваіх братоў-працоўнікоў» (1910. №16 — 17). Летам 1910 г. Таварыства ўжо плянавала адчыніць некалькі крамаў, але сустрэла супраціў жыдоў, якія пагражалі зьбіць цэны. Рабочыя вырашылі адказаць байкотам жыдоўскіх гуртоўняў (1910. №27).

Невядомы гарадзенскі карэспандэнт «Нашай Нівы», які падпісаўся літарай *Х*, вельмі пазытыўна ацаніў «маёўку» гарадзенскай моладзі, якая прыцягнула шмат людзей, стварыла сьвяточны настрой і зьяднала гарадзенцаў у адну грамаду. На думку гэтага карэспандэнта, бядой Горадні была акурат разьяднанасьць людзей, якая «дрэнна адбівалася на грамадзкім жыцьці».

Матэрыялы «Нашай Нівы» дазваляюць уявіць штодзённае жыцьцё гораду на пачатку XX ст. Відавочна, што тагачасныя праблемы Горадні былі характэрныя для большасьці беларускіх гарадоў.

Адначасна чытаньне «Нашай Нівы» стогадовай даўніны выклікала сумныя думкі пра тое, што многія тагачасныя праблемы захавалі сваю актуальнасьць. Гэта разьяднанасьць гарадзенцаў, якая абарочваецца пасіўнасьцю ў грамадзкім жыцьці, гэта п’янства, якое выразна памаладзела і пашырылася на жаночы род, гэта, нарэшце, зьняважлівае стаўленьне большасьці мясцовага чыноўніцтва і «интеллигенции» да беларускай культуры. Шмат якія аналітычныя артыкулы «Нашай Нівы» 1906 — 1910 г., прысьвечаныя нацыянальна-культурным аспэктам беларускага руху, успрымаюцца нібыта напісаныя сучаснымі аўтарамі.

*Горадня*

# Аб свабодах

Актуальны артыкул Антона Луцкевіча.

## І праз сто гадоў тыя самыя праблемы

Увазе чытачоў «Нашае Нівы» прапануецца артыкул Антона Луцкевіча «Аб свабодах».

Артыкул гэты быў упершыню надрукаваны ў «старой» «Нашай Ніве» 100 гадоў таму: 25 студзеня (7 лютага) і 2(15) лютага 1907 г. Заставалася чатыры месяцы да трэцячэрвеньскага перавароту, да разгону ІІ Дзяржаўнае Думы і скасаваньня больш-менш прагрэсіўнага выбарчага закону, адваяванага ў царскага рэжыму на барыкадах 1905 г. 3 чэрвеня 1907 г. у гісторыі Расеі і Беларусі пачалася цэлая паласа, якую назвалі пэрыядам рэакцыі. Атрыбутамі гэтага пэрыяду былі ваенна-палявыя суды, сталыпінскія вагоны і сталыпінскія гальштукі (так называлі вяроўкі на шыбеніцах).

Зрэшты, і да трэцячэрвеньскага перавароту Беларусь жыла ў становішчы то ўзмоцненай, то надзвычайнай аховы, а сам Антон Луцкевіч і ягоны брат Іван вялі нялёгкае жыцьцё рэвалюцыянэраў-падпольшчыкаў. І ўжо каму-каму, а ім добра было вядома, што такое пашпартны рэжым, налёты паліцыі і жандараў, перетрусы, безабароннасьць нават адукаванага чалавека, нават шляхціца перад дзяржаўнай рэпрэсіўнай машынай... Ім аж надта добра было вядома, што такое адсутнасьць свабоды слова і друку, што такое цэнзура (яна канфіскавала ўсе нумары «Нашае Долі», апрача першага), што такое адсутнасьць свабоды сходаў і саюзаў...

Няма сумневаў, што кожны, чытаючы артыкул «Аб свабодах», міжволі будзе параўноўваць сытуацыю пачатку XX і пачатку XXI стагодзьдзяў, задаваць сабе пытаньне: а што ж памянялася да лепшага ў нашай краіне? Ці маюць беларусы тыя правы і свабоды, пра якія Антон Луцкевіч пісаў 100 гадоў таму? Няма сумневаў і наконт высноваў, якія зробіць кожны чытач.

**Анатоль Сідарэвіч**

Усе людзі родзяцца роўныя, толькі ня ўсіх чакае адзінакая доля. Адны зь іх трымаюць уласьць над народам, ім жывецца добра. Але тым, хто пад гэту ўласьць пападае, — дрэнна прыходзіцца. Што гэта несправядліва — кожны ведае; толькі ня кожны добра разумее, як зрабіць, каб бяду паправіць.

А трэба ведаць, што ва ўсіх краёх, дзе сам народ піша законы, ён ужо дабіўся роўнасьці: там ёсьць такія парадкі, што забясьпечваюць роўнасьць усіх людзей прад законам (за роўнасьць у багацтве доўга яшчэ, мусіць, будзе ісьці вайна на сьвеце!). Нашы дэпутаты павінны дабіцца такіх самых парадкаў, павінны ўцьвярдзіць вось які закон: усе людзі ў гасударстве, ня гледзячы, якой яны народнасьці і якой веры, мужчыны і кабеты — усе роўныя прад судом і законам. Усе — багатыя і бедныя, чыноўнікі і іншыя людзі — роўна атвячаюць прад тым самым судом і роўна церпяць кару за свае праступкі. Разьдзел на мужыкоў, дваран (шляхту) і т.д. і ўсялякія агранічэньні якой-колечы адной часьці народу — адмяняюцца на заўсягды.

Калі людзі ўсе роўныя, то яны мусяць быць і свабодныя: ніхто — ніякія чыноўнікі ды «апекуны» народныя не павінны панаваць над народам і кіраваць ім проціў яго волі, бо яны такія ж людзі, як усе, і, як усе, павінны слухаць і спаўняць прыказы народу. Дзе толькі народ сам упраўляе сабою, там кожны чалавек мае роўныя з другімі правы, устаноўленыя народнымі выбарнымі. Гэтыя правы можа адабраць толькі суд, і то суд прысяжных, выбраных *усім* народам. Каб жа асудзіць чалавека, трэба даказаць, што ён праступіў закон, напісаны *народам.*

Ва многіх краёх свабодныя парадкі пасталі ўжо даўно, хоць і доўга прыйшлося народу за іх ваяваць. У Англіі, прымерам, гадоў 700 таму назад быў кароль Іаан Безьзямельны, дык ён надта ўпадабаў садзіць няўгодных яму людзей у турму, адбіраць ад іх усё дабро ды гнаці ў высылку без усялякага суда. Тады падняўся народ і прымусіў караля падпісаць маніфэст, дзе кароль абяцаўся нікога ні арыштаваць, ні грабіць, ні высылаць, пакуль суд гэтага не пастановіць, згодна з законамі, напісанымі народам. Куды пазьней дабіўся народ англіцкі вось якога закону: арыштованых людзей доўга марыць у турме (як у нас) няможна; арыштаваць можна толькі па прыказу суда, а ніколі не па прыказу жандараў, паліцыі і т.д.; не пазьней як праз 24 гадзіны пасьля арышту абвіняемага павінны прывесьці на сьледзтва, дзе яму скажуць, за што арыштавалі; калі прызнаюць, што няможна яму даказаць праступка, то яго пушчаюць на свабоду. Дзеля гэтага закону няможна, хоць бы і хацеў, доўга гнаіць чалавека ў турме, як гэта робіцца ў нас: іначай народ заступіцца за арыштованага.

З усяго гэтага народу было бы мала карысьці, каб ня той закон, каторага дабіўся народ гадоў 10 пазьней. Вось гэты закон: *пісаць усе законы і назначаць новыя падаткі мае права толькі сам народ; кароль гэтага права ня мае.* Бяз гэтага кароль мог бы ўсе тыя законы, што дабыты народам, адмяніць саўсім, і нічога яму ня зробіш. Але цяпер ужо таго быць ня можа. Толькі раз адзін кароль хацеў назначыць новы падатак без сагласу народу. Народ пастанавіў грошай не плаціць. Пачалася вайна між каралём і народам, і народ звяяваў караля[1]. З тае пары настала ў Англіі праўдзівая свабода. Народ дабіўся яшчэ шмат чаго: свабоды сумленьня (веры), слова, друку, сходаў, таварыстваў і саюзаў, забастовак. Аб гэтых свабодах пагаворым другім разам, цяпер скажам толькі, што ў Англіі асоба і кватэра кожнага чалавека — рэч сьвятая: без пастанаўленьня суда прысяжных ня можна нікога арыштаваць, ня можа паліцыя ўхадзіць да чужой кватэры, рабіць вобыск, забіраць паперы, лісты, пісулькі, фатаграфіі, — як робіць наша паліцыя.

Гаварыць доўга аб тым, што робіцца ў нашым краі, у якой паняверцы трымаюць народ наш розныя «ўласьці», як бясчэсьцяць усіх жандармы і паліцэйскія — ня варта: кожны аб гэтым чуў, а надта многа людзей і цярпела гэта ад «начальства». Яшчэ горш прыходзіцца народу, як аб'яўляецца ў нас «ахрана» ды «ваеннае палажэньне»[2]: тады кожны ўраднік ды стражнік, акалотачны ды гарадавы, нягледзячы ні на якія законы, робяць, што хочуць, — законы ўжо ня маюць сілы, мае яе толькі воля начальства. Арыштуюць

людзей па даносу і брахні платнага слугі паліцэйскага, робяць вобыскі ўсюды — у хатах і на вуліцы, высылаюць шмат людзей без суда ў далёкую ды халодную Сібір. Каб гэта зрабілася ў Англіі, то было бы процізаконна; у нас — не: так начальства пастанавіла!

Усюды, гдзе ёсьць народнае ўпраўленьне і свабода, кожны чалавек мае можнасьць свабодна езьдзіць з аднаго месца на другое. У Расеі цяпер гэта трудна: для гэтага трэба мець *пашпарт.* Бяз паспарту цябе ня пусьцяць жыць у кватэры чы ў якім заезьдзе, не дадуць работы, ды яшчэ ў турму пападзеш. А каб выехаць за граніцу, то трэба мець другі паспарт, а дастаць яго і трудна, і дорага каштуе. Адным словам — бяз паспарту чалавек прападае. Здавалася бы, што калі ў нас такі парадак з паспартамі, то лёгка лавіць злодзеяў ды іншых праступнікаў закону, — ажно не: у Англіі, дзе паспартоў няма, куды менш злыдняў уцякае ад суда, як у Расеі. З гэтага ясна відаць, што гэтыя паспарты шкодзяць ня злодзеям, а ўсім спакойным і справядлівым людзям.

Каб палажыць канец бясправую і няволі кожнага чалавека, трэба дабіцца такіх законаў: 1) каб асоба кожнага чалавека была свабодна, і каб арыштаваць яго можна было толькі па прыказу суда; 2) каб сьледзтва было не пазьней, як праз 24 гадзіны пасьля арышту, а калі ня будзе відна, што чалавек вінаваты, каб яго зараз жа выпушчалі на свабоду; 3) каб паліцыя без прыказу суда ня мела права рабіць у кватэры каго-колечы вобыск або чытаць лісты чужыя; 4) каб паспарты былі адменены, і каб кожны чалавек меў права свабодна езьдзіць і жыць, дзе захоча.

Гэтымі законамі можна даць бесьпячэнства асобы і хаты кожнага чалавека. Але гэта яшчэ ня ўся свабода.

Ва ўсіх *свабодных* краёх, дзе народ сам устанаўляе сабе законы, кожны чалавек мае поўную *свабоду сумленьня.* Кожны чалавек можа верыць, як хоча, і за веру караць яго або прыцясьняць і крыўдзіць ніхто права ня мае. Кожны можа маліцца, як трэбуе яго рэлігія, можа шырыць сваю рэлігію між народам саўсім свабодна і бяз страху перад «начальствам». Няможна нікому бараніць перамяняць рэлігію на іншую або адрэчся ад усялякай рэлігіі: *сумленьне чалавека, яго думкі і вера — рэч сьвятая, і нікому да гэтага ніякага дзела няма.* А што робіцца ў нас? Шмат бяды ды гора цярпелі ў нас людзі за веру, дый цяпер яшчэ церпяць. Ня так даўно была ў Беларусі вера *ўніяцкая,* дык правіцельства саўсім яе скасавала і прыказала ўніятам прыняць праваслаўе. Але як народ з добрай волі не хацеў зьмяніць сваёй веры, то правіцельства сілаю прымушала да гэтага. Каталікоў уважала начальства за неякіх «чужынцаў», на казённую службу іх саўсім не прынімалі, дый цяпер мала прымаюць. Шмат каталіцкіх касьцёлаў пазакрывалі, а як часам народ не хацеў аддаць свайго касьцёла, то пасылалі на «ўсьмірэньне» казакоў ды войска, і многа ахвяр гінула за веру. Усе мы помнім яшчэ нядаўную крывавую расправу ў Крожах... Гэтакая несправядлівасьць прыносіць шкоду ня толькі адным каталікам, ці ўніятам, ці так каму: яна шкодзіць усяму расейскаму народу, і вось чаму. Правіцельства, аднімаючы ўсе правы ад каталікоў і ўсялякіх «іншаверцаў», дае карыстаць з гэтых правоў праваслаўным; дзеля таго ў іншаверцаў зьяўляецца нянавісьць не да тых, хто іх крыўдзіць, а да ўсіх праваслаўных, каторыя крыху лепей жывуць за іх. Гэтакім парадкам пачынаецца непатрэбная сварка між людзьмі розных рэлігій, і ў гэтай сварцы людзі забываюцца аб сваім супольным ворагу, проціў каторага павінны ісьці ўсе разам. Каб палажыць усяму гэтаму канец, трэба, канечне, дабіцца і ў Расеі поўнай *свабоды сумленьня і веры.*

Але думаць паціху і ня мець можнасьці казаць другім аб тым, што чалавек прыдумаў і што прызнае за праўду, — гэта не свабода, а няволя. І ўсюды, дзе народ дабіўся свабодных парадкаў, ён устанавіў законы, па каторых кожны чалавек мае права свабодна казаць і шырыць між людзей усе думкі свае, пісаць і друкаваць іх без усялякай «цэнзуры» і дазваленьня начальства. «Цэнзура» адменена там на заўсягды і ніколі ня можа быць зноў устаноўлена. Кожны мае права свабодна ўстроіць сабе друкарню, друкаваць усялякія кніжкі, газэты, пісаць у іх аб усім, каб толькі была праўда, дый аб усіх, ня гледзячы, чы то чыноўнікі, чы паліцыя, чы міністры. Калі ж будзе напісана няпраўда або проста брахня, то пісаўшыя атвячаюць прад выбарным судом прысяжных па законах, устаноўленых самым народам. Пры такіх парадках народу жывецца лепей, як у нас, бо ўсякае нарушэньне закону чыноўнікамі можна хутка адкрыць прад усім сьветам, і суд пакарае вінаватых.

У нас ёсьць інакшыя законы ды парадкі, пры каторых вельмі трудна друкаваць, што чалавек хацеў бы. Карыстаюць з гэтага ўсялякія злыдні і сасуць з народу кроў бяз страху, што іх калі пакараюць. Каб жа і ў нас можна было сьмела і свабодна казаць і друкаваць усю праўду, трэба дабіцца поўнай *свабоды слова і друку.*

Калі народ мае свабоду слова, то ён павінен мець можнасьць карыстаць з гэтай свабоды і дзеля таго сабірацца свабодна на сходы, сабраньня, на каторых галасна, перад усімі людзьмі, можна было б казаць, што трэба. Так яно і робіцца ў свабодных краёх. Напрыклад, у Англіі кожны чалавек, калі ён нешта прыдумаў і здаецца яму, што гэта добра, — кожны мае права саб-




АРХІЎ АНАТОЛЯ СІДАРЭВІЧА

**Працяг на старонцы 32.**

# Аб свабодах

Працяг са старонкі 31.

раць сход і павесьці сваю гутарку. І ніхто не перашкодзіць яму ў гэтым, паліцыя да яго не прычэпіцца, а калі народ сабраўся ў якой кватэры, то ніводзін паліцэйскі ня войдзе туды. А ў нас? Каб сабрацца, трэба мець дазваленьне ад паліцыі, толькі дастаць яго трудна: ня кожнаму даюць. На сабраньні ў нас сядзіць паліцэйскі і слухае, хто што кажа. Як яму нешта не спадабаецца, то разгоніць сабраньне ды яшчэ арыштуе аратара. Калі ж сабярэцца колькі людзей без дазваленьня, то зараз прыляціць паліцыя ды ўсіх, як ест, і павядзе ў турму. Вось якая ў нас свабода!

Калі няможна людзям свабодна зьбірацца ды свабодна гаварыць, то надта трудна згаварыцца, што рабіць, якія ўстроіць парадкі, каб народу свабадней жылося. Ня можна ў нас злучацца і ў саюзы, у таварыства, калі на тое ня будзе сагласу начальства. А ведама, што, не згаварыўшысь добра ды не зрабіўшы моцнага саюзу, народ ніколі ня зможа дабыць сабе ні свабоды, ні лепшых справядлівых парадкаў. Дзеля таго і павінны мы цьвёрда трэбаваць яшчэ *свабоды сходаў і свабоды саюзаў.*

Усе гэтыя свабоды роўна патрэбны ўсім людзям: і панам, і мужыкам, і работнікам. Але ёсьць яшчэ адна свабода, каторай ня хоча дапусьціць ня толькі правіцельства, а і ўсе паны-багачы, памешчыкі, фабрыканты: гэта *свабода забастовак.* Бяз гэтай свабоды працуючаму народу жыць нельга: апроч забастовак няма ніякіх спосабаў для паляпшэньня цяжкага жыцьця ўсіх працуючых. У нас за забастоўкі караюць; на падмогу памешчыкам ды фабрыкантам проціў забастоўшчыкаў правіцельства пасылае казакоў, войска, паліцыю, жандараў. Забастоўшчыкаў гнояць па турмах, ссылаюць у далёкія, чужыя месцы. Каб палажыць канец гэтаму, трэба разам зь іншымі свабодамі дабіцца і гэтай важнай свабоды, дабіцца *законаў аб свабодзе забастовак.*

**Падрыхтоўка да друку Анатоля Сідарэвіча**



АНДРЭЙ АНТАНЕНКА

**У пецярбурскіх музэях дагэтуль захоўваюцца трафеі расейскага войска: косы разгромленых касінераў Каліноўскага. Артыкул Міколы Нікалаева. Старонка 33.**

# Цяжар спадчыны

Працяг са старонкі 27.

дзённае жыцьцё і не гісторыя сялянства, а менавіта палітычная гісторыя гэтай шматнацыянальнай дзяржавы, Вялікага Княства Літоўскага, паходжаньне ды эвалюцыя верхніх сацыяльных пластоў дзяржавы, а таксама іхняя культура, сталі асноўнымі тэмамі «Энцыкляпэдыі ВКЛ».

Што да этнічнасьці, то ў энцыкляпэдыі ўжо заўважныя тэндэнцыі адмаўленьня ад ідэі «вечнай нацыі», паводле якой беларусы існавалі заўжды ў сваім нязьменным выглядзе, адбіваючыся то ад палянізацыі, то ад русіфікацыі. Выяўляецца пэўны інструмэнталізм прызнаньня таго, што ўсе падзеі з нашай гісторыі так ці інакш мелі ўплыў на фармаваньне мадэрнай беларускай нацыі. Разглядаючы чыньнік польскай і лацінскай моў, аўтар агляднага артыкулу «Народы і мовы» прызнае, што ягонага ўплыву не пазьбег практычна ніводзін з узроўняў старабеларускай мовы. «Вынікі гэтага ўзьдзеяньня мелі ў цэлым станоўчае значэньне для разьвіцьця старабеларускага кірылічнага пісьма», якое значна ўдасканалілася, дапоўнілася новымі дадатковымі элемэнтамі. Але ж адначасова ў XVII ст. адбываўся працэс звужэньня сфэры ўжываньня старабеларускай мовы. І гэта ня проста паралельныя, хоць і рознавэктарныя зьявы, а сьведчаньне нашага праклятага сынкрэтызму, ад якога так і ня ўдасца ўцячы.

У свой час Вялікае герцагства Бургундзкае XIV—XV ст. я бачыў адзіным аналягам Вялікага Княства Літоўскага ў Эўропе. Гэтая дзяржава таксама ўзьнікла на памежжы культур — рамана-германскім, і аб’ядноўвала тэрыторыі ўсходу Францыі, захаду Нямеччыны, Нідэрлянды, Бэльгію, Люксэмбург. І статус гэтых дзяржаў, паводле сярэднявечнай традыцыі, быў роўны. Вялікае герцагства — гэта і ёсьць Magnus Ducatus, як на лаціне называлася і Вялікае княства. Менавіта бліскучай культуры Бургундыі вядомы нідэрляндзкі гісторык Ёган Хёйзінга прысьвяціў сваю клясычную працу «Восень сярэднявечча», знаходзячы там узор куртуазнасьці. Але поўныя аналёгіі не спрацоўваюць. У XIII—XIV ст. Вялікае Княства Літоўскае кіравалася паганцамі, у той час як хрысьціяне складалі значную частку іх падданых. І адбывалася тое ўжо не ў часы Рымскай імпэрыі. Для Эўропы эпохі крыжовых паходаў такі сымбіёз быў нонсэнсам. І многія заходнія хрысьціяне сапраўды з падазрэньнем глядзелі на гэтае новае ўтварэньне, што дазваляе часткова зразумець зацятасьць войнаў Нямецкага ордэну зь дзяржаваю нашых продкаў. Тая сыстэма міжрэлігійнага сымбіёзу, якая ўсталявалася ў ВКЛ, парушала канцэпцыю хрысьціянскай улады, кідала выклік унівэрсалісцкім інстытутам тагачаснай Эўропы. І ў гэтым ёсьць прынцыповае адрозьненьне Вялікага Княства Літоўскага ад Вялікага герцагства Бургундзкага. Што іх усё ж лучыць — пэўная абмежаванасьць герархічнага статусу. У атачэньні каралеўстваў вялікія князі (герцагі) пачуваліся не да канца ўтульна ды імкнуліся прыдбаць новую годнасьць. Мы памятаем, што Вітаўт прыклаў дзеля гэтага немалыя намаганьні. Урэшце, тытул вялікага князя літоўскага стаў часткаю найменьня кіраўніка аб’яднанай дзяржавы, а Бургундзкае герцагства зьнікла.

**Алег Дзярновіч**

# У чужым Арсэнале

Санкт-Пецярбурскі Арсэнал упершыню выставіў гарматы і рыцарскія дасьпехі, захопленыя расейцамі ў Нясьвіжы.




АНДРЭЙ АНТАНЕНКА

Адзін з найбуйнейшых музэяў зброі ў сьвеце, Санкт-Пецярбурскі Арсэнал, адчыніў новую экспазыцыю, у якой, між іншым, паказаныя найлепшыя ўзоры беларускай зброі. Найбольш рэдкія і каштоўныя экспанаты паходзяць са збраёўні Нясьвіскага замку.

У 1772 г. Нясьвіскі замак быў татальна разрабаваны, расейскія войскі вывезьлі адтуль на загад «асьветніцы» — імпэратрыцы Кацярыны II — бібліятэку, нумізматычную калекцыю, гарматы і старажытную зброю, габэлены, жывапіс і іншыя творы мастацтва.

Бібліятэка на момант вывазу ў Пецярбург налічвала каля 22 тысяч кнігаў. На эўрапейскія меркі гэта быў значны кнігазбор.

Калі вясной 1775 г. Караль Станіслаў Радзівіл прыняў у Вэнэцыі ад расейскага пасла Ота Магнуса фон Штакельбэрга шэсьць мільёнаў злотых выкупу за канфіскаваныя ў яго ўладаньнях каштоўнасьці, гэта сьведчыла, што гаспадар з канфіскацыяй пагадзіўся. Праўда, пазьней частку вывезеных сямейных каштоўнасьцяў (фамільныя ўпрыгожваньні, рэліквіі, посуд) Радзівілам вярнулі. Бібліятэка ж ад жніўня 1772 г. ляжала запакаваная ў 94 скрынях у сутарэньнях Акадэміі навук у Пецярбургу.

«Многочисленное собрание книг, хранимое в то время в Несвице, что в Литовском княжестве, перевезено и приобщено к нашему...» — пісаў бібліятэкар Акадэміі, немец на расейскай службе Ёган Бакмейстэр[1].

Францускі гісторык Кастэра пісаў: «Сама імпэратрыца ўдзельнічала ў падзеле здабычы. Славутую бібліятэку князя Радзівіла, скарбонку літоўскай гісторыі, захапілі і адправілі ў Пецярбург; няма сумневу, што яна адтуль больш ня вернецца»[2].

Вялізная колькасьць манэтаў і мэдалёў, габэлены, карціны і гадзіньнікі работы лёнданскіх, парыскіх і швайцарскіх майстроў засталіся ў Зімнім палацы расейскіх імпэратараў, рэшта разышлася па загарадных рэзыдэнцыях.

Значная частка заходнеэўрапейскіх рыцарскіх дасьпехаў з «Рыцарскай залі» ў сучасным Эрмітажы і паходзіць са збраёўні Нясьвіскага замку. Але гэта аказалася ня ўсё.

Увосень 2006 г. адкрыў сваю «Рыцарскую залю» Санкт-Пецярбурскі Арсэнал (Музэй ракетных войск і артылерыі). У экспазыцыі можна ўбачыць высокамастацкія рэчы зь нясьвіскай збраёўні Радзівілаў, а таксама Ружанскага, Дзярэчынскага і Коданьскага палацаў Сапегаў.

Найбольшую ўвагу прыцягваюць дзьве гарматы, адлітыя ў канцы XVI ст. у Нясьвіжы. Адна зь іх называецца «Цэрбэр». Яе казённая частка змадэляваная як драўляная калода з абсечанымі сукамі з цудоўна імітаванай карой дрэва (шурпатасьць яе адчуваецца навобмацак), кара на ствале пераходзіць у языкі полымя, накіраваныя ў бок непрыяцеля. Каб ставіць і здымаць ствол зь ляфэту, на цэнтры цяжару гарматы зроблены прылiў у выглядзе трохгаловага ахоўніка «таго сьвету» — антычнага Цэрбэра. Лацінскі дэвіз гаворыць: «Cerber Acre tono dum Diti millia dono», г.зн. «Цэрбэр, страшна рыкаю, пакуль Дыту дарую тысячы». Калі на гэтай гармаце кровожэрны дэвіз, які цалкам адпавядае яе прызначэньню, то на другой адлітая нечаканая прапанова: «Poculi sint dicis nostrae vindemia vitis», што значыць «Хай будуць пышныя чары нашага багатага вінаградніка»; гэты ствол упрыгожваюць літыя вінаградныя гронкі і герб Радзівілаў. На гарматах захаваліся адлітыя ў бронзе гербы — як родавы радзівілаўскі, на аснове Чорнага Арла і Трох Рогаў, так і дзяржаўны, Пагоня. Гарматы і дасьпехі дагэтуль захоўваліся ў запасьніках, як да сёньня захоўваюцца больш позьнія трафеі расейскага войска: косы разгромленых касінераў Кастуся Каліноўскага.

**Мікола Нікалаеў**

---

[1] *Бакмейстер, И.* Опыт о библиотеке и кабинете редкостей и истории натуральной Санкт-Петербургской императорской Академии наук. СПб., 1779. С. 43.

[2] *Castera, J.* Historire de Catherine II, imperatrice de Russie. T. 2. Paris, an VIII [1800]. P. 223—224.

# Партыя БНФ і гангстэры Тарантына

Афіцыйны сайт Партыі БНФ паведаміў аб удзеле намесьніка старшыні партыі Аляксея Янукевіча ў дубляваньні «Крымінальнага чытва». Пасада Аляксея згаданая без аніякіх агаворак і ў іншых паведамленьнях аб дубляваньні тарантынаўскага фільму. Файная справа, але ж Партыя БНФ абвяшчае, што яе погляды «знаходзяцца ў рэчышчы кансэрватыўнай і хрысьціянска-дэмакратычнай ідэйнай традыцыі». Чаму тады ні партыя, ні сам беларускамоўны «баец Бутч» не пратэставалі супраць выкарыстаньня свайго партыйнага тытулу пры фактычнай раскрутцы фільму, зьмест якога ня мае нічога супольнага з хрысьціянскімі ідэямі, у СМІ?

Агучваньне фільму цягне на новы радыкальны іміджавы крок ПБНФ. Сам Аляксей абгрунтаваў яго на «Свабодзе». «Я думаю, што некаторыя палітычныя здольнасьці можна праявіць пры гэтым, а некаторыя можна ўдасканаліць. Герой, якога я агучваю, яшчэ і вельмі моцны духам пэрсанаж, сам пра сябе клапоціцца, прыдумляе нейкія камбінацыі і дамагаецца таго, што ён хоча. Ня толькі на рынгу, але і ў жыцьці. Я лічу, што гэта вельмі добрая рыса».



Намесьнік старшыні Партыі БНФ агучваў у «Крымінальным чытве» Байца Бутча.

Чакайце, я меркаваў, хрысьціяне — гэта людзі, што насьледуюць традыцыі Ісуса Хрыста. Што лічыў добрым Ісус — тое добра для іх. Таму моц духам яны даводзяць супрацівам злу, а не задавальненьнем уласнага эгаізму любым коштам. Клапоцяцца перадусім пра бліжніх. Не, гэта, відаць, нейкія іншыя фантастычныя хрысьціяне.

Анягож, намесьнік старшыні рэальнай партыі «хрысьціянска-дэмакратычнай традыцыі» БНФ выкладае цалкам процілеглае бачаньне сваіх ідэалаў. Герой, паводле яго, мусіць клапаціцца пра сябе, а моц духу выяўляецца ў гатовасьці дайсьці да мэты любым коштам, задаволіць свой эгаізм. Прычым тут Хрыстос? Дарма ён на крыжы паміраў.

Хто каб салоўку паслухаць, а хто дзеркачовай песьні рады. Але неадэкватнасьць сытуацыі з захопленым удзелам кіраўніцтва кансэрватыўнай хрысьціянска-дэмакратычнай партыі ў дубляваньні пазбаўленага ўсякіх маральных комплексаў твору з жыцьця гангстэраў мае сапраўды беларускі размах. Яна яшчэ больш уражвае, калі згадаць, што Аляксей быў не адзіным прадстаўніком кіраўніцтва ПБНФ, які ўзяўся несьці фільм «Крымінальнае чытво» ў беларускія масы. Кансультаваў перакладчыкаў у пытаньнях брыдкаслоўя сябра Сойму ПБНФ і ГА БНФ «Адраджэньне» Пятро Садоўскі. Яму хрысьціянскія і кансэрватыўныя традыцыі таксама не перашкодзілі чыніць фактычна адваротнае. І нічога, што надоечы Пятро Вінцэнтавіч пісаў на гэтых бачынах пра маральны рэлятывізм ды ўшчуваў няшчырасьць Фядуты, перасьцерагаў, «як бы ня страціць катэгорыю сораму».

Нікольні не аспрэчваю за Аляксеем Янукевічам і Пятром Садоўскім як людзьмі права рабіць любыя ўчынкі, у тым ліку перакладаць фільмы якога-заўгодна зьместу, Бог ім судзьдзя. Але прашу ўнесьці яснасьць у стаўленьне ПБНФ да пытаньняў хрысьціянскай маральнасьці. Чаму ў праграме партыі чытаем: «Дэмакратыя — гэта вяршэнства закону, ня толькі юрыдычнага, але й маральнага. БНФ «Адраджэньне» не прымае палітыкі без маралі. Прынцып маральнасьці палітыкі ўгрунтаваны на нашай культурнай традыцыі й хрысьціянскіх каштоўнасьцях нашых продкаў». А рэальна бачым — «Крымінальнае чытво» *ад ПБНФ*. Дзе сапраўднае? Калі ўжо абвесьцілі сябе хрысьціянамі, дык гэта ставіць перад вамі пэўныя маральныя вымогі. Сьвятая Інквізыцыя не прымушала Садоўскага і Янукевіча ўздымаць штандар хрысьціянскіх каштоўнасьцяў. Дапускаю, яны маглі перадумаць пасьля таго наконт хрысьціянскасьці, сапраўды, цяжкі ейны крыж, але ў такім разе трэба было ім абвесьціць пра свой выхад з партыі, і ва ўсялякім разе не дапускаць юзаньня імя БНФ дзеля раскруткі такога фільму. Або правесьці зьезд і

**Крымінальнае чытво / Pulp fiction**

Трылер-баявік Квэнтына Тарантына, зьняты ў 1994. Культавае кіно 90-х. Мноства крывавых сцэнаў, чорны гумар, брутальна-іранічны погляд на жыцьцё. Перакладаць фільм на беларускую мову ўзялася ініцыятыва «Беларускі Гальфстрым» (Франак Вячорка). У дубляжы апроч Аляксея Янукевіча ўзялі ўдзел Лявон і Ганна Вольскія, Ігар Варашкевіч, Аляксандар Памідораў.

**Удзел ў рэкляме мыла не перашкодзіў Рэйгану стаць прэзыдэнтам ЗША**

Гэта не адзіны выпадак, калі палітык займаецца агучваньнем фільмаў. Самы яскравы прыклад — калі дацкая каралева агучвала казку Андэрсана. Не магу пагадзіцца і з тымі, хто ставіць знак роўнасьці між фільмам Таранціна і «Зянон-хопам». Падабаецца нам гэта ці не, але «Крымінальнае чытво» — адзін з самых значных сусьветных фільмаў. Асабіста стаўлюся да «Чытва» без асаблівага піетэту, але згодны, што яно было важным этапам у разьвіцьці кінэматографу. Тое, што сп.Янукевіч агучваў «Крымінальнае чытво» — гэта самастойны выбар палітыка. Што да Рэйгана і Шварцэнэгера, то да таго, як яны прыйшлі ў палітыку, яны гралі і ў адмысловых карцінах. Як, скажам, Шварцэнэгер у «Конане-барбары». Такая карціна магла б быць ухваленая і ў Трэцім Райху. А Рэйган рэкламаваў мыла, але гэта не перашкодзіла яму стаць прэзыдэнтам ЗША.

**Андрэй Расінскі, кінакрытык**

зьмяніць праграму партыі.

Між іншым, справа ня толькі ў хрысьціянстве. Палітык — асоба публічная. Палітыка — ягоны асноўны занятак, мэта — арганізацыя кіраваньня супольнасьцю грамадзянаў. Гэта ўплывае на яго становішча ў грамадзтве, вымагаючы ад яго (ці яе) часам больш, чым ад іншых. Асаблівы высокі грамадзкі статус ёсьць і ў дыпляматаў, нават былых. Такія асобы проста ня маюць маральнага права карыстацца гэтым сваім асаблівым высокім грамадзкім статусам, прымаючы ўдзел у праектах кшталту дубляваньня сумнеўных фільмаў і перакладу лаянкі.

У грамадзтве ёсьць розныя культурныя слаі, вышэйшыя і ніжэйшыя. Нехта слухае Вівальдзі, а нехта глядзіць «Крымінальнае чытво» і рыфмуе «Зянон-хоп». Але калі асоба рэпрэзэнтуе сябе як прадстаўніка эліты, яна павінна паводзіцца адпаведным чынам з адпаведнай этыкай і эстэтыкай (пра якія так любіць разважаць Пятро Вінцэнтавіч) і не «адцягвацца» час ад часу, маўляў, «мы ж таксама людзі». Пры тым ня важнае паходжаньне чалавека. Калі прагнеш кіраваць грамадой, паводзь сябе як лідэр, ці, прынамсі, спрабуй. Актор Рэйган і тэрмінатар Шварцэнэгер, прыйшоўшы ў палітыку, сталі палітыкамі, назаўжды пакінуўшы ранейшае рамяство.

У сёньняшняй палітычнай сытуацыі ПБНФ гэтай кінаавантурай дала ўладзе чарговы козыр высьмеяць партыю. Прышпільна — Янукевіч і Садоўскі ў «Крымінальным чытве», далібог, я сам усьміхнуўся. Як цікавостка гэта, вядома, прывабна. Але ці будзе хто галасаваць за іх, калі справа дойдзе да сур'ёзнага? Ня ведаю, ці буду я галасаваць за іх, калі наагул гэта самая яркая падзея, якая мне запомнілася з усёй дзейнасьці Партыі БНФ за мінулыя месяцы побач з адмовай ад падтрымкі Мілінкевіча? Сьмех — цудоўная рэч, але адзін толькі сьмех ня ёсьць палітычным капіталам.

*Сяргей Богдан, Маладэчна*


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксей Янукевіч — новае пакаленьне Народнага Фронту.**

## Аляксей Янукевіч: Фільм не пярэчыць ніякім маім каштоўнасьцям

Намесьнік старшыні партыі БНФ Аляксей Янукевіч прыняў удзел у дубляваньні на беларускую мову фільму Квэнціна Таранціна «Крымінальнае чытво». Аляксей агучваў байца Бутча, якога ў фільме сыграў Брус Ўіліс. Гэтая акалічнасьць выклікала неадназначны рэзананс. Што пра гэта думае сам Аляксей?

Аляксей Янукевіч тлумачыць сваю пазыцыю ў дубляваньні фільму наступным чынам: «Ад таго моманту, як я ўпершыню паглядзеў фільм, для мяне «Крымінальнае чытво» стала адным зь любімых. Я сам быў ініцыятарам перакладу на беларускую мову менавіта гэтага фільму, а таксама лічыў за вялікі гонар прыняць удзел у яго дубляжы. «Крымінальнае чытво» навучыла мяне лягчэй ставіцца да многіх жыцьцёвых момантаў, а таксама трываць выклікі лёсу. Фільм сам па сабе абсалютна не пярэчыць ніякім маім каштоўнасьцям, не лічу, што гэты момант неяк можа адбіцца на маёй палітычнай кар'еры. Калі ў палітыка ёсьць час і магчымасьць займацца ня толькі ўласна палітычнымі справамі, але таксама ўдзельнічаць у культурных ці нейкіх іншых праектах, то ён мусіць гэта рабіць. Мяне зараз больш абурала б тое, што на беларускай мове выходзіць так мала фільмаў, а ня тое, што Аляксей Янукевіч бярэ ўдзел у іх дубляваньні».

**Зьміцер Панкавец**

**МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК**

апавяданьне

# Загад каралевы,
## або Пяць хвілін у парозе



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

*Ірыне Казулінай*

Што гэта за Новы год? Не было сьнегу — адныя восеньскія мыдліны. Усе чакалі сьвята, а зямля яшчэ не была перасланая з будзённага на сьвяточнае. І трэба было самой рупіцца, ствараць таямніцу, штовечар па зорах запальваць сямісьвечнік, здумляць, што паставіць на стол.

Вецер з ракі, чайкі раз-пораз падымаюцца над вадой, над дробным рабаціньнем, белай пенай вышэй і вышэй да высокай хвалі. Прыбой ужо б'ецца аб сьцяну. Наш белы дом на самым беразе выдаецца прагулачным параходам — з пакояў кватэры я бачу толькі ваду і той бераг. Месяц блісьне з-за хмар срэбнай лускай, як шчупак на нерасьце, абдасьць пырскамі. Я дзіўлюся, што ў нас, у людзей, якія жывуць каля вады, ані ў кога няма прыватнага чаўна.

І толькі за некалькі дзён да Новага году позна ўвечары пайшоў сьнег, буйны, кожная сьняжынка асобнай выцінанкай, хоць ты яго ў кошык зьбірай, як зімовыя кветкі, і нясі пацешыцца дамоў. І ў гэты момант нехта распачаў салют! Сярод сьнегу расьцьвіталі рознакаляровыя пэтарды. Вядома ж, выпадковае супадзеньне. Стоячы ў вакне, я мроіла, што жыву ў каралеўстве (у якім такім веку, на якім такім сьвеце), дзе загадана вітаць першы сьнег, смалячы з гармат.

Было пераслана з будзённага толькі на адну ноч, але гэтага быццам і дастаткова, каб засьпяшацца накупляць падарункаў. Тым больш, што ў касьцёлах ужо прагучала сакральнае: «Перадайце бліжняму знак супакою…» І я, накінуўшы

нешта на плечы абы з дому, захапіўшы цукеркі, пайшла да Аляксандры — гэта спусьціцца з майго паверху крыху ніжэй. Мы мала знаёмыя, але часта біярытмы нашыя супадалі, і мы сустракаліся ў пад'езьдзе, у ліфце, ня болей. Іншы раз яна была з дарослымі дочкамі, усе трое звычайна надэчыўшыся да астатняга. Выдавалася, яны райскімі птушкамі зьляталі праз ноч з залатога шаста і толькі за дзьвярыма пераўвасабляліся ў маладых жанчын зь Зялёнага мысу (на высокіх абцасах, у нечым рознакаляровым, толькі што пер'е ня ветрае на галовах), якіх поўны наш горад. Ня мой фармат, як той казаў. Але ейны заўсёдны настрой, непасрэдная весялосьць змушвалі радасна адазвацца, усьцешыцца чужому балю-маскараду.

Цяпер усе ведалі: муж Аляксандры — палітычны вязень, у калёніі на некалькі год. Я ж сама ня маю аніякіх такіх амбіцый: не выходжу на плошчу, не вывешваю сьцягу на бальконе. Нядаўна, едучы ў таксоўцы, убачыла бел-чырвона-белы маленькі сьцяжок у салёне. «Гэта… польскі?» — запыталася ў маладога кіроўцы, не даючы веры сваім вачам. Гэта ж сярод белага дня! У цэнтры гораду! І таксоўка не бранявік! «Амаль усе мае пасажыры таксама блытаюцца», — адказаў ён засмучона. Сапраўды, мяне хвалююць, прываблівають выступы рэвалюцыйныя гэтак сама, як водар кветак дзікіх, занесеных ветрам у горад, як пах парфумы GUCCI: нешта вясновае — ландыш, фрэзія, дубовы мох і найболей — нарцыс. Я ішла да Аляксандры проста як да суседкі ў бядзе, каб перадаць знак супакою, дакрануцца да яе, бы стоячы ў касьцёле падчас службы.

Адчыніла сама Аляксандра. Голас яе ціхі, глухі, бы здалёк, з суседняга пакою, хоць стаяла побач — голас бяды, высахлае моўнае рэчышча. І толькі гэта падалося нязвыклым. А навокал буяла паўночнае зьзяньне — ейны заўсёдны космас. Усе праёмы дзьвярэй ва ўсіх пакоях у зыркіх гірляндах сьвяточных агнёў. Пазначаныя ўсе хады, як у суцэльнай цемры днём і ноччу, у якой яна цяпер, вядома, сябе адчувала. Гэта быццам сполахі памяці, калі ўсё зруйнавана, зьнішчаны дом, але недзе вось тут павінны быць дзьверы, і тут, і тут таксама. І не зачэпіш у гэтым доме па памяці плячом вушака, і не абапрэсься на яго. Аніводнага цёмнага кута ў пакоях, аніводнага, каб сумнага. Елка відаецца з парога, прыбрана густа, вясёлкавымі сумётамі, як сьнегападам у непагадзь. Елка вялікая, з шырокім нізам, як прыполам, дзеля яе, пэўна, адчыненыя падвойныя дзьверы ў зале. Аляксандра ў белай блюзцы. Яны абедзьве разам ходзяць, прыбраўшыся, па сьветлых пакоях, разам няўцямна пaглядаюць у вакно, як… з маяка. Я ня здолела схаваць зьдзіўленьня, жалю, аглядаючыся, усё бачу скрозь свае стаячыя, стрыманыя сьлёзы, як праз ілюмінатары. «У нас так, як заўсёды, як Ён любіў…» — кажа Аляксандра. Глядзела на мяне здалёк, з тысячагодзьдзяў, калі жанчына ў непагадзь разводзіла выратавальнае вогнішча на беразе мора, каб пазначыць дарогу вяртаньня, дарогу дамоў.

Пяць хвілін у парозе, і я сьпяшаюся разьвітацца, у мяне сеў голас, падлога хістаецца пад нагамі, падымаюся да сябе ўжо, бы ў верхнюю каюту, успамінаючы: на сваіх выступах ейны муж любіў паўтараць «Я — марскі пехацінец».

Пяць хвілін у парозе, і я адмаўляюся ад звычкі разумець каханьне як нешта інтымнае, асобнае, што тычыцца толькі дваіх, закаханых адно ў аднаго. Любое пачуцьце, тым больш каханьне, публічная, нават грамадзкая зьява, — гэта нешта такое, што зьяўляецца разам з чалавекам. Гэта ўсхваляваны пачуцьцём сьвет, як лічыць Альфрэд Кальлерыч. І мой сьвет таксама пасьля наведваньня Аляксандры.

Пяць хвілін у парозе, адкуль праз адчыненыя насьцеж дзьверы бачныя былі ўсе пакоі, увесь наш белы дом, уся нашая старана, дзе яшчэ дзейнічалі зьявы сублімацый старажытных рытуальных памкненьняў: арышты, астрогі. І памяркоўная згода людзей з усім, маўляў, «такі цяпер час» — абарончы рубеж сваёй абыякавасьці. Цяпер я разам з Аляксандрай намагалася трымаць у руках усе «ключы», каб не згубіць сваіх мройных уяўленьняў аб дасканаласьці боскага сьвету. Разам зь ёй вучылася не зжывацца з архетыпам параненага чалавека, што для большасьці з нас вельмі характэрна — бядуем, як у запоі, бяз дай прычыны.

У тую навагоднюю ноч я таксама спынілася каля ейнага вогнішча на беразе, спадзеючыся, што сьвятло дойдзе да тых, хто церпіць бяду або звычайную косную крыўду.

Вецер з ракі падаваў голас у выцяжцы — голас далёкіх вандровак у думках, вандровак і вяртаньняў, зноў і зноў да Аляксандры. Скончацца сьвяты, і яна здыме белую блюзку, як і елачную мішуру, выключыць сьвяточнае сьвятло. Толькі цяпер лёгка будзе знайсьці мне і кожнаму, хто яе ведае, выратавальны шлях па зорах. І здасца верагодным: каб яна была каралевай або проста жонкай прэзыдэнта, яна б загадала смаліць з гармат, калі б пайшоў доўгачаканы першы сьнег.

Хіба гэта не падзея ў нашым маленькім жыцьці — маленькім, як гэты апавед пра каханьне?

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793—1917)** / Сост. Т.Е.Леонтьева. — Менск: БелНДІДАС, 2006. — 392 с., [22] с.: іл.

У аснову выданьня пакладзены створаны пры канцы 1970-х — пачатку 1980-х г. даведнік для ўнутранага архіўнага карыстаньня. Гэта крыху адчуваецца і цяпер — у ацэначных выказваньнях ці, часам, у тэрміналёгіі. Але для тых, хто займаецца альбо цікавіцца гісторыяй пэрыяду канца XVIII — пачатку XX ст., названае выданьне — сапраўдная дапамога.

**Фонды Национального исторического архива Беларуси: справочник.** Менск: БелНДІДАС, 2006. — 304 с.

32 гады прайшло з моманту выданьня папярэдняга даведніка (Центральный государственный исторический архив БССР в Минске. Путеводитель. Менск, 1974). Выданьне ў чымсьці ўдасканаленае — апроч новых зьвестак, зьявіўся, прынамсі, агульны сьпіс фондаў архіву, а таксама ўдакладнёная гісторыя інстытуцый, што апісваюцца. Затое ў старым даведніку анатацыі фондаў былі больш падрабязныя. Нязьменная тэндэнцыя — покуль архіўнае кіраўніцтва мяркуе, што падобныя даведнікі варта выдаваць на расейскай мове.

**Сяргей Макарэвіч, АДз, ВР**

# Міхаіл Герчык: Не спадзяваўся выбрацца адтуль

Аўтар раману «Здабыцьцё надзеі», праз 30 гадоў сам аказаўся ў Бараўлянах як пацыент. Зь пісьменьнікам гутарыць **Зьміцер Панкавец**.

## «Напісаць пра анкалёгію прымусіла дэпрэсія»

**«Наша Ніва»: Калі гэтай зімой мы ўпершыню спрабавалі дамовіцца на гутарку, то Вы сказалі, што кладзяцеся на апэрацыю ў Бараўляны. Як увогуле цяпер здароўе?**

**Міхаіл Герчык:** Якое цяпер здароўе? Цяжка хварэў. Два месяцы праляжаў у Бараўлянах у анкалёгіі. Думаў, калі пісаў раман «Здабыцьцё надзеі» пра анкалягічныя захворваньні, што гэтая зараза ніяк ня зможа прыліпнуць да мяне ў жыцьці, але не... Здавалася, што я ўжо тады перажыў гэта ўсё, я хадзіў тады на апэрацыі, гутарыў з сотнямі дактароў і хворых. З таго часу мінула больш за 30 гадоў, і я аказаўся ў Бараўлянах ужо як пацыент. Мяне ўратавалі, за што я ўсім дзякую, бо не асабліва спадзяваўся выбрацца адтуль. Мне зрабілі дзьве цяжкія апэрацыі, цяпер ня вельмі хочацца шмат пра гэта казаць... Успамінаю, калі былі маладымі, сядзелі на пісьменьніцкіх зьездах і пленумах на апошніх шэрагах, крычалі нешта адтуль, абураліся. Не пасьпееў заўважыць, як прыйшла старасьць.

**«НН»: А чаму Вы ў свой час пачалі пісаць раман пра людзей хворых на рак, калі іншыя калегі па пісьменьніцкім цэху пісалі пра вёску, мову, вайну?**

**МГ:** Гэта быў вельмі цяжкі пэрыяд майго жыцьця. У мяне ўсё ішло вельмі ўдала, я атрымаў прэмію імя Астроўскага ў Маскве за раман «Аддаеш назаўжды», былі іншыя прэміі, выходзілі кнігі. І на гэтым фоне нечакана пачалася дэпрэсія, я сядзеў над аркушам і ня мог напісаць ніводнага радка. Гэта быў нейкі жах. У дадатак, ад раку памерлі маладымі некалькі маіх сяброў — журналісты Дзіма Мілашэўскі і Ларыса Ляўкова. Ларыса ня вытрымала пакутаў хваробы і выкінулася зь дзевятага паверху дому, а Дзіма памёр у больніцы, ён вечарам глядзеў тэлевізар, закашляўся, парвалася нейкая сьценка артэрыі, і за 40 сэкундаў ён памёр. Я паехаў у Бараўляны, каб даведацца, што гэта за хвароба такая. Я ні ў якім разе не зьбіраўся пра яе пісаць, бо тады гэта падавалася мне вельмі страшным. Мне было проста цікава: чаму чалавек робіць посьпехі ў атамнай энэргіі, ляціць у космас, а пра гэтую хваробу яму вядома столькі сама, колькі з часоў Гіпакрата. У нашай літаратуры нічога такога пакуль не было, мы ж тады яшчэ не чыталі «Ракавы корпус» Салжаніцына.

## «Пяць гадоў я езьдзіў у Бараўляны як на працу»

**«НН»: Наколькі я разумею, з той паездкі і нарадзілася ідэя цэлай кнігі?**

**МГ:** Я прыехаў у Бараўляны і прыйшоў да акадэміка Мікалая Аляксандрава, які ўзначальваў інстытут анкалёгіі. Пасядзелі, паразмаўлялі. Я задаў яму пытаньні. Ён сказаў: вось вам халат, я дам загад, каб вас усюды пускалі, хадзіце, можа што ўбачыце. Гэта было ў 1970 годзе. Гэты ж халат я зьняў практычна толькі празь пяць гадоў. Кожны дзень я езьдзіў у Бараўляны як на працу. Спачатку было проста страшна, было адчуваньне безвыходнасьці, потым зьявілася нейкая надзея. Я бачыў тых, хто вылечваўся, хто перамагаў. Мяне прадстаўлялі як доктара-псыхоляга, праз гэта мне было лягчэй кантактаваць з хворымі. Найбольш часу я правёў з маладым хірургам Леанідам Сукаватых. Хоць мы і сьцьвярджаем, што гэтая хвароба ня ёсьць заразнай, але многія зь людзей, што там працавалі, памерлі менавіта ад раку. Той жа лёс чакаў і Сукаватых, яму было крыху больш за 40 гадоў. Ужо цяжка хвораму я прынёс прачытаць рукапіс кнігі, ён яго прачытаў, зрабіў некалькі правак. Ён да апошняй хвіліны зьбіраў сваіх вучняў і расказваў ім аб сваім стане. Якія лекі дзейнічаюць на яго, а якія — не. Ён ведаў, што паміраe, але не закансэрваваўся ў сабе, а працягваў працаваць.

## «Дзед пажыў пры камунізме»

**«НН»: Якія гісторыі, пачутыя ў Бараўлянах, найглыбей урэзаліся ў памяць?**

**МГ:** Адну гісторыю я ўзгадваў сёлета, калі там ляжаў. Пра палескага дзядка, які ўпершыню за сваё жыцьцё выехаў некуды далей за свой райцэнтар. Да яго прыехала дачка, прывезла паесьці. Ён кажа: «Дачушка, нашто? Тут стаяць вялікія белыя скрыні, у якіх можна знайсьці любыя прысмакі. Я пайду набяру — і мне добра». Стары нават ня ведаў, што такое лядоўня. Людзі дамовіліся між сабой нічога не гаварыць дзядулю, каб ён хоць троху пажыў пры камунізме. Гэта прыносіла ім усім радасьць, адзін зь нямногіх сьветлых момантаў, пра які я напісаў з асалодай.

**«НН»: Што запомнілася з трагічнага?**

**МГ:** Была адна балерына, маладая 19-гадовая дзяўчына. У яе быў рак малочнай залозы. Доктар добра разумеў, што ёй трэба ампутаваць адну з грудзей, але зрабіць ён гэта ня мог, не падымалася рука. Скалечыць дзяўчыну, у якой жыцьцё наперадзе. Ён адмовіўся ад апэрацыі і спрабаваў яе вылечыць без ампутацыі. І яна памерла. Гэта было так страшна, што я не магу вам перадаць словамі. Гэты лекар увесь пасівеў за адзін раз. Без грудзі яна б жыла, цяжка, горка, але жыла б.

Другая — гэта гісторыя аднаго віцебскага палкоўніка, які ў творы стаў правобразам палкоўніка Багачова. Быў прафэсарскі абход. Мы зайшлі да гэтага маладога сымпатычнага палкоўніка. Сукаватых павіншаваў яго, што ўсё нармальна, што гэта банальная язва. Рыхтуйцеся выпісвацца і ўсё такое. Вечарам я забавіўся ў кабінэце ў Сукаватых, туды ж прыйшоў гэты самы палкоўнік, які прынёс пляшку каньяку, кветкі, падзякаваў, ён быў шчасьлівым, што будзе зноў лётаць. Мы разьвіталіся, і калі за палкоўнікам закрыліся дзьверы, Сукаватых узяўся абедзьвюма рукамі за галаву і застагнаў. Я пытаюся, што такое. Аказваецца, вайскоўцу засталося пражыць толькі месяц. Сухаватых даў яму месяц надзеі на жыцьцё.

**«НН»: Выхад гэтага раману стаўся падзеяй?**

**МГ:** Ён быў шалёна папулярны, яго чыталі ва ўсім Савецкім Саюзе. Спачатку ён выйшаў накладам у 30 тысяч асобнікаў, яго разьмялі за адзін дзень. Потым


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

быў перавыдадзены, бо камітэт па друку закідалі лістамі з просьбамі перавыдаць. І цяпер, калі я сюды выклікаю хуткую дапамогу, то ў мяне пытаюцца, ці той самы я Герчык, які напісаў раман пра Бараўляны?

**Герчык Міхаіл (Майсей)**

нарадзіўся ў 1932 у Бабруйску ў сям'і рабочага. Скончыў Менскую пэдагагічную вучэльню (1953), аддзяленьне журналістыкі філялягічнага факультэту Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (1958). Працаваў у піянэрскай газэце «Зорька», быў рэдактарам на Беларускім радыё. З 1964 — рэдактар выдавецтва «Беларусь», з 1972 — старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сябра Саюзу пісьменьнікаў СССР з 1964.

## «З Чыгрынавым мы не размаўлялі цэлы год»

**«НН»: Як да Вас ставіліся ў пісьменьніцкім асяродку?**

**МГ:** Мне нялёгка пра гэта ўзгадваць. Ня вельмі добра, бо я габрэй, а да ўсяго яшчэ пісаў па-расейску. Пісьменьніцкае асяродзьдзе не магло прыняць габрэя, які пісаў не па-беларуску. Што б ні гаварылі, але нават у гэтым асяродзьдзі існаваў нейкі побытавы антысэмітызм. Я ўспамінаю, як сустрэў каля выдавецтва Івана Чыгрынава. Ён зарагатаў, як гэта ўмеў, і іранічна сказаў: «Ну, Міхась, ты ж вялікі пісьменьнік! Мая дачка прачытала твае аповесьці і сказала, што цябе, тата, чытаць сумна, а вось Герчыка прачытала — вось гэта пісьменьнік!» Я павярнуўся і сказаў, што, можа быць, яна і мае рацыю. Божа мой, як ён пакрыўдзіўся! З год мы не размаўлялі. Памятаю, як па выхадзе «Здабыцьця надзеі» праходзіў нейкі пісьменьніцкі пленум, і амаль кожны зь пісьменьнікаў падыходзіў да мяне, ціснуў руку і казаў: «Ну, Міхась, малайчына, такі раман напісаў! Я, праўда, не чытаў, але вось жонка чытала». Памятаю, як на нейкай бібліятэчнай нарадзе ўсе размаўлялі толькі пра мяне і мае кніжкі. Мне было нават нязручна, бо ў залі былі іншыя пісьменьнікі.

**«НН»: Дык мо' варта было б перайсьці на беларускую мову?**

**МГ:** Калі мяне канчаткова раззлавалі, то я паспрабаваў, у мяне нават выйшла некалькі кніжак па-беларуску, але яны былі напісаныя ня той мовай, якой пісалі Васіль Быкаў, Іван Мележ, Рыгор Барадулін. Я вырас у горадзе, у расейскамоўным асяродзьдзі. Я пісаў правільнай беларускай мовай, але я не адчуваў яе так тонка, як нашы клясыкі, што нарадзіліся ў вёсцы. Я і сёньня не перабольшваю сваё месца ў літаратуры, часам нават з гумарам стаўлюся да сваёй творчасьці. Ёсьць у беларускай літаратуры вялікія пісьменьнікі. Пра сябе я казаў: «Не страляйце ў піяніста, ён іграе, як умее».

**«НН»: Як ставілася да Вас крытыка?**

**МГ:** У гэтым пляне мне не шанцавала ўсё жыцьцё. У мяне былі добрыя чытачы, якія мяне любілі, але была крытыка, якая мяне не заўважала. Я сьмяяўся, калі ў тэлевізійнай праграме, прысьвечанай творчасьці таго ж Чыгрынава, сядзела крытыкеса, якая на поўным сур'ёзе казала, што на сьвеце існуе толькі тры пісьменьнікі: Талстой, Дастаеўскі і Чыгрынаў. І той сядзеў, надзьмуўшыся, і верыў, што так сапраўды і ёсьць. На мяне ж часьцей пісалі фэльетоны, чым станоўчыя артыкулы.

**Працяг на старонцы 40.**

# Міхаіл Герчык: Не спадзяваўся выбрацца адтуль

Працяг са старонкі 39.

**«НН»: Вы атрымлівалі шмат лістоў каханьня ад чытачак?**

**МГ:** Пісалі шмат. Як маладому пісьменьніку мне ўсё гэта было вельмі радасна. Але, прабачце, гэта тое, што застаецца па-за межамі любой размовы. Гэта можа застацца толькі ва ўспамінах.

## «Я не пісаў за Мазанік»

**«НН»: Кажуць, што менавіта Вы напісалі кнігу ўспамінаў за Алену Мазанік. Ці праўда гэта?**

**МГ:** Я помню гэтую гісторыю. Я быў рэдактарам яе кнігі, працаваць давялося многа, бо рукапіс быў вельмі сыры. Аднак у ім была героіка таго часу. Сама пастаць аўтаркі выклікала жаданьне ёй дапамагчы. Важна было высьветліць вытокі мужнасьці гэтай жанчыны. Яна была запалоханай на ўсё жыцьцё, і калі нават нешта ў сапраўднасьці было ня так, як у кнізе, то яна маўчала. Кніга выклікала пэўную цікавасьць, бо за ёй стаяў жывы чалавек. Хаця я хачу сказаць, што Менск вельмі дарага заплаціў за гэты ўчынак. У Менску пасьля забойства Кубэ расстралялі некалькі тысяч ні ў чым не вінаватых людзей. І тут паўстае пытаньне: ці варты быў гэты гаўляйтэр такіх ахвяраў? Учынак Мазанік найперш меў вялікае прапагандысцкае значэньне. У гэтых выпадках забываліся жывыя людзі, а заставаўся толькі сымбаль. Мы ўсе глядзелі на гэтую прыгожую жанчыну зь вялікай павагай. І тое, што я зрабіў, ня так ужо і важна, яна ж не была пісьменьніцай. Нейкую частку работы я, канечне, зрабіў, але не магу лічыцца нават суаўтарам кнігі.

## «Я габрэй, які ня ведае ідыш»

**«НН»: Вы часта ўзгадваеце сваё бабруйскае маленства, эвакуацыю?**

**МГ:** Дарэчы, нядаўна я скончыў працу над кнігай успамінаў, якія называюцца «Мроі». Там будзе ўсё, пра Бабруйск, пра асіповіцкае гета, пра бабулю, якую выратаваў знаёмы паліцай, пра эвакуацыю ў арэнбургскіх стэпах, школа ФЗО (у свой час я быў «хабзайцам»), пэдвучылішча, унівэрсытэт. Толькі ў 1950 годзе я ўпершыню ўволю наеўся хлеба. Я паступіў ва ўнівэрсытэт на аддзяленьне журналістыкі ў 1953 годзе, калі толькі-толькі адшумела «справа ўрачоў». І да габрэяў ставіліся вельмі жорстка. Сярод сяміста першакурсьнікаў было толькі два габрэі. Адна — дачка намесьніка старшыні Менгарвыканкаму, і я. Я трапіў ва ўнівэрсытэт таксама выпадкова, бо ў маім дыплёме было напісана не «Майсей», а «Міхаіл». Пасьля таго, як гэта высьветлілася, я мусіў за гадзіну даказаць, што гэта адзін і той жа чалавек.

**«НН»: Часта ў жыцьці Вам даводзілася сутыкацца з антысэмітызмам?**

**МГ:** Вось вам самая простая статыстыка: да вайны ў Беларусі выходзілі тры газэты на ідыш, а таксама тоўсты літаратурны часопіс «Штэрн», было больш за пяцьсот габрэйскіх школ, цяпер столькі няма беларускіх. Пры Саюзе пісьменьнікаў была сэкцыя пісьменьнікаў, якія пісалі на ідыш. Што да мяне, то я нават ня ведаю габрэйскае мовы, я габрэй толькі па паходжаньні. У Бабруйску я размаўляў па-расейску, бо мой бацька быў камуніст, не прызнаваў ніякага нацыяналізму. Ідыш я крышку вывучыў толькі ў Арэнбургу, калі край жыта і трэба было перамовіцца з маці, каб ніхто не зразумеў. Існавала неразуменьне, чаму цябе выпіхваюць адусюль, чаму ты застаесься на ўзбочыне. Адзіны выхад, які застаецца ў гэтай сытуацыі — гэта быць лепшым за іншых.

## «Я не ўступлю ў саюз шарлатанаў і графаманаў»

**«НН»: Ваш апошні раман «Зброя для забойцы» заснаваны на рэальных падзеях?**

**МГ:** Проста тады ў мяне ўсё накіпела, калі я працаваў у гэтым выдавецтве «Дайджэст», на маіх вачох рабіліся шалёныя грошы. Выдавалі тое, што зьбіралі на памыйніцах у амэрыканскай літаратуры, уся гэтая парнаграфія, дэтэктывы. Ад гэтай агіды я не магу адмыцца і сёньня. Я пяць гадоў адпрацаваў там. Раман «Зброя для забойцы» — гэта, пэўна, найлепшае, што я зрабіў за сваю творчасьць. Гэты раман пра трох сяброў, якія вырашылі заснаваць выдавецтва. Грошы былі толькі ў аднаго, ён і стаў уладальнікам. Пасьля адзін зь сяброў падсунуў начальніку ў крэсла ампулу радыяактыўнага кобальту. Чалавек згарэў і памёр літаральна за тры дні. Забойца загінуў у аўтакатастрофе. Шкада, што раман так і не пабачыў сьвет цалкам.

**«НН»: Як Вы ўспрынялі развал Савецкага Саюзу?**

**МГ:** Жахліва, мне было вельмі цяжка. Я адразу адчуў, што выпадаю з гэтай абоймы, мне не прыстасавацца да гэтага часу, да гэтай эпохі. Мае сын і ўнук добра адчуваюць сябе ў гэтым часе, яны працуюць, зарабляюць грошы, але мне ў ім цяжка. Гэта адчуваньне, як у пасажыра, які выпаў з трамвайчыка. Усё мяняецца, нешта некуды бяжыць, а ты стаіш і не разумееш, што адбываецца. Цяпер я звычайны жабрак, які ня можа купіць літаратурны часопіс. Я не хачу вяртацца ў Савецкі Саюз, я не хачу каўбасы па рубель семдзесят, я не хачу той цэнзуры і лжы. Але не хачу і той усёдазволенасьці, што адбываецца ў нас зараз. Калі гляджу тэлевізар, то мне здаецца, што з нас спрабуюць зрабіць поўных дурняў. Замест пазнавальных перадачаў — спорт. Нарошчвай мышцы, і ўсё будзе добра. Тая ж моладзь ня мае дзе прыткнуцца, у іх няма жыцьця. Вучыцца за грошы яны ня ў стане. А іх сябры катаюцца на шыкоўных «Лексусах», адсюль расьце непазьбежная зайздрасьць, адсюль жа расьце падлеткавая злачыннасьць.

**«НН»: Чаргінец клікаў у свой саюз?**

**МГ:** Мне няма там чаго рабіць. Гэта безнадзейна. Я ў Саюзе беларускіх пісьменьнікаў, а не ў саюзе шарлатанаў, графаманаў і ўсіх тых, хто групуецца каля ўлады.

**«НН»: Вы заўсёды трымаліся ўбаку ад палітыкі. Чаму?**

**МГ:** Так. Я і цяпер трымаюся ўбаку. Я нічога не магу ў ёй зьмяніць. У арабаў ёсьць цудоўная прыказка: «Дай мне, Божа, сілы зьмяніць тое, што я ў стане зьмяніць. І дай мне, Божа, мудрасьці не мяняць тое, што я не магу зьмяніць. І дай мне, Божа, розуму адрозьніць адно ад другога».

Я толькі шкадую, што некалі так нязьдарна павёў сябе Пазьняк. Пазьняк нанёс шкоды беларускаму адраджэньню больш, чым хто іншы. Трэ' было быць не фанатыкам, а дыпляматам. Трэ' было паціху зьбіраць вакол сябе людзей, а не адштурхоўваць. У нас сьмешная краіна, калі б заўтра прэзыдэнт перайшоў на беларускую, то па-беларуску загаварылі б усе чыноўнікі, а праз 20 гадоў мы б не лічылі па адной беларускія школкі, іх было б тысячы. Вось і ўся палітыка.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## УЛАДАС БРАЗЮНАС

### ВОЙШАЛК

а дэманы пісьмёнаў усё тыя ж
як сын Міндоўга, з Грэцыі, і сон
ніяк ня хоча да мяне вяртацца
што праваслаўны — значыць то, што значыць
а што манах — няма, чаго няма

як хлопчык-служка слухае суквецьці
я чую жоўтых прыцемкаў жніво
сьвятла сьвятыя кроплі на іржышчы
ня едзе сын і дэманы ўсё тыя ж
чуйнуй і чуй — відзежыцца дарога
атраду цераз мора-акіян

ой рана з паходу
ліхая прыгода
на белае цела
расою зьляцела
ўся чырвань заходу

### БАЛЦКІЯ МОВЫ

словы дадзеныя балтам
нібы латнікі з малітвай
каранямі пад асфальтам
шлях накрэсьляць па зямлі твой

выбухныя быццам бомбы
ў ночы чуюцца чужой
калі б мог іх піў нагбом бы
за латыскаю мяжой

мкнуў бы ў неба склон кульгавы
вінавальны безь віны
й даўгавечнаю Даўгавай
разгайдаў званы Дзьвіны

родны творны жыцьцядайны
ўсе *выбалтывают* тайны
бы вяслуючы на роўных
у балтыйскіх чорных чоўнах

## КАРНЭЛІЮС ПЛАЦЯЛІС

### СЬВІТАНАК

Аблічча Бога асьвятляе нашы
Рахманыя душы. Паходні й сьцягі
Адлюстраваныя на тварах ваяроў. Клінкі
Гараць, паліраваныя начамі.
Наравістыя коні топчуцца на месцы. Качэўнікі
Клінам імчацца да цёмнай лясной лагчыны.
Але сьмерці няма — думаем мы,
Абапіраючыся на шчыты, — жыцьцё
Віруе ў трох сусьветах.
Цяжкая дарога паўзь дзікія людзкія
Шыхты, жываты коней, бразганьне зброі
І зраненую плоць, паўз
Словы прадказальнікаў, сьвятыя сымбалі, форму…
Мы як пыл на белым адзеньні
Пад тварам сонца, якое ўзыходзіць.
У бясконцасьці дзён — дарожны пыл.
І паднятая ўжо нага Бога,
І зрушаны цяжкі подых бягучага часу
Шуміць у сьвятых гаёх.
І покуль гэта яшчэ
Ня здарылася з намі, покуль кроў
Ня хлынула на выцьвілую льняную кашулю,
Покуль цяжкі пах чалавечых душаў,
Крыкі перамогі й стогны сьмерці
Не зацьмілі сонца, —
Глядзіце,
Як сьвітае.

## АНТАНАС А. ЯНІНАС

### ПАМЕЖНАЯ ЗОНА

Ці слухае нас разабраны радар
ці сочаць нашы сьляды на сьнезе
даўно нячышчаным шклом біноклі
ад сьцюжы горбіцца лёд у пяску
пра што ўсю ноч высалапіўшы языкі
дыхаюць непатрэбныя ўжо аўчаркі
абвяргаючы закон захаваньня матэрыі
мы суграваем адно аднаго аддаем цеплыню
цьвёрды прамень б'ецца ў сьнежную шкарлупіну
мы не пасьпеем на той паром
што зноў нас пагрузіць на мацярык
чаму ў цябе такія сінія вочы
што ў іх схавана агонь якое хваробы
мы ўначы не пагасім сьвятла ў пакоі
калі прачнуся ўбачу твае вочы
заплюшчаныя ўсьмешку тваіх веек
няма куды сьпяшацца няма куды бяжаць [бегчы]
мы застанемся ў памежнай зоне
і не палохае нэрвовы цік гадзіньніка
бо мы застылі ў бурштыне часу

### ПАКОЙ

У гэтым пакоі мая радзіма
бо тут засынаю з табой

ключы вісяць на дзьвярах
маўчыць радыёкропка

з усімі кадрылямі й полькамі

у гэтым пакоі мая радзіма
тут я магу й памерці

ты гнуткая нібы пруток пастуха
калі ён гоніць статак з гары

сумна калі ты сыходзіш
і я разгортваю кнігу

колькі нашых мінулых вымаўчана з табою

**16 лютага Літва адзначыла нацыянальнае сьвята — Дзень Незалежнасьці.**

**Пераклаў зь літоўскае Андрэй Хадановіч**

# Бараніна

Яна выклікае найменш алергіі, і найменш спрыяе разьвіцьцю атэрасклерозу, у параўнаньні зь іншымі гатункамі мяса. Народы, якія яе спажываюць, славяцца сваім даўгалецьцем. Наколькі бараніна ўласьцівая традыцыйнаму нашаму мэню? Піша **Алесь Белы**.



У сучаснай масавай сьвядомасьці паняцьці «бараніна» і «Беларусь» ніяк не спалучаюцца. Даўно не трымаюць авечак ані прыватныя гаспадары, ані, здаецца, «грамадзкі сэктар» сельскай гаспадаркі. Наколькі бараніна ўласьцівая традыцыйнаму нашаму мэню? У беларускіх савецкіх кулінарных кнігах вы рэцэптаў з баранінай ня знойдзеце. Сьвініна заўжды была самым распаўсюджаным, культавым мясам для беларусаў.

Украінскі скіфоляг Уладзімер Пятрук мяркуе, што сёньняшняя этнічная мяжа паміж беларусамі і ўкраінцамі паўтарае канфігурацыю колішняй балта-іранскай мяжы часоў Герадота, і адной з прыкмет падзелу лічыцца частата згадак пра авечак у глыбінных пластах фальклёру. Але браліся ж у нас аднекуль і кажухі, галоўны прадмет гардэробу любога паважнага беларускага гаспадара! Як жартуе Рыгор Барадулін: «Кажух прамаўляў да сьвечкі: выйшлі мы ўсе з авечкі», — ,о і сьвечкі часта выраблялiся з авечага лою. А магеркі, неадменныя сялянскія шапкі, валеныя з воўны ці пашытыя з сукна? Таксама аднекуль мусіла ж узяцца тая процьма воўны. Дзядзька Рыгор яшчэ засьпеў час, калі нават на паваенным усходзе Беларусі бараніна не ўспрымалася нейкай каўкаскай экзотыкай. На захадзе ж авечак трымалі масава ня толькі паны ў сваіх фальварках, але і люд паспаліты. Так што 100 і болей гадоў таму бараніна была ў нас другім паводле папулярнасьці мясам, апераджаючы ялавічыну.

Магчыма, да пашырэньня гадоўлі авечак і спажываньня бараніны ў ежу ў нас калісьці спрычыніліся беларуска-літоўскія татары. Такія знакавыя стравы, як белюшы або кундумы (калдуны), як і кібіны літоўскіх караімаў, гатаваліся або з бараніны, або зь яе сумесі зь ялавічынай. Па-майстэрску ўмелі нашыя татары і нарыхтоўваць бараніну ў запас, — вяленую ды вэнджаную. *Вэнджаная бараніна па-татарску* ў «Літоўскай гаспадыні» адзначаецца як традыцыйны шляхецкі дэлікатэс. Адной з найбольш улюбёных страваў, якія беларускія татары дагэтуль ядуць па пятніцах і па сьвятах, ёсьць *белюш*. Назва цюркская. У казанскіх татар ёй адпавядае *беліш* ці *беліч* — круглы пірог, найчасьцей зь яблычнай начынкай. *Белюш* у дамах беларускіх татар гатавалі з тлустай бараніны або гусяціны, якую рэзалі на дробныя кавалкі і загортвалі ў цеста, зробленае зь яек, мукі, масла ці тлушчу, затым начыненае цеста запякалі на бляхе ці ў рондалі. У розных раёнах можна сустрэць адрозьненьні ў спосабах прыгатаваньня стравы, і тады яе называюць у адпаведнасьці з назвай мясцовасьці, напрыклад, клецкі, ляхавіцкі *белюш* і г.д.

Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі вельмі любіў бараніну, на ягоных славутых «абедах па чацьвяргах» падача страў з бараніны была ўрачыстай кульмінацыяй. Чарговы шэдэўр каралеўскага кухмістра Паўла Трэмо слуга выносіў на вялізным срэбным сподзе з воклічам «Баран!» Кажуць, такім чынам кароль хацеў заахвоціць падданых да разьвядзеньня авечак, што мусіла даць штуршок разьвіцьцю прамысловасьці, на прыклад Ангельшчыны. Падданыя ня надта слухалі караля, і ягоныя пляны пачалі збывацца толькі дзякуючы прусакам, ужо пасьля падзелаў дзяржавы.

Вытворчасьць воўны пачала ўзрастаць на мяжы XIX — XX ст., калі ў ваколіцах Беластоку прусакамі было пабудавана шмат буйных суконных фабрык. Гэта дало штуршок разьвіцьцю гадоўлі авечак на захадзе Гарадзенскай губэрні, і нават сярэдняй рукі гаспадары трымалі невялікія саматужныя фолюшы. Сёньня ў музэі традыцыйнага беларускага побыту ў Бельску, які трымае актывіст беларускага руху Дарафей Фіёнік, можна ўбачыць экспазыцыю, прысьвечаную традыцыйным беларускім валёнкам, даўно ўжо заняпаламу промыслу, калісьці вельмі распаўсюджанаму ў Падляшшы. Значыцца, была і бараніна на стале. Сярод падляскіх белару-

саў найдаўжэй захаваліся і традыцыі спажываньня бараніны. Шкада, што і ў Польшчы пасьля ўступленьня ў Эўразьвяз гадоўля авечак пераажывае крызіс. У нашых заходніх суседзяў засталося ня больш чым 300 тысяч авечак, а ў 1990 г. іх колькасьць перавышала 4 мільёны! Даецца ў знакі нізкі попыт на воўну і скуру ў Эўропе, таму і ўнутраны польскі попыт на бараніну задавольваецца ў асноўным праз імпарт. Так што палякі тут «даганяюць» нас.

Пік папулярнасьці бараніны ў Беларусі прыйшоўся на сярэдзіну XIX ст., на час, калі Ганна Цюндзявіцкая пісала «Літоўскую гаспадыню». А ўжо ў канцы стагодзьдзя сытуацыя пачала зьмяняцца. Традыцыйны гардэроб саступаў месца фабрычнаму, магерак і іншых саматужных вырабаў з сукна новая мода патрабавала ўсё менш. Мясцовая вытворчасьць воўны паступова занепадала, прайграючы ў глябальнай канкурэнцыі больш прыстасаваным для гадоўлі авечак краінам. Але асабліва адмоўна паўплывала на гэтую галіну ўсталяваньне Савецкай улады зь ейнай бязьлітаснай варожасьцю да прыватнай гаспадаркі.

Не адмоўлю сабе ў асалодзе працытаваць заходнебеларускага актывіста Мар'яна Пецюкевіча:

«У нас у Беларусі сэзон на бараніну, як ведама, распачынаўся восеньню, пасьля Ўсіх Сьвятых, калі пачынаўся для жывёлы зімовы пэрыяд. (…) Як толькі сьнег прыкрываў рунь, тады жывёлу ставілі ў хлеў аж да вясны. Лішнюю збывалі, прадавалі, а авечак амаль усіх, якія ня мелі ісьці на зіму, рэзалі для сваіх патрэб на мяса і на аўчынкі. (...) Сярэдняй заможнасьці гаспадар пускаў на зіму 4 — 5 штук авечак. Скапцоў, барана і ялавак (маладых) і старых (якія не пакрыліся) рэзалі для сябе, а калі былі патрэбныя грошы, то пару штук прадавалі на рынках. Авечыя вантробы адразу падрыхтоўвалі да спажываньня, тушу завешвалі на гарышчы (на хаце). Яна, калі ўжо пачаліся маразы, вісела датуль, пакуль яе, адразаючы па кавалку, ня зьелі. Калі было зарэзана некалькі штук авечага пагалоўя, то часам мяса дацягвалася (у ашчаднай гаспадыні) аж да Вялікадня. (...) Каляды амаль у кожнага гаспадара сустракаліся з кабанчыкам і баранінай».

Традыцыя рэзаць барана напярэдадні Ўсіх Сьвятых (1 лістапада) трывала захоўвалася ў каталікоў Заходняй Беларусі яшчэ і па вайне, у 1950-х. Бараніну елі ня толькі сваёй сям'ёй, але і раздавалі па кавалку, разам з адмысловымі памінальнымі булачкамі, у наступны дзень, на Дзяды, як міласьціну жабракам. Але як пастваралі калгасы, дык розьніца паміж жабракамі і гаспадарамі зьнікла, і зь ёй гэтая традыцыя, у якой бачыцца нават нешта падобнае на мусульманскі Курбан-Байрам.

Варта задумацца пра вяртаньне беларускай авечкі і беларускай бараніны, тым больш, што дыетычныя якасьці гэтага мяса зусім неблагія. Яна выклікае найменш алергіі і найменш спрыяе разьвіцьцю атэрасклерозу ў параўнаньні зь іншымі гатункамі мяса, ці не таму і народы, якія яе спажываюць, славяцца сваім даўгалецьцем. Не такія ўжо і дрэнныя ў нас кліматычныя ўмовы для разьвядзеньня авечак, мо ня горшыя, чым для вытворчасьці збожжа.

Бараніна вымагае досыць стараннага прыгатаваньня. Належыць выдаліць лішні лой, пакідаючы толькі тонкі пласт, каб мяса, калі яго мяркуецца запякаць, занадта не высыхала, і выдаліць лішнія абалонкі. Найлепей спажываць у ежу мяса авечак ад 6 тыдняў да 3 гадоў узростам, больш старое мяса для выдаленьня спэцыфічнага смаку трэба вытрымаць 6 — 12 гадзін у воцаце, марынадзе з воцату і віна, малочнай сыроватцы і г.д. Для найлепшай фэрмэнтацыі мяса рэкамэндуецца адбіць драўляным малатком.

### Бараніна, тушаная з грэцкай кашай

*450 г бараніны,*
*1,5 шклянкі грэцкіх крупаў,*
*1 цыбуліна,*
*2 ст. лыжкі тамат-пюрэ,*
*2 ст. лыжкі масла,*
*соль, перац паводле смаку.*

Бараніну нарэзаць кавалкамі (па 20 — 40 г), абсмажыць, скласьці ў рондаль, заліць булёнам ці вадой, дадаць тамат-пюрэ, пакрышаную і пасіраваную да залацістага колеру цыбулю і тушыць. Грэцкія крупы падсмажыць у патэльні да сьветла-карычневага колеру, засыпаць у кіпень і варыць да паўгатоўнасьці, дадаць да бараніны, дадаць соль і перац, перамяшаць і тушыць у разагрэтай да 220 — 250°С духоўцы каля 1 гадзіны.

### Запечаная баранова нага (кумпяк)

*Бараноў кумпяк, каля 1,2 — 1,5 кг,*
*1 — 2 лыжачкі солі,*
*3 — 4 зубкі часныку, аблупленага і нарэзанага тонкімі скрылькамі,*
*125 г сьвіного сала, нарэзанага тонкімі скрылькамі,*
*2 лыжкі таплёнага масла.*

Старанна нацерці кумпяк сольлю і зрабіць нажом шмат досыць глыбокіх, амаль да косткі, надрэзаў. Нашпігаваць тонкімі скрылькамі сала і часныку. Запякаць у духоўцы: спачатку 20 — 30 хвілін пры тэмпэратуры 250°С, потым, пасьля ўтварэньня скарынкі, пры 150°С (для хуткага зьніжэньня тэмпэратуры проста адчыніць дзьверкі духоўкі), з разьліку каля 1 гадзіны на 1 кг вагі, агулам каля 1,5 гадзіны. Паліваць мяса — сьпярша таплёным маслам, пазьней, досыць часта, сокамі ад мяса. Мяса гатовае, калі тэмпэратура, паводле кухарскага тэрмомэтру для мяса, дасягне 70 — 75°С. Выдаліць часнык і зьмясьціць баранову нагу на талерку для падачы.

### Бараноў кумпяк, запечаны па-літоўску

*Бараноў кумпяк — каля 1 кг,*
*4 шклянкі сыроваткі,*
*соль, перац,*
*1 лыжачка кмену,*
*2 лыжкі тлушчу або масла.*

Вымачыць мяса ў сыроватцы на працягу 3 — 4 гадзінаў. Высушыць, старанна нацерці сольлю, перцам і кменам ды пакінуць на 1 — 2 гадзіны. Разагрэць духоўку да 180°С, пакласьці кумпяк на бляху, паліць растопленым тлушчам або маслам, запякаць каля 45 хвілін, 2 — 3 разы паліваючы сокам. Пасыпаць дробна пакрышанай цыбуляй.

### Рагу з бараніны і гародніны

*1,2 — 1,5 кг бараніны,*
*100 г сьвіного сала,*
*4 вялікія цыбуліны,*
*0,5 л булёну,*
*3 памідоры,*
*1 салодкі перац,*
*1 морква,*
*1 корань пятрушкі,*
*1 — 2 бабкі (ляўровае лісьце),*
*3 — 5 зерняў чорнага перцу,*
*3 — 5 зерняў духмянага перцу («ангельскага зельля»),*
*0,5 лыжачкі кмену,*
*соль паводле смаку.*

Засмажыць нарэзанае на дробныя кавалкі сала на скваркі і смажыць у ім бараніну, парэзаную на кавалкі каля 30 г вагой. Скласьці засмажанае мяса і сала разам з таплёным тлушчам у гаршчок, дадаць пакрышаныя скрылькамі цыбулю, салодкі перац, моркву, корань пятрушкі і таміць разам каля 10 хв. Дадаць булён, нарэзаныя таматы, закрасы, соль і тушыць на малым агні 1—1,5 гадзіны, пакуль сок зь мяса, як яго праткнуць відэльцам, ня зробіцца з чырвонага жаўтаватым.

### Бараніна, тушаная з часныком (габрэйская страва)

*1 кг мяса,*
*1 кг морквы,*
*2 цыбуліны,*
*2 — 3 зубкі часныку,*
*80 г сырога курынага тлушчу,*
*соль, ляўровае лісьце.*

Падрыхтаваную бараніну нарэзаць невялікімі кавалкамі (разам з косткамі), хутка абсмажыць, пакласьці на бляху з надранай на буйной тарцы морквай і нарэзанай цыбуляй. Дадаць курыны тлушч, уліць вады або курынага булёну і тушыць да мяккасьці мяса, падобна да папярэдняга рэцэпту. У канцы тушэньня пакласьці ляўровы ліст і дробна пасечаны часнык. Падаваць з рассыпістым рысам.



# Трамвайчык



**Мы заходзім у трамвайчык,**
**Ля вакна сядае зайчык.**



Прабівае свой квіток –
Відна, едзе ён здалёк.

Кантралёр яго пабачыў:

«Зайцам едзеце, няйначай!»



«Вось квіточак мой, трымайце!»

«Памыліўся, выбачайце!»





Не падманвай жа трамвайчык,
Прабівай квіткі, як зайчык!

Капітан Танака ©

## ІМПРЭЗЫ

### Сустрэча з Эрнстам Сабілам

**24 лютага, а 12-й гадзіне** на Ўправе БНФ (Варвашэні, 8) адбудзецца сустрэча з былым вязьнем сталінскіх лягераў і пастарам зачыненай Беларускай эвангельскай царквы Эрнстам Сабілам. Сустрэча прысьвечана году памяці ахвяраў савецкіх рэпрэсіяў. Тэма сустрэчы «Царква падчас ганеньняў XX стагодзьдзя». Уваход вольны.

### Адам Глёбус у Пушкінцы

**24 лютага** ў Менскай бібліятэцы імя Пушкіна (вул. Гікала, 4) пройдзе паэтычны вечар у рамках праграмы «Навстречу/Насустрач». Удзел бяруць Адам Глёбус (Беларусь) і Глеб Шульпякоў (Расея). **Пачатак а 17-й.**

### «Біблійнае кола»

У Менскім касьцёле Сьв.Роха на Залатой Горцы **штопятніцы, а 20-й** (пасьля вячэрняй імшы) праходзяць сустрэчы «Біблійнага кола», якія ладзіць ксёндз Пётра Бялевіч. Айцец Пётра на беларускай мове тлумачыць вытрымкі з Новага і Старога Запавету, прыводзіць прыклады з жыцьця, адказвае на пытаньні вернікаў. Сёлета ўжо адбылося шэсьць такіх сустрэчаў. Ніхто з удзельнікаў не застаўся абыякавым, бо было вельмі цікава!

## КАНЦЭРТЫ

### Стары Ольса ў Маладэчне

**24 лютага** ў танцавальнай залі Палацу культуры (Цэнтральны пляц, 4) Маладэчна — канцэрт «Старога Ольсы». **Пачатак а 20-й.** Квіткі: 10000. Т.: (01773) 52–784, 69–614.

### Мэтал-фэст

**23 лютага.** Менскі клюб «Арэна» (вул.Талбухіна, 4). **Пачатак у 19:00.** Удзельнічаюць Winter Breed Of Evil Festival, Imprudence, Death Thrashcore, Deadly Carrion, «Ex-Morbid Victory», Death Metal, Dark Deception (Новополоцк), Deathcore, Nasoferus, Death Metal, Deathsaint, Melodic Death. Даведкі: 649–08–88. Кожнаму, хто служыў у беларускім войску, у падарунак кампакт-дыск!

### «Мельнікаў у гасьцях» на Ўправе БНФ

**2 сакавіка, а 18-й** на ўправе БНФ адбудзецца канцэрт барда Андрэя Мельнікава. Уваход вольны. Даведкі па тэл.: 571–26–11

# Рок-каранацыя

25 лютага 19.00

КЗ «Менск»



Рок-поп-хіп-хоп-фольк-мэтал-блюз-вынікі году.

**будуць сюрпрызы**

Zet, Зьміцер Вайцюшкевіч, Rasta, Krou/CpB, Indiga, S.D.M., «Parason», Стары Ольса, Tav.Mauzer…

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Драмы пад акупацыяй

**Чорная кніга** (Zwartboek)

Нідэрлянды — Вялікабрытанія — Нямеччына, 2006, каляровы, 135 хв.

**Рэжысэр:** Паўль Вэрхувэн

**Ролі выконваюць:** Карыс ван Хутэн, Сэбастыян Кох, Том Хофман, Халіна Рэйн, Вальдэмар Кобус, Дэрэк дэ Лінт, Крыстыян Бэркель

**Жанр:** Ваенны трымценьнік, прыгоды

**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Прызы Нідэрляндзкіх кінафэстаў, намінацыі на «Залатога ільва» на МКФ у Вэнэцыі, намінацыі на прэмію «BAFTA».

Рахель Сэйн — габрэйка. Калі гінуць ейныя бацькі, Рахель далучаецца да супраціву. Яна фарбуецца ў бляндынку — і мусіць увайсьці ў давер да высокапастаўленага эсэсаўца.

Як і ў раньніх сваіх карцінах («Чацьвёрты мужчына», «Цела+кроў»), Вэрхувэн верыць у «праўду цела».

Вэрхувэн у сваім характэрным стылі зьмешвае эратычнае й ваеннае. Шматразовыя пераўвасабленьні героя наўмысна правакацыйныя. Але рэжысэр ня зьдзекуецца са сьвятога: ён распавядае сур'ёзныя гісторыі часоў акупацыі ў захапляльнай форме — і на сваёй, галяндзкай, мове.

**Андрэй Расінскі**




## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**28 (ср)** — «Сымон-музыка»
**24 (сб), 3 (сб)** — «Макбэт»
**23 (пт)** — «Чычыкаў»
**26 (пн)** — «Вечар»
**25 (ндз)** — «С.В.»
*ранішнія спэктаклі*
**25 (ндз)** — «Сьнежная каралева»
*малая сцэна*
**25 (ндз)** — «Апэльсынавае віно»
**26 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**28 (ср)** — «Варшаўская мэлёдыя»

### Тэатар беларускай драматургіі

**24 (сб)** — «Іванаў»
**25 (ндз), 3 (сб)** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёлаў і Брадвэй»
**25 (ндз)** — «Нязваны госьць»
**27 (аўт)** — «Валянціна»
**28 (ср)** — «П'емонцкі зьвер»

### Тэатар юнага гледача

**25 (ндз)** — «Марныя намаганьні каханьня»
**25 (ндз)** — «Залатое сэрцайка»
**25 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда»
**27(аўт)** — «Мятлік»

**...цэны на жытло расьлі і расьлі.**

— Хвілінку, глядзіце, тут яшчэ ёсьць пацуковая нара памерам прыблізна тры сантымэтры кубічныя. Такім чынам, кватэра каштуе на 5 тысяч даляраў болей.






**...дзяржава пасьлядоўна праводзіла палітыку барацьбы за зьберажэньне энэргіі.**

— Гэта вас токам у тралейбусе шандарахнула? Вось вам рахунак за карыстаньне электрычнасьцю.

**...Чаргінец — аўтар сэрыялу пра маёра Ветрава, які змагаецца супраць наркатрафіку з Расеі ў Эўропу, сапраўды быў патрыётам.**

— Маёр Ветраў, ужо канец сэрыялу хутка, а вы нас, наркакантрабандыстаў, усё ня ловіце.

— А на фіга? Усё адно вас зловяць найлепшыя ў сьвеце беларускія памежнікі.



МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА



# гІсторыя ў «НН»

*Люты 2007*


**Алег Дзярновіч. Цяжар спадчыны.**
Да выданьня ўнікальнае «Энцыкляпэдыі Вялікага Княства Літоўскага» ........ 26

**Алесь Смалянчук. Мэтад выхаваньня ацёмнага народу.**
Горадня на старонках старое «НН» ........ 28

**Мікола Нікалаеў. У чужым Арсэнале.**
Зброя зь Нясьвіжу ў пецярбурскіх калекцыях ........ 33

**Антон Луцкевіч. Аб свабодах.**
Публікацыя Анатоля Сідарэвіча ........ 30




## год паэзіі


**Уладас Бразюнас.** Войшалк; Балцкія мовы ........ 41

**Карнэліюс Плацяліс.** Сьвітанак ........ 41

**Антанас А. Янінас.** Памежная зона; Пакой ........ 41


## ЖАРТ



WWW.LIVEJOURNAL.COM

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Іне С. з Горадні.** Эсэ для друку ў «НН» не пасуе.

**Насьці А. зь Нясьвіжу.** Разважаньні пра геапалітыку ў сьвятле паліўнага канфлікту непазьбежна выходзяць другаснымі, калі ня маеш першасных крыніцаў інфармацыі. Вы б нам лепей напісалі, што там у Вашым Парыжы робіцца — так, як Вашы папярэднікі 100 гадоў таму пісалі. Во гэта мае сэнс.

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 25.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую Алену і Алеся** Асіпцовых з 10-годзьдзем шлюбу! Алеся і Яраславу з Днём народзінаў! Шчасьця вам і многія лета! Р.М.

**Зьміцер Хведарук і Алег Корбан**! Упакорцеся Богу; усупраціўцеся д'яблу, і ўцячэ ад вас! (Якава 4:7). Брат

### КАНТАКТЫ

**Выдавецтва «Кнігазбор»** цяпер месьціцца па адрасе: Менск, Вызваленьня, 9. Т.: 204–86–97

### КНІГІ

**Беларускія кнігі** ў шырокім асартымэнце на кніжным кірмашы па вул. Янкі Купалы, 27. Першае месца справа ад уваходу. Т.: 771–49–39. Алесь

**Прапаную кнігі**: «Поўны збор твораў Я.Купалы» у 9 тамах, «Беларуска-польскі размоўнік», М.Ткачоў «Замкі і людзі», кнігі «Беларускі кнігазбор», «Помнікі этнаграфіі Беларусі», «Наша Доля» 1906 г. факсім. «Наша Ніва» 1906–1908, «Армія Краёва на Беларусі» ды іншае, багаты выбар, усе напрамкі. Т.: 753–70–05

**Зьмітрок Бядуля** «Выбраныя творы» — 35-я кніга сэрыі «Беларускі кнігазбор». Наклад у кнігарнях мізэрны

**Набуду** «Энцыкляпэдыю ВКЛ» ч. 1, «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» т.3. Т.: 771–49–39

**Падорым** зацікаўленым чытачам камплекты часопісу «Хрысьціянская Думка» (1991—1995). Т.: 233–44–58, 761–88–84

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 25 лютага – «Шляхамі рамантызму»: Косава–Ружаны–Лыскава–Краскі–Падароск–Ізабэлін. 8–11 сакавіка: Люблін–Замасьць–Казімеж Дольны–Пулавы. Т.: 017–292–54–58, 622–57–20, 509–12–16, 110–19–28, 573–88–17


**Газэта «Наша Ніва»**

шукае добраахвотных распаўсюднікаў

зьвяртацца па т.: (017) 284–73–29, (029) 618–54–84, (029) 260–78–32

e-mail: dastauka@tut.by


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Нягледзячы на ўсе стараньні правіцельства і яго чыноўнікаў, каб не дапусьціць у новую Думу сьмелых і шчырых ваякаў за народнае дзела, каб не была яна падобна да першай, — з усёй Расеі на 468 дэпутатаў выбралі толькі 82 такіх, што стаяць за правіцельства і за старыя парадкі; затое 360 дэпутатаў стаяць за свабоду. Сацыялістаў, рэвалюцыянэраў і іншых, што адкрыта ідуць за народ проці правіцельства, будзе ў Думе 204. Значыць, можам цяпер сьмела сказаць, што Дума не ашукае народу, што яна ўсё зробіць, каб споўніць народныя жаданьні.

**«Наша Ніва». №7. 1907**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2271. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.02.2007.

Замова № 1054.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.